Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт
інфарматыкі і радыёэлектронікі»

Кафедра гуманітарных дысцыплін

**Я.К. Новік, Н.Я. Новік**

# *Вялікая Айчынная вайна савецкага народа*

(у кантэксце Другой сусветнай вайны)

**Курс лекцый**

Библиотека БГУИР

Мінск 2006

УДК 9 (075.8)
ББК 63.3(2)622я73
Н 73

Р э ц э н з е н т:
дац. кафедры гісторыі сусветных
цывілізацый Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага
інстытута С.К. Ганцова

**Новік Я.К.**

Н 73 Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): Курс лекцый / Я.К. Новік, Н.Я. Новік. – Мн.: БДУІР, 2006. – 186 с.

ISBN 985-444-814-2

Курс лекцый падрыхтаваны на аснове рабочай праграмы па спецкурсу «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», распрацаванай кафедрай гуманітарных дысцыплін БДУІР. Прапануюцца тэксты лекцый па наступных раздзелах спецкурса: «Савецкі Саюз і краіны свету напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны», «Барацьба савецкага народа супраць германскай агрэсіі», «Разгром фашысцкага блока. Завяршэнне Вялікай Айчынай вайны і Другой сусветнай вайны».

Для студэнтаў усіх спецыяльнасцей і форм навучання БДУІР.

**УДК 9 (075.8)**
**ББК 63.3(2)622я73**

**ISBN 985-444-814-2**

© Новік Я.К., Новік Н.Я., 2006
© БДУІР, 2006

Библиотека БГУИР

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ
РАЗДЗЕЛ I. САВЕЦКІ САЮЗ І КРАІНЫ СВЕТУ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ
Лекцыя 1. Міжнароднае становішча напярэдадні і ў пачаткуДругой сусветнай вайны
Лекцыя 2. Другая сусветная вайна, падзеі ў Еўропе і Беларусі. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны
РАЗДЗЕЛ II. БАРАЦЬБА САВЕЦКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКАЙ АГРЭСІІ
Лекцыя 3. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны
Лекцыя 4. Баявыя дзеянні на франтах. Маскоўская бітва. Крах «бліцкрыга»
Лекцыя 5. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі
Лекцыя 6. Партызанская і падпольная барацьба супраць германскіх агрэсараў на захопленай тэрыторыі Беларусі
РАЗДЗЕЛ III. РАЗГРОМ ФАШЫСЦКАГА БЛОКА. ЗАВЯРШЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ
Лекцыя 7. Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта
Лекцыя 8. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны
ЗАКЛЮЧЭННЕ. КРЫНІЦЫ ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА, ВЫНІКІ І ЎРОКІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Библиотека БГУИР

# УВОДЗІНЫ

У адпаведнасці з загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 708 ад 27 мая 2004 г. ва ўсіх установах адукацыі, пачынаючы з 2004 – 2005 вучэбнага года, уведзена выкладанне спецкурса «Вялікая Айчыннай вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Рашэннем Савета БДУІР на вывучэнне спецкурса прадугледжана 20 гадзін аўдыторных заняткаў, у іх ліку 16 гадзін лекцый, 2 гадзіны семінарскіх заняткаў і 2 гадзіны кансультацый, а таксама 14 гадзін самастойнай работы студэнтаў, усяго 34 гадзіны. Завяршаецца вывучэнне спецкурса здачай студэнтамі заліка.

Другая сусветная вайна – самая кровапралітная вайна ў гісторыі чалавецтва. Яна працягвалася 6 гадоў – з 1 верасня 1939 г. па 2 верасня 1945 г. У яе была ўцягнута 61 дзяржава, больш за 80 % тагачаснага насельніцтва Зямлі. Ваенныя дзеянні адбываліся на тэрыторыі 40 дзяржаў, а таксама на марскіх і акіянскіх прасторах. Па няпоўных звестках, у вайне загінула 50 – 55 млн чал., у іх ліку 27 млн грамадзян СССР, больш за 2,2 млн жыхароў Беларусі.

Неабходнасць і актуальнасць вывучэння гісторыі Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны абумоўлена:

– маштабнасцю баявых дзеянняў, уплывам і ўздзеяннем вайны на лёс народаў нашай планеты, неабходнасцю паказу трагедыі і выпрабаванняў, што выпалі на долю беларускага і іншых народаў СССР, а таксама народаў краін антыгітлераўскай кааліцыі;

– спробамі некаторых вучоных, палітыкаў і публіцыстаў Захаду, а таксама іх адэптаў у краінах СНД «украсці» у савецкага, у тым ліку беларускага народа яго Вялікую Перамогу, прынізіць ролю і значэнне СССР у дасягненні перамогі над гітлерызмам і прыпісаць рашаючую ролю ў яго разгроме англа-амерыканскім войскам. Асабліва прыкра тое, што ў некаторых сучасных публікацыях, тэлеперадачах і фільмах уклад у Перамогу заходніх военачальнікаў значна перабольшваецца,



Библиотека БГУИР

у той час як аб таленце і здольнасцях савецкіх военачальнікаў Г.К. Жукава, А.М. Васілеўскага, І.С. Конева, кемлівасці К.К. Ракасоўскага і іншых, аб гераізме і мужнасці, гуманізме, духоўнай і фізічнай сіле салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, іх бязмернай стойкасці ў баях і прыроднай кемлівасці не гаворыцца зусім. У апошнія гады кіраўніцтву Савецкага Саюза прыпісваецца нават адказнасць за развязванне Другой сусветнай вайны і шэраг іншых неабгрунтаваных домыслаў.

Яшчэ больш прыкра становіцца, калі чытаеш выданні беларускіх гісторыкаў, у якіх наўмысна скажаецца айчынная гісторыя. У 2003 г. выйшла ў свет адно з іх – кніга прафесара З. Шыбекі «Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002» (Мн.: Энцыклапедыкс, 2003), у якой §28 называецца так: «Разгар нямецка-савецкай вайны. Чэрвень 1941 – верасень 1943». У гэтым параграфе нават тэрмін «Вялікая Айчыная вайна» адсутнічае. Матэрыялы спецкурса і прызначаны для абвяржэння грубых і наўмысных скажэнняў айчыннай гісторыі;

– павышэннем цікавасці моладзі да праблем вайны ў сувязі з урачыстым святкаваннем 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 2004 г. і 60-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў 2005 г.;

– неабходнасцю ведання маладымі людзьмі велічы подзвіга, здзейсненага савецкім народам і народамі іншых краін антыгітлераўскай кааліцыі, ветэранамі вайны, якія жывуць побач з намі і якіх у нашай Беларусі налічваецца меньш за 80 тыс. чал.

Вядома, што ў складзе Чырвонай Арміі ў гады вайны змагалася больш за 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, на тэрыторыі акупіраванай Беларусі супраць фашызму змагалася больш за 370 тыс. партызан і 70 тыс. падпольшчыкаў. Такім чынам амаль з 2 млн узброеных удзельнікаў вайны ў жывых сёння засталося меньш за 80 тыс. чал. Пра іх подзвіг і пра подзвіг тых, каго з намі ўжо няма,

моладзь павінна ведаць. На гэта таксама накіраваны спецкурс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)».

У гісторыі Другой сусветнай вайны можна ўмоўна вылучыць 5 асноўных перыядаў:

1) пачатак вайны, уварванне германскіх войск у Польшчу, іншыя краіны Заходняй Еўропы (верасень 1939 г. – чэрвень 1941 г.);

2) напад фашысцкай Германіі на СССР, пашырэнне маштабаў вайны, крах гітлераўскай дактрыны «бліцкрыга» і міфа аб непераможнасці нямецкай арміі (чэрвень 1941 г. – лістапад 1942 г.);

3) карэнны пералом у ходзе вайны, крушэнне наступальнай стратэгіі фашысцкага блока (лістапад 1942 г. – снежань 1943 г.);

4) разгром фашысцкага блока, выгнанне варожых войск за межы СССР, вызваленне ад акупацыі краін Еўропы, поўны крах фашысцкай Германіі і яе поўная і безагаворачная капітуляцыя (студзень 1944 г. – май 1945 г.);

5) разгром імперыялістычнай Японіі, вызваленне народаў Азіі ад японскай акупацыі і заканчэнне Другой сусветнай вайны (май – верасень 1945 г.).

Як відаць, Вялікая Айчынная вайна з’яўлялася састаўной і рашаючай часткай Другой сусветнай вайны. Другі, трэці і чацвёрты перыяды Другой сусветнай вайны з’яўляюцца адначасова трыма перыядамі Вялікай Айчыннай вайны.

Уводзіны, лекцыі 1, 2, 3, 4, 7, 8, заключэнне напісаны доктарам гістарычных навук, прафесарам Я.К. Новікам; лекцыі 5, 6 – кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам Н.Я. Новік.

Пры напісанні тэкстаў лекцый аўтарамі былі выкарыстаны матэрыялы вучэбнага дапаможніка «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» (Мн., 2004), іншыя навуковыя і вучэбна-метадычныя выданні.



Библиотека БГУИР

# РАЗДЗЕЛ I. САВЕЦКІ САЮЗ І КРАІНЫ СВЕТУ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (4 ГАДЗІНЫ)

## Лекцыя 1. Міжнароднае становішча напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны

***План***

1. Міжнароднае становішча ў свеце ў 30-х гг. XX ст. Ачагі ваеннай напружанасці на Далёкім Усходзе, у Еўропе і Паўночнай Афрыцы.
2. Спроба стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-французска-англійскія перамовы ў Маскве летам 1939 г.
3. Савецка-германскія адносіны ў канцы 30-х гг. XX ст. Сакрэтны дадатковы пратакол да савецка-германскага дагавору аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г.
4. Пачатак Другой сусветнай вайны, яе прычыны і характар.

**1. Міжнароднае становішча ў свеце ў 30-х гг. XX ст. Ачагі ваеннай напружанасці на Далёкім Усходзе, у Еўропе і Паўночнай Афрыцы.** Пасля паражэння Германіі ў Першай сусветнай вайне краіны Антанты і ЗША апынуліся ў няроўным становішчы. За гады вайны ЗША ўмацавалі сваё эканамічнае і палітычнае становішча, развіваючы гандаль з абедзвюма ваяваўшымі групоўкамі, што дазволіла ім з краіны-даўжніка ператварыцца ў краіну-крэдытора. Рост эканамічнай моцы дазволіў ЗША прэтэндаваць на сусветнае лідэрства.

Стабілізацыя ў галіне міжнародных адносін пачалася з заканчэння так званага Рурскага крызісу 1923 г., які быў выкліканы ўвядзеннем Францыяй сваіх войск у гэты важнейшы прамысловы рэгіён Германіі з мэтай прымусіць яе выплачваць рэпарацыі. Крызіс паказаў, што эканамічнае адраджэнне Германіі адпавядае інтарэсам



Библиотека БГУИР

пераможцаў, інакш немагчыма было атрымліваць кампенсацыю за страты, якія панеслі краіны Антанты ў Першай сусветнай вайне.

Для вырашэння пытання аб рэпарацыях летам 1924 г. у Лондане адбылася канферэнцыя краін-пераможцаў. Яна зацвердзіла план камітэта спецыялістаў пад кіраўніцтвам амерыканскага банкіра Ч. Даўэса, які выходзіў з прапановай аб неабходнасці аказаць Германіі дапамогу ў аднаўленні эканомікі, каб яна змагла выплачваць рэпарацыі. Восенню 1925 г. у Лакарна (Швейцарыя) адбылася міжнародная канферэнцыя, на якой быў падпісаны так званы Рэйнскі гарантыйны пакт. Дагавор гарантаваў недатыкальнасць германа-французскай і германа-бельгійскай межаў, прычым ніяк не гарантавалася мяжа Германіі з Чэхаславакіяй і Польшчай. Францыя і Бельгія абавязваліся паважаць устаноўленую дагаворам у Версалі заходнюю мяжу Германіі і дэмілітарызаваны (неваенны) характар Рэйнскай зоны.

У 1926 г. Германія была прынята ў Лігу Нацый і атрымала, як і іншыя вялікія дзяржавы, пастаяннае месца ў яе Савеце. Адначасова ў 1926 г. у Берліне быў падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзенні і нейтралітэце. СССР заручыўся падтрымкай Германіі ў тым, што апошняя не будзе ўдзельнічаць у прыняцці Лігай Нацый рашэнняў, якія будуць накіраваны супраць СССР.

Пасля прыходу да ўлады ў 1933 г. нацыстаў кіраўнік нацыянал-сацыялістычнай партыі А. Гітлер паставіў мэтай усімі магчымымі сродкамі дабівацца скасавання абмежаванняў, якія былі ўстаноўлены ў Версалі, а таксама вяртання Германіі калоній, страчаных пасля Першай сусветнай вайны. У прынятым у 1936 г. мемарандуме была выкладзена праграма эканамічнай падрыхтоўкі да вайны, дзе прама гаварылася, што Германія адчувае «*перенаселение и не может себя прокормить, опираясь лишь на свою территорию… Окончательное решение проблемы состоит в расширении жизненного пространства,*



Библиотека БГУИР

*а также в расширении сырьевой и продовольственной базы нашего народа… Национал-социалистическое руководство будет иметь волю, а также решимость и непреклонность достаточные, чтобы решить эти проблемы в случае войны…*».

Як відаць, нацысты паставілі сваёй мэтай шляхам вайны пашырыць жыццёвую прастору для германскай нацыі і дасягнуць яе сусветнага панавання. Насельніцтву краіны абяцалася вырашэнне праблемы беспрацоўя, сацыяльнай няроўнасці, значнае павышэнне ўзроўню жыцця і дасягненне ў карацейшы тэрмін эканамічнай незалежнасці.

Нацысцкаму кіраўніцтву і яго ідэалагічнаму апарату ўдалося даволі хутка разбэсціць большую частку грамадства, стварыць у краіне атмасферу шавіністычнага ўгара, насадзіць ідэі расізму, жорсткасці, рэваншу за «версальскую ганьбу». Найбольшую падтрымку ідэі нацыянал-сацыялізму знаходзілі ў дробных уласнікаў, беспрацоўных, а таксама ў часткі інтэлігенцыі, працоўных і моладзі.

**Ідэалагічным забеспячэннем палітыкі нацыянал-сацыялізму стала прапаганда шавінізму, стымуляцыя расавай выключнасці германскай нацыі, распальванне варожасці і нянавісці да іншых народаў.** Нацысцкае кіраўніцтва шырока выкарыстоўвала сацыялагічную плынь сацыял-дарвінізму, а таксама тэорыю пра наследаванне здароўя чалавека і шляхоў яго ўдасканалення, якая з 1883 г. атрымала назву **«еўгеніка»**[1]. Заснавальнік сацыял-дарвінізму англійскі сацыёлаг і філосаф Г. Спенсер прыстасаваў тэорыю Ч. Дарвіна для асэнсавання развіцця грамадства. «*У свеце жывёл, – адзначаў ён, – старыя, слабыя і хворыя гінуць, жывымі застаюцца*

---

[1] **Еўгеніка** (ад грэч. *eugenes* – добрага роду) – тэорыя пра наследаванне здароўя чалавека і шляхоў яго паляпшэння. У сучаснай навуцы многія праблемы еўгенікі (здароўе, разумовыя здольнасці, адоранасць) вырашаюцца ў рамках генетыкі чалавека і медыцынскай генетыкі. Ужыванне тэрміна "еўгеніка" спрэчнае.



Библиотека БГУИР

*толькі моцныя і здаровыя. Такім чынам, барацьба за існаванне ачышчае расу, прадухіляе яе ад заняпаду*». Прадстаўнік германскай еўгенікі, тэарэтык германскага нацызму Ленц сцвярджаў: «*Высокая дзіцячая смяротнасць, эпідэмія, туберкулёз і, нарэшце, вайна з'яўляюцца асабліва спрыяльнымі фактарамі натуральнага адбору*».

Галоўным напрамкам дзейнасці нацысцкага кіраўніцтва на міжнароднай арэне было патрабаванне адмены абмежаванняў на ўзбраенне Германіі, якія прадугледжваліся ўмовамі Версальскага дагавору. Вялікабрытанія і Францыя выявілі гатоўнасць да ўступак у абмен на ўзаемныя гарантыі бяспекі. Яны лічылі, што такім чынам можна ўміратварыць гітлераўскі рэжым і накіраваць яго на разгром міжнароднага камуністычнага руху і савецкага ўплыву. З гэтай нагоды 15 ліпеня 1933 г. прадстаўнікі чатырох дзяржаў – Англіі, Францыі, Германіі і Італіі падпісалі ў Рыме **«Пакт чатырох»**. Гэта была свайго роду «рэпетыцыя» перад будучай мюнхенскай змовай. Праўда, глыбокія супярэчнасці, якія меліся паміж удзельнікамі пакта, не дазволілі яго ратыфікаваць.

А цяпер разгледзім канкрэтныя дзеянні гітлераўскай Германіі, накіраваныя (са згоды ЗША, Англіі і Францыі) на ліквідацыю Версальска-Вашынгтонскай сістэмы дамоўленасцей, якая забараняла Германіі мець узброеныя сілы і абаронную прамысловасць.

***Першае.*** У 1932 г. Германія дабілася канчатковай **адмены рэпарацый**, што выклікала незадавальненне ЗША, якой выплачвалі даўгі таксама Вялікабрытанія і Францыя за ваенныя пастаўкі ў гады Першай сусветнай вайны. Тым не менш Германіі ўдалося атрымаць прызнанне ад заходніх дзяржаў яе права на ўзбраенне, аднак пры ўмове, што будзе створана сістэма калектыўнай бяспекі пры яе ўдзеле.

***Другое.*** Ужо ў кастрычніку 1933 г. **Германія дэманстратыўна выйшла з Лігі Нацый і Жэнеўскай канферэнцыі па раззбраенні**. У

той жа час германская дыпламатыя імкнулася забяспечыць адпаведнае дыпламатычнае прыкрыццё агрэсіўнай палітыкі сваёй краіны, разгарнуўшы актыўную дзейнасць. У пачатку 1934 г. паміж Германіяй і Польшчай падпісваецца пакт аб ненападзенні, у якім падкрэслівалася, што германскі бок не мае агрэсіўных намераў да Польшчы. Аднак неўзабаве Гітлер заявіў у бліжэйшым акружэнні, што «*ўсе нашы дамоўленасці з Польшчай маюць толькі часовае значэнне*».

***Трэцяе.*** Значнай падзеяй умацавання палітычнага рэжыму Гітлера з’явілася **грамадскае апытанне ў 1935 г. у Саарскай вобласці**, якая з 1919 г. знаходзілася пад кіраваннем Лігі Нацый. На пытанне: «Ці хочуць жыхары вярнуцца ў склад Германіі, альбо жадаюць быць часткай Францыі?» быў атрыманы ашаламляльны вынік. Каля 90,9 % удзельнікаў плебісцыту выказаліся 13 студзеня 1935 г. за ўз’яднанне з Германіяй. Плебісцыт прывёў да таго, што 1 сакавіка 1935 г. Саар адышоў да Германіі, якая выплаціла кампенсацыю Францыі за вугальныя шахты.

***Чацвёртае.* У 1935 г. кіруючыя колы Германіі аб’явілі аб аднаўленні ў краіне ўсеагульнай вайсковай павіннасці.** Германія прыступіла да стварэння моцнай арміі і авіяцыі. 21 мая 1935 г. фюрэр пераймяноўвае рэйхсвер у вермахт, назначыўшы сябе вярхоўным галоўнакамандуючым узброенымі сіламі. Прычым Захад не праяўляў настойлівасці выканання Версальскіх дамоўленасцей. Наадварот, летам 1935 г. было заключана англа-германскае марское пагадненне, якое адкрыла шлях германскаму кіраўніцтву да павелічэння танажу ваенна-марскога флоту і будаўніцтва падводных лодак. Ужо да канца 1935 г. Германія сфарміравала 31 баяздольную дывізію.

***Пятае.* У кароткі тэрмін у Германіі пры фінансавай падтрымцы заходняга капіталу, было пабудавана 300 новых ваенных заводаў, рэканструявана і мадэрнізавана авіяцыйная**

Бібліятэка БГУІР

**прамысловасць.** У 1938 г. у краіне ужо мелася 30 самалёта-будаўнічых, 15 авіяматорных і 110 дапаможных авіяцыйных заводаў. Калі да 1932 г. у Германіі не было ніводнага ваеннага самалёта, то ўжо ў 1934 г. іх было пабудавана 840, у 1936 г. – 2 530, у 1938 г. – 3 350, а ў 1939 г. мелася 4 733 самалёты навейшых мадыфікацый. Ваенная вытворчасць Германіі з 1934 г. па 1940 г. узрасла ў 22 разы, што з'явілася важнай падставай узмацнення ваенна-палітычнай агрэсіўнасці нацысцкага кіраўніцтва, асабліва пры прыняцці важных міжнародных рашэнняў.

Як ужо адзначалася, істотную ролю ў аднаўленні ваеннага патэнцыялу Германіі адыграў замежны капітал. Да сярэдзіны 30-х гг. XX ст. у германскую прамысловасць было ўкладзена 27 млрд марак замежнага капіталу, 70 % якога належала амерыканскім фірмам.

***Шостае.*** **24 кастрычніка 1936 г. быў падпісаны пакт аб утварэнні восі «Берлін – Рым»**, згодна з якім Германія прызнала анексію Абісініі Італіяй, і абедзве дзяржавы абяцалі праводзіць агульную лінію ў адносінах да вайны ў Іспаніі. У лістападзе 1936 г. Германія і Японія заключылі так званы **«Антыкамінтэрнаўскі пакт»**. У верасні 1940 г. Германія, Італія і Японія заключылі ў Берліне ваенна-палітычны і эканамічны саюз – **«Траісты пакт»** («вось Берлін – Рым – Токіа»). У далейшым Антыкамінтэрнаўскі блок значна пашырыўся. Да пачатку 1939 г. да яго далучыліся Венгрыя і Іспанія, а ў лістападзе 1941 г. – Балгарыя, Фінляндыя, Румынія, Сіям, Манчжоў-Го і кіраўніцтва Кітая на чале з Ван Цзінвэем, а таксама акупаваныя гітлераўскімі войскамі Данія, Славакія і Харватыя.

***Сёмае.*** **Важным крокам на шляху далейшай мілітарызацыі з'явіўся ўвод 7 сакавіка 1936 г. германскіх войск у Рэйнскую дэмілітарызаваную вобласць.** Рашэнне было станоўча ўспрынята большасцю насельніцтва Германіі як факт аднаўлення яе тэрытарыяльнага суверэнітэта. Гітлер ішоў на рызыку, разумеючы,



Библиотека БГУИР

што гэты крок, які пагражаў бяспецы Францыі, можа вызваць узброенае супраціўленне, тым больш што суадносіны сіл былі не на карысць Германіі (яна мела 36 дывізій, а Францыя і Чэхаславакія – 55). Аднак французскі ўрад бяздзейнічаў.

***Восьмае.*** **У ліпені 1936 г., калі ў Іспаніі пачаўся ваенна-фашысцкі мяцеж генерала Франка супраць рэспубліканскай улады, Германія і Італія арганізавалі ў падтрымку мяцежнікаў ўзброеную інтэрвенцыю.** У сваю чаргу ўтвораны ў Парыжы Міжнародны камітэт салідарнасці з Іспаніяй сабраў 800 млн франкаў у фонд падтрымкі Народнага фронту. Звыш 35 тыс. чал. з 54 краін свету змагаліся ў 7 інтэрбрыгадах на баку рэспубліканцаў, з іх каля 7 тыс. загінула ў баях. Савецкі Саюз пастаўляў у Іспанію зброю, танкі, знішчальнікі, гаруча-змазачныя матэрыялы, медыкаменты, харчаванне. Звыш 3 тыс. савецкіх добраахвотнікаў, у тым ліку і беларусы, змагалася за рэспубліку, з іх каля 200 чалавек загінула, у тым ліку два танкісты-беларусы П.Е. Купрыянаў і М.А. Сяліцкі, якім было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Англія і Францыя прытрымліваліся «палітыкі неўмяшання» ў справы Іспаніі. «Пагадненне аб неўмяшанні» падпісалі 27 еўрапейскіх краін, згодна з якім забаранялася ўвозіць зброю, ваенныя матэрыялы і тэхніку ў Іспанію. Аднак Германія, якая таксама далучылася да гэтага пагаднення, працягвала аказваць значную дапамогу франкістам. Агрэсары выкарыстоўвалі іспанскую тэрыторыю ў якасці выпрабавальнага палігона для сваёй авіяцыі і танкаў, набыцця вайскоўцамі баявога вопыту і майстэрства, удасканальвання ваеннай стратэгіі.

На працягу 1936 – 1939 гг. на баку франкістаў ваявала каля 150 тыс. ваеннаслужачых з Італіі, 50 тыс. – з Германіі, 20 тыс. партугальцаў і каля 100 тыс. мараканцаў. Бяздзейнічала Ліга Нацый, якая выказала толькі «хваляванне наконт падзей у Іспаніі». У сакавіку

1939 г. Іспанская рэспубліка пала, і у краіне ўсталявалася дыктатура генерала Ф. Франка. Урады Вялікабрытаніі і Францыі афіцыйна прызналі дыктатарскі рэжым.

***Дзевятае.*** **Новым актам агрэсіі з'явіўся аншлюс Аўстрыі.** Перад тым як здзейсніць гэты крок, Гітлер заручыўся падтрымкай брытанскага ўрада, на чале якога стаяў прыхільнік палітыкі «уміратварэння» Германіі Н. Чэмберлен. Пад лозунгам аб'яднання зямель, населеных немцамі, 11 сакавіка 1938 г. 200-тысячнае германскае войска без супраціўлення захапіла Аўстрыю, а 13 сакавіка было аб'яўлена аб яе «уз'яднанні» з Германіяй.

***Дзесятае.*** **На чарзе была Чэхаславакія.** Фармальнай падставай для яе захопу Германіяй паслужыла патрабаванне да Чэхаславакіі адмовіцца ад суверэнітэту над Судэцкай вобласцю, на тэрыторыі якой пражывала нямецкая нацыянальная меншасць. Нягледзячы на тое, што Францыя і Чэхаславакія былі звязаны дагаворам 1935 г. аб узаемадапамозе ў выпадку агрэсіі, урады Францыі і Вялікабрытаніі заявілі, што яны не збіраюцца ваяваць за Чэхаславакію і патрабавалі ад апошняй саступіць Гітлеру.

СССР таксама падпісаў у 1935 г. дагавор аб узаемадапамозе з Чэхаславакіяй на выпадак агрэсіі. Кіраўніцтва Савецкага Саюза ў пісьмовай форме запэўніла ўрад Чэхаславакіі аб тым, што СССР гатовы аказаць аднабаковую дапамогу Чэхаславакіі без Францыі, калі такая просьба паступіць ад чэхаславацкага боку. У гэты час Вялікабрытанія і Францыя ўзмацнілі націск на ўрад Чэхаславакіі, патрабуючы прыняць германскія ўмовы і адмовіцца ад пагаднення з Савецкім Саюзам.

Для вырашэння «чэшскай» праблемы 29 – 30 верасня 1938 г. у Мюнхене была склікана канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел А. Гітлер, Н. Чэмберлен, Э. Даладзье і Б. Мусаліні. Было падпісана пагадненне, паводле якога ажыццяўлялася расправа над



Библиотека БГУИР

Чэхаславакіяй. Апошнюю прымусілі перадаць немцам частку сваёй тэрыторыі – Судэцкую вобласць. У выніку Чэхаславакія страціла 1/5 сваёй тэрыторыі і каля 5 млн чал. насельніцтва, а таксама 33 % прамысловых прадпрыемстваў.

15 сакавіка 1939 г. германскія войскі ажыццявілі прамую агрэсію ў астатнюю частку Чэхаславакіі. Чэхія была аб'яўлена германскім пратэктаратам пад назвай «Багемія і Маравія», Славакія – незалежнай дзяржавай з марыянетачным рэжымам, Закарпацкая Украіна далучана да Венгрыі, а да Польшчы адышла Цешынская вобласць. Удзел Англіі і Францыі ў расправе над Чэхаславакіяй, у яе знікненні з карты Еўропы сведчыў аб здрадзе кіруючых колаў гэтых краін у адносінах да Чэхаславакіі, аб падтрымцы агрэсара.

**У Еўропе па віне гітлераўскай Германіі ўзнік небяспечны ачаг вайны.**

**Другі небяспечны ачаг вайны ўзнік па віне фашысцкай Італіі ў Паўночнай Афрыцы і ў басейне Міжземнага мора.** Добра ўзброеная італьянская армія ўварвалася ў кастрычніку 1935 г. у Абісінію (Эфіопію). У маі 1936 г. войскі Італіі захапілі сталіцу краіны – Адыс-Абебу. Абісінія была аб'яўлена калоніяй Італіі. У красавіку 1939 г. італьянскія фашысты ўварваліся ў Албанію.

Узброеная агрэсія супраць Абісініі стала магчымай у выніку бяздзеяння з боку заходніх дзяржаў. Французскі ўрад, напрыклад, уступіў у прамую здзелку з Італіяй. За адмову Італіі ад агрэсіўных дзеянняў у Экватарыяльнай Афрыцы, дзе пераважаў уплыў Францыі, Б. Мусаліні атрымаў свабоду дзеянняў у Абісініі. Пад уздзеяннем міжнароднай грамадскасці Ліга Нацый была вымушана аб'явіць Італію агрэсарам і ўнесці некаторыя абмежаванні ў гандлі з ёй. Але гэтыя меры не змянілі становішча, бо Італія змагла павялічыць гандаль з краінамі, якія не ўдзельнічалі ў санкцыях, напрыклад з ЗША. У абарону народа Абісініі выступіў толькі Савецкі Саюз. Урад

Библиотека БГУИР

СССР дабіваўся прымянення Лігай Нацый калектыўных санкцый супраць Італіі, якія б уключалі спыненне паставак нафты і закрыццё Суэцкага канала для італьянскіх суднаў.

**Трэці ачаг ваеннай напружанасці палыхаў на Далёкім Усходзе**, дзе барацьбу за тэрытарыяльны перадзел вяла Японія, якая імкнулася да панавання ў Кітаі і ў басейне Ціхага акіяна. Яшчэ ў верасні 1931 г. японскія войскі акупіравалі Маньчжурыю і стварылі марыянетачную дзяржаву Маньчжоў-Го з праяпонскім урадам. Толькі ў лютым 1933 г. Ліга Нацый прыняла рэзалюцыю, якая асуджала захоп Маньчжурыі і патрабавала вярнуць яе Кітаю. Адказам на дзейнасць міжнароднай арганізацыі быў выхад Японіі з Лігі Нацый у сакавіку 1933 г. і падрыхтоўка да новых тэрытарыяльных захопаў.

У 1937 г. японскія мілітарысты разгарнулі шырокамаштабную агрэсію ў цэнтральным Кітаі, захапіўшы велізарную тэрыторыю і багатыя прыродныя рэсурсы. Японскі ўрад заявіў, што мэтай вайны з'яўляецца ўстанаўленне «новага парадку ва Усходняй Азіі». Савецкі Саюз падтрымаў Кітай, заключыўшы з ім 21 жніўня 1937 г. дагавор аб ненападзенні. У лістападзе 1937 г. у Бруселі адкрылася канферэнцыя 19-ці краін, якая абмяркоўвала пытанне японскай агрэсіі. Савецкі ўрад патрабаваў прымяніць санкцыі супраць Японіі. Але ўдзельнікі канферэнцыі толькі маральна асудзілі агрэсара і абмежаваліся добрымі пажаданнямі ў адрас Кітая.

Правячыя колы Англіі, Францыі і ЗША рабілі спробы справакаваць савецка-японскую вайну на Далёкім Усходзе. Толькі з 1936 па 1938 гг. на мяжы СССР адбылося 230 узброеных канфліктаў савецкіх войск з японцамі. Летам 1938 г. японскія войскі захапілі частку савецкай тэрыторыі каля возера Хасан, але былі разгромлены. У маі – жніўні 1939 г. у раёне р. Халхін-Гол у Мангольскай Народнай Рэспубліцы савецкія і мангольскія войскі здолелі разбіць буйную японскую групоўку (38 тыс. салдат). Паражэнне японскай арміі каля



Библиотека БГУИР

воз. Хасан і ў раёне р. Халхін-Гол з’явілася сур’ёзным ударам па агрэсіўных намерах японскіх мілітарыстаў на Далёкім Усходзе.

Такім чынам, рост мілітарызму і рэваншысцкіх настрояў у Германіі, Італіі і Японіі прывёў да ўзнікнення ў 30-я гг. трох ачагоў ваеннай напружанасці – у Еўропе, Паўночнай Афрыцы і Міжземнамор’і і на Далёкім Усходзе, з якіх потым распаліўся сусветны пажар. Кіруючыя колы Англіі і Францыі ў гэты час займалі пазіцыю так званага «уміратварэння» і рабілі шмат, каб адхіліць ад сябе германскую агрэсію і накіраваць яе на Усход супраць Савецкага Саюза. Такая палітыка мела пастаянную падтрымку і з боку ЗША.

**2. Спроба стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-французска-англійскія перагаворы ў Маскве летам 1939 г.** Важным этапам фарміравання міждзяржаўных адносін з’явілася дзейнасць Жэнеўскай міжнароднай канферэнцыі па раззбраенні. Яна працавала на працягу 1932 – 1935 гг. з удзелам прадстаўнікоў 63 краін. На гэтым форуме прадстаўнікі Савецкага Саюза настойліва прапанавалі здзейсніць прынцып усеагульнага і поўнага раззбраення, але заходнія дзяржавы не падтрымалі савецкую прапанову.

Па ініцыятыве СССР у маі 1935 г. былі падпісаны савецка-французскі і савецка-чэхаславацкі пакты аб узаемадапамозе супраць агрэсіі. Гэтыя міралюбівыя ініцыятывы маглі б стацца ў далейшым сур’ёзным падмуркам стрымлівання агрэсіўнай палітыкі гітлераўскай Германіі і яе саюзнікаў і легчы ў аснову сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Але памылковыя вывады ВКП(б) і Камінтэрна аб хуткай «сусветнай рэвалюцыі» і краху сістэмы капіталізму ў большасці краін Захаду ўспрымаліся кіруючымі коламі заходніх дзяржаў як заклік да «камунізацыі Еўропы» і з’яўляліся падставай таго неканструктыўнага

Библиотека БГУИР

варыянта дыялогу, што вёўся паміж СССР і заходнімі краінамі. Адмоўную ролю адыгрывалі таксама сталінскія рэпрэсіі ў краіне.

Палітычнае кіраўніцтва СССР было добра інфармавана аб дзейнасці і сапраўдных намерах урадаў заходніх краін, аб чым яскрава сведчыць выступленне І.В. Сталіна на XVIII з’ездзе ВКП(б) 10 сакавіка 1939 г. Ён, у прыватнасці, зазначыў, што ў Еўропе ўжо склаліся два блокі дзяржаў. З аднаго боку – краіны Антыкамінтэрнаўскага блоку, а з другога – краіны Захаду на чале з Вялікабрытаніяй і Францыяй. Гаворачы пра намеры англійскага і французскага кіраўніцтва, І.В. Сталін выказваўся пераканаўча: *«Франция и Англия отвергли политику коллективной безопасности, коллективного сопротивления и заняли позицию нейтралитета… А политика невмешательства означает молчаливое согласие, попустительство агрессии, потворство в развязывании войны… Это опасная игра, равносильная погружению всех воюющих держав в трясину войны… с тем чтобы ослабить и измотать друг друга, подстрекающая немцев идти на восток, обещая легкую наживу и внушая: «Только начните войну с большевиками – и все будет в порядке»*.

Тым не менш кіраўніцтва Савецкага Саюза выступіла 17 красавіка 1939 г. з канкрэтнай прапановай аб заключэнні паміж СССР, Англіяй і Францыяй дагавору «*сроком на 5 – 10 лет … о взаимопомощи, включая и военную, в случае агрессии в Европе против любого из договаривавшихся государств*».

Парыж і Лондан зрабілі сустрэчныя захады, згодна з якімі Савецкі Саюз павінен быў аказваць неадкладную ваенную дапамогу не толькі Англіі і Францыі, але і тым краінам, якім яны гарантавалі бяспеку, што было непрыймальнай для Савецкага ўрада ўмовай. Англа-французскія прапановы не былі прыняты савецкім кіраўніцтвам, паколькі яны не ўтрымлівалі прынцыпа ўзаемнасці і



Библиотека БГУИР

ставілі СССР у няроўнае становішча. У іх не прадугледжвалася, па-першае, абавязкаў з боку Англіі і Францыі дапамогі Савецкай краіне ў выпадку нападзення Германіі на Савецкі Саюз. Па-другое, прапановы распаўсюджвалі гарантыю аказання ваеннай дапамогі толькі Польшчы і Румыніі, у той час як бяспека паўночна-заходніх межаў СССР – з боку Фінляндыі, Эстоніі і Латвіі – не гарантавалася і яны заставаліся неахопленымі дамоўленасцямі.

**З 15 чэрвеня па 2 жніўня 1939 г. перамовы паміж СССР, Англіяй і Францыяй праходзілі ў Маскве.** Адбылося 12 пасяджэнняў. Аднак станоўчых рашэнняў не было знойдзена. Па ініцыятыве савецкай дэлегацыі была дасягнута дамоўленасць аб працягу перамоў і адначасовым падпісанні палітычнага і ваеннага пагадненняў.

Нягледзячы на ўсю неадкладнасць перамоў, англійская і французская ваенныя місіі прыбылі ў Маскву толькі ў сярэдзіне жніўня, да таго ж іх прадстаўнікі не былі надзелены правам прымаць рашэнні. Перамовы працягваліся з 12 па 21 жніўня, адбылося дзевяць пасяджэнняў, але безвынікова. Кіраўнік Генеральнага штаба Чырвонай Арміі Б.М. Шапашнікаў вымушаны быў 15 жніўня адкрыта заявіць, што СССР гатоў выставіць супраць агрэсара ў Еўропе 136 дывізій, 5 тыс. гармат, 9 – 10 тыс. танкаў і каля 5,5 тыс. самалётаў. Былі прапанаваны тры варыянты сумесных дзеянняў. Паўстала праблема ў выпадку ваеннай неабходнасці пропуску праз польскую тэрыторыю савецкіх войск. Як стала вядома, польскія ўлады негатыўна аднесліся да такой прапановы. У выніку перамоў для савецкага кіраўніцтва стала відавочным нежаданне іх ўдзельнікаў дасягнуць пазітыўных і хуткіх вынікаў. Перамовы зайшлі ў тупік.

Адначасова паміж прадстаўнікамі Вялікабрытаніі, Францыі і Германіі на дзяржаўных і дыпламатычных узроўнях таксама

Бібліятэка БГУІР

адбываліся перамовы. Рабілася шмат, каб падштурхнуць нацысцкую Германію да ўзброенага канфлікту з СССР.

**3. Савецка-германскія адносіны ў канцы 30-х гг. XX ст. Сакрэтны дадатковы пратакол да савецка-германскага дагавору аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г.** У красавіку 1939 г. Гітлер даў дырэктыву камандаванню вермахта пачаць распрацоўку плана нападзення на Польшчу, пры гэтым ён быў занепакоены тым, што ў выпадку агрэсіі Савецкі Саюз можа выступіць на баку Польшчы. Па ініцыятыве германскага боку пачаліся савецка-германскія кантакты, зандаж і перагаворы.

**20 жніўня 1939 г. быў падпісаны савецка-германскі гандлёвы дагавор**, па якому СССР атрымаў крэдыт у 200 млн марак для закупкі ў Германіі машын, абсталявання, аптычных прыбораў, бранявой сталі. СССР згодна з дагаворам пастаўляў Германіі збожжа, лес, нафту, каляровыя металы. Трэба адзначыць, што СССР добрасумленна выконваў умовы дагавору. Нават 22 чэрвеня 1941 г., калі нямецкія самалёты бамбілі нашы гарады і сёлы, савецкія эшалоны з нафтай, лесам і збожжам перасякалі граніцу Германіі. У той жа час Германія ўжо ў пачатку 1941 г. спыніла свае пастаўкі па дагавору, спасылаючыся на ўнутраныя цяжкасці.

20 жніўня 1939 г. Гітлер даслаў І.В. Сталіну тэлеграму, у якой прапанавалася заключыць дагавор аб ненападзенні. У ёй, у прыватнасці, значылася: «*Поэтому я еще раз предлагаю Вам принять моего министра иностранных дел во вторник 22-го августа, самое позднее, в среду 23 августа. Имперский министр иностранных дел будет облечен всеми чрезвычайными полномочиями для составления и подписания пакта о ненападении*».

**23 жніўня 1939 г. у Маскве быў падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў.** Яго падпісалі ў



Библиотека БГУИР

прысутнасці І.В. Сталіна і іншых вышэйшых кіраўнікоў СССР з савецкага боку старшыня Саўнаркома, нарком замежных спраў В.М. Молатаў, з германскага боку – міністр замежных спраў І. Рыбентроп. Таму ў публіцыстычнай літаратуры гэты дагавор іншы раз называюць **«пактам Молатава – Рыбентропа»**.

У тагачасных міжнародных абставінах падпісанне гэтага дагавору было крокам у правільным накірунку. Дагавор, ***па-першае***, даваў СССР адтэрміноўку ад нападзення Германіі, а таксама час і магчымасці для ўмацавання абараназдольнасці краіны. Іншая справа, што гэтыя магчымасці савецкім кіраўніцтвам не былі рэалізаваныя цалкам. ***Па-другое***, у гэты час неспакойна было на ўсходніх граніцах СССР. З мая па жнівень 1939 г. ішлі баі на р. Халхін-Гол у Манголіі, куды ўварваліся японскія войскі. Перад СССР стаяла рэальная перспектыва вайны на два фронты – супраць Германіі і Японіі, саюзнікаў па «Антыкамінтэрнаўскім пакце» 1936 г. Савецка-германскі дагавор 1939 г. не даваў магчымасці аб'яднацца Германіі і Японіі супраць СССР. ***Па-трэцяе***, пасля мюнхенскай змовы 1938 г., нежадання Англіі і Францыі ствараць сістэму еўрапейскай калектыўнай бяспекі, іх намеру накіраваць агрэсію Германіі на Усход Савецкі Саюз па сутнасці аказаўся ў міжнароднай ізаляцыі. Савецка-германскі дагавор 1939 г. даваў магчымасць не дапусціць стварэння адзінага антысавецкага фронту.

Германіі дагавор аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г. даваў свабоду дзеянняў у адносінах да Польшчы, а таксама краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Адначасова ад савецкай і сусветнай грамадскасці ўтойваўся той факт, што разам з дагаворам быў падпісаны **«сакрэтны дадатковы пратакол»**.

Чаму «сакрэтны дадатковы пратакол» утойваўся ад савецкай і сусветнай грамадскасці? Таму, што гэтым дакументам вызначаліся

Библиотека БГУИР

сферы ўплыву паміж СССР і Германіяй. У сферу ўплыву СССР траплялі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна, што было палітычна абгрунтаваным; значная тэрыторыя Польшчы паміж рэкамі Нараў, Вісла і Сан (ад заходняй савецкай граніцы і аж да Варшавы); Латвія і Эстонія. Апошняе з’яўлялася грубым парушэннем правоў польскага, латвійскага і эстонскага народаў на самавызначэнне. Пратакол прадугледжваў ліквідацыю Польскай дзяржавы і падзел яе тэрыторыі. Абедзве краіны прызнавалі інтарэсы Літвы ў адносінах да Віленскай вобласці. Літва лічылася сферай інтарэсаў Германіі. Германскі бок падтрымліваў інтарэс СССР да Бесарабіі.

Зараз існуе толькі копія гэтага пратакола. Першапачаткова арыгінал дагавору і сакрэтнага пратакола захоўваўся ў сейфе Міністэрства замежных спраў Германіі. Вясной 1945 г. германскія архівы былі знішчаны нацыстамі, а мікракопіі дакументаў закопаны ў зямлю ў парку замка Шэнберг (Цюрынгія). У маі 1945 г. англа-амерыканцы адкапалі мікрафільмы і даставілі іх у Лондан. З іх амерыканцы зрабілі дублікаты, фотакопіі якіх сёння вядомыя свету.

Безумоўна, першапачаткова арыгінал «сакрэтнага дадатковага пратакола» захоўваўся савецкім бокам у Міністэрстве замежных спраў СССР. Разгледзім некаторыя версіі наконт лёсу арыгінала гэтага дакумента. ***Версія першая.*** Магчыма, яшчэ у час вайны ці пасля яе заканчэння, калі СССР пачаў будаваць новыя адносіны з народнай Польшчай, тагачаснае савецкае кіраўніцтва, каб не азмрочваць гэтыя адносіны сваімі «некарэктнымі» дзеяннямі у адносінах да суверэннай Польшчы ў 1939 г., знішчыла арыгінал «сакрэтнага дадатковага пратакола». Магчыма, гэта было зроблена пасля смерці І.В. Сталіна па ўказанні В.М. Молатава, які ад савецкага боку падпісваў пратакол і доўгі час знаходзіўся ў складзе вышэйшага савецкага кіраўніцтва.

Библиотека БГУИР

***Версія другая.*** Магчыма, арыгінал «сакрэтнага дадатковага пратакола» знаходзіўся ў Асобнай папцы Генеральнага сакратара ЦК КПСС і быў знішчаны па ўказанні аднаго з генсекаў, можа быць і М.С. Гарбачова. Наконт апошняга прывядзем словы В. Болдзіна, кіраўніка апарата экс-прэзідэнта СССР: «*У 1987 г. арыгіналы сакрэтных пратаколаў і карта, – пісаў В. Болдзін, – былі пакладзены на стол Міхаілу Сяргеевічу. А на Першым з'ездзе народных дэпутатаў СССР М.С. Гарбачоў заявіў, што ўсе спробы знайсці арыгінал сакрэтнага дагавора закончыліся безпаспяхова*». Аднак можа быць, В. Болдзін бачыў копіі гэтых дакументаў, а сёння лічыць іх наўмысна арыгіналамі, каб абвінаваціць М.С. Гарбачова.

***Версія трэцяя.*** Магчыма, арыгінал «сакрэтнага дадатковага пратакола» да савецка-германскага дагавору аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г. добра схаваны і яго не змаглі пакуль што знайсці не толькі гісторыкі, але і «дэмакратычна настроеныя палітыкі», вельмі зацікаўленыя ў тым, каб яшчэ раз моцна абвінаваціць І.В. Сталіна і ўсё вышэйшае савецкае кіраўніцтва. Адным словам, гісторыя з арыгіналам «сакрэтнага дадатковага пратакола», які захоўваўся савецкім бокам, на сённяшні дзень – загадка.

Як вынікае з тэксту дакументаў, Савецкаму Саюзу даваліся пэўныя гарантыі бяспекі. Аднак ні дагавор аб ненападзенні, ні прыкладзены да яго «сакрэтны дадатковы пратакол» не ўтрымлівалі артыкулаў аб ваенным супрацоўніцтве двух краін і не абавязвалі весці баявых дзеянняў супраць трэціх краін, альбо аказваць дапамогу ў выпадку ўдзелу адной з іх у ваенным канфлікце. Дасягнутыя дамоўленасці паміж СССР і Германіяй не рабілі іх саюзнікамі ні фармальна, ні фактычна, хаця некаторыя аўтары імкнуцца сёння даказваць адваротнае.

Библиотека БГУИР

**4. Пачатак Другой сусветнай вайны, яе прычыны і характар.**

Ужо праз тыдзень пасля знікнення з палітычнай карты Чэхаславакіі ўвага нацысцкага кіраўніцтва сканцэнтравалася на Польшчы. 11 красавіка 1939 г. Гітлер зацвердзіў план ваеннага захопу Польшчы – «план Вайс» (Белы), а 28 красавіка германскае кіраўніцтва аб'явіла аб дэнансацыі абавязкаў аб ненападзенні, заключаных паміж Польшчай і Германіяй у 1934 г. Да канца жніўня 1939 г. падрыхтоўка да нападзення на Польшчу была закончана і 31 жніўня 1939 г. Гітлер падпісаў адпаведную дырэктыву.

У ноч з 31 жніўня на 1 верасня 1939 г., калі ўся «ваенная машына» Германіі была гатова да рыўка на Польшчу, германскія спецслужбы правялі правакацыйную аперацыю «Гіммлер». Пераапранутыя ў польскую форму эсэсаўцы і вязні канцэнтрацыйных лагераў, якія валодалі польскай мовай, «захапілі» радыёстанцыю ў германскім горадзе Глейвіц (цяпер польскі Глівіцэ). Непасрэдным кіраўніком аперацыі з'яўляўся штурмбанфюрэр СС А. Науйокс. Быццам бы з захопленай радыёстанцыі прагучаў зварот на польскай мове, у якім быў прызыў «аб'ядноўвацца і біць немцаў». Раніцай Гітлер звярнуўся да германскага народа і ўсю віну за развязванне ваеннага канфлікта ўсклаў на польскае кіраўніцтва.

1 верасня 1939 г. Германія абрушыла ўсю стальную моц вермахта на Польшчу. Англія і Францыя, звязаныя з Польшчай саюзнымі дагаворамі, 3 верасня 1939 г. аб'явілі вайну Германіі. У вайну ўступілі брытанскія дамініёны і калоніі: Аўстралія, Новая Зеландыя, Індыя, Канада, Паўднёва-Афрыканскі Саюз. **Пачалася Другая сусветная вайна.**

Асноўнай прычынай вайны з'явілася абвастрэнне супярэчнасцей і барацьба паміж буйнейшымі капіталістычнымі дзяржавамі за перадзел зон уплыву, што скланіся пасля Першай сусветнай вайны. Адзін ваенна-палітычны блок дзяржаў узначальвалі фашысцкія

Германія і Італія і мілітарысцкая Японія, другі – Вялікабрытанія, Францыя і ЗША.

**У савецкай гістарыяграфіі** сцвярджалася, што Другая сусветная вайна, якая пачалася як вайна паміж дзвюма групоўкамі імперыялістычных дзяржаў за новы перадзел свету, мела спачатку захопніцкі, імперыялістычны характар (для правячых колаў усіх імперыялістычных дзяржаў) з элементамі справядлівай вайны для народаў, якія сталі ахвярамі агрэсіі (Польшча, Кітай і інш.); што паступова справядлівы характар вайны для народаў-ахвяр агрэсіі ўзмацняўся; што з нападзеннем Германіі на СССР уся вайна з боку антыгітлераўскай кааліцыі стала справядлівай, вызваленчай. **У сучаснай гістарыяграфіі** іншы раз сцвярджаецца, што незалежна ад суб'ектыўных мэт «міратворцаў» Англіі, Францыі і іншых краін і стаяўшых за імі ўплывовых палітычных і ваенных колаў, для якіх гітлераўскі фашызм быў зручнай зброяй барацьбы з камунізмам, гэтая вайна не толькі для народаў, але і ўрадаў Польшчы, Англіі, Францыі і іншых ахвяр германскай агрэсіі была справядлівай з самага пачатку. Размова ішла не проста аб тэрытарыяльным перадзеле свету, перш-наперш калоній, як у Першую сусветную вайну. На гэты раз размова ішла аб незалежным існаванні і Польшчы, і Англіі, і Францыі, і іншых краін, якія гітлераўская Германія планавала захапіць і парабаваць.

У апошні час з'явіліся публікацыі былога афіцэра савецкай ваеннай разведкі, здрадніка Суворава (Рэзуна) «Ледакол», «Последняя республика (Почему Советский Союз проиграл Вторую мировую войну)», у якіх зроблена спроба шляхам выкарыстання неправераных крыніц (дакументаў) і падтасовак абвінаваціць савецкае кіраўніцтва і асабіста І.В. Сталіна ў развязванні Другой сусветнай вайны. З вялікай асалодай гэту фальшыўку тыражыруюць купленыя за грошы Захаду гісторыкі, публіцысты і журналісты з

некаторых расійскіх сродкаў масавай інфармацыі. Мэта – дыскрэдытацыя сацыялізму як грамадска-палітычнай сістэмы: аказваецца, што Другую сусветную вайну развязаў не капіталізм, а сацыялізм… Чаму толькі не дадумаліся абвінаваціць сацыялізм у развязванні Першай сусветнай вайны?

Каб даказаць тое, што СССР развязаў Другую сусветную вайну, трэба адказаць па меншай меры на тры пытанні. **Першае**, наяўнасць палітычнага рашэння вышэйшага кіраўніцтва СССР (ЦК ВКП(б) і СНК СССР) аб развязванні Другой сусветнай вайны. Такіх дакументаў ніхто з гісторыкаў, палітыкаў і публіцыстаў не знайшоў, бо рашэнне аб развязванні вайны савецкім кіраўніцтвам ніколі не прымалася. **Другое**, наяўнасць адобранага і зацверджанага вышэйшым кіраўніцтвам СССР плана вядзення вайны. Любая краіна, якая пачынае вайну, мае план яе вядзення. Такога плана СССР аб пачатку і вядзенні Другой сусветнай вайны таксама няма. **Трэцяе**, наяўнасць плана пераводу эканомікі на ваенныя рэйкі, гэтак званай мілітарызацыі эканомікі. Такога плана напярэдадні сусветнай вайны ў СССР не было. Ён з'явіўся толькі пасля нападу на СССР фашысцкай Германіі.

Значыць, няма ніякіх дакументаў, якія б сведчылі аб падрыхтоўцы СССР да развязвання сусветнай вайны. Дакладна вядома адно: тое, што Другую сусветную вайну развязаў капіталізм, яго самы агрэсіўны авангард – Германія, Італія, Японія.

Груба фальсіфікуе пачатак Другой сусветнай вайны і беларускі гісторык З. Шыбека ў кнізе «Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002». Адзін з раздзелаў яго кнігі называецца «Падпальшчыкі сусветнай вайны». З. Шыбека піша: «*У той час, калі палякі абараранялі Варшаву, на Польскую дзяржаву напаў Іосіф Сталін. Так пачалася Другая сусветная вайна. Гітлер і Сталін выступілі ў ёй напачатку*



Библиотека БГУИР

*хаўруснікамі. Планаваўся адначасовы напад на Польшчу, але Чырвоная Армія ўвязла ў ваенны канфлікт з Японіяй. Дый Сталін марудзіў, каб усю віну за напад на Польшчу перакласці на Гітлера*» (с.298 – 299).

Наступны падзагаловак З. Шыбека назваў так: «Ваенныя дзеянні «саюзнікаў» супраць Польшчы». У ім бяздоказна сцвярджаецца, што «*для навядзення германскіх самалётаў савецкі ўрад дазволіў выкарыстоўваць радыёстанцыю ў Мінску. Таму БССР была ўцягнута ў Другую сусветную вайну не ў 1941 г., а ў 1939 г., прычым у саюзе з нацысцкай Германіяй*». Далей аўтар піша, што «*войскі вермахта ... яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі захапілі польскія землі на ўсход ад Варшавы, якія па дамоўленасці былі ў савецкай сферы ўплыву. Але сталіністы з гэтым змірыліся. Акупацыя цэнтральнай Польшчы не дазваляла б савецкую захопніцкую акцыю маскіраваць пад «вызваленчы паход». Гэта акцыя дала б падставу саюзнікам Польшчы – Англіі і Францыі – абвясціць вайну абодвум агрэсарам: Германіі і СССР*» (с. 299).

Нават школьнікі ведаюць, што Другую сусветную вайну пачала фашысцкая Германія нападзеннем на Польшчу 1 верасня 1939 г. Савецкі Саюз увёў свае войскі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну тады, калі Польская дзяржава была ўжо фактычна знішчана і навісла пагроза фашысцкага рабавання этнічных беларускіх і ўкраінскіх земляў. Кіраўніцтва СССР, зыходзячы са сваіх палітычных і ваенна-стратэгічных інтарэсаў, узяло пад сваю абарону насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і зрабіла ўсё для таго, каб да Савецкага Саюза былі далучаны землі са складу былой Расійскай



Библиотека БГУИР

імперыі, а пазней Савецкай Расіі, якія ў 1919 – 1921 гг. анексіравала буржуазная Польшча і якія па праву павінны былі знаходзіцца ў складзе БССР і УССР. Таму няма ніякіх падстаў называць Савецкі Саюз «падпальшчыкам сусветнай вайны», абвінавачваць СССР у развязванні Другой сусветнай вайны, а Сталіна і Гітлера называць хаўруснікамі. Гэта – ***па-першае***.

***Па-другое***, Савецкі Саюз і фашысцкая Германія ніколі не былі саюзнікамі, хаўруснікамі, як памылкова сцвярджае З. Шыбека, які імкнецца дыскрэдытаваць сацыялізм як сістэму і паставіць знак роўнасці паміж сацыялізмам і фашызмам. У гэтай бруднай справе гэты аўтар не з’яўляецца піянерам. Ён перапісвае сёння тое, што напісалі былыя здраднікі, якія ў 1944 г. разам з фашыстамі ўцяклі на Захад, а таксама так званыя «саветолагі» розных колераў і адценняў. Ні ў дагаворы паміж СССР і Германіяй аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г., ні ў дадатковым сакрэтным пратаколе да яго, як ужо указвалася, не ўтрымліваліся артыкулы аб узаемнай дапамозе, аб сумесных ваенных дзеяннях супраць дзяржаў, якія напалі б на адну з краін, падпісаўшых дагавор, ці супраць дзяржаў, якія знаходзіліся б у стане вайны з Савецкім Саюзам ці фашысцкай Германіяй.

***Па-трэцяе***, сапраўды, войскі вермахта захапілі польскія землі на ўсход ад Варшавы, якія па дамоўленасці ад 23 жніўня 1939 г. былі ў савецкай сферы ўплыву. Але «сталіністам» з гэтым не прыйшлося мірыцца, як памылкова сцвярджае аўтар, бо савецкае кіраўніцтва не прэтэндавала на ўласна польскія землі, яно ўзяло пад сваю абарону толькі тыя землі, якія сталі ахвярай польскай агрэсіі 1919 – 1920 гг. Вядома, што з самага пачатку нападзення Германіі на Польшчу

кіраўніцтва рэйха падштурхоўвала Савецкі Саюз да ўступлення ў вайну. Але савецкае кіраўніцтва гэтага не зрабіла да таго часу, пакуль фашысты не акупіравалі ўсю ўласна польскую тэрыторыю. І толькі 17 верасня 1939 г. камандаванне Чырвонай Арміі атрымала загад перайсці дзяржаўную граніцу і пачаць вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. І не трэба З. Шыбеку словы «вызваленчы паход» браць у двухкоссе, бо гэта быў сапраўды вызваленчы паход, які даў магчымасць уз’яднацца беларускаму і ўкраінскаму народам ў этнічных межах іх пражывання.

Усе краіны, якія аб’явілі вайну Германіі, баявых дзеянняў і неабходнай дапамогі Польшчы не аказалі. Нагадаем, што французская армія павінна была на 15-ы дзень пасля нападу Германіі на Польшчу перайсці ў наступленне. Ваенныя магчымасці Англіі і Францыі па недапушчэнні германскай агрэсіі былі больш чым значныя. Разам з Польшчай яны мелі: 172 дывізіі, каля 4 000 танкаў, звыш 7 600 самалётаў, да 36 000 гармат і мінамётаў. Германія мела толькі 103 дывізіі, 3 200 танкаў, звыш 4 000 самалётаў і 26 000 гармат і мінамётаў. Відавочна, пры рашучасці саюзнікаў іх удар на захадзе здолеў бы карэнным чынам змяніць ход ваенных падзей. У гэтай сувязі начальнік штаба аператыўнага кіраўніцтва ўзброеных сіл Германіі генерал-палкоўнік А. Йодль на Нюрнбергскім працэсе заявіў: *«...если мы еще в 1939 г. не потерпели поражения, то это только потому, что примерно 110 французских и английских дивизий, стоявших во время нашей войны с Польшей на Западе против 23 германских дивизий, оставались совершенно бездеятельными».*

Польскае кіраўніцтва спачатку паверыла, што з уступленнем у вайну брытанскія і французскія саюзнікі выканаюць свае абавязкі. Насельніцтва Польшчы з энтузіязмам сустрэла вестку аб рашэннях Англіі і Францыі ўступіць у вайну, грамадскасць разлічвала на



Библиотека БГУИР

саюзнікаў. Перш за ўсё Польшчы патрабавалася неадкладная падтрымка авіяцыяй. Але час ішоў, а саюзная авіяцыя ў польскім небе так і не з'явілася.

Германскія войскі ў складзе дзвюх армій «Поўнач» і «Поўдзень», якія напалі на Польшчу, налічвалі 1,6 млн чал., 2 800 танкаў, 2 000 самалётаў, звыш 100 караблёў, каля 6 000 гармат і мінамётаў, і былі аб'яднаныя ў 62 дывізіі, у тым ліку ў 7 танкавых і 4 матарызаваных. Ім процістаялі шэсць польскіх армій: «Модлін», «Памор'е», «Познань», «Лодзь», «Кракаў», «Карпаты», якія былі разгорнуты на мяжы з Германіяй, і адна армія «Прусы» – ў тыле, дзве аператыўныя групы: «Нарэў», «Вышкаў» і група «Піскор». Польскія войскі налічвалі каля 1 млн чал., 870 танкаў і танкетак, 4 300 гармат, 407 самалётаў і 13 ваенных караблёў і былі аб'яднаныя ў 39 дывізій, у тым ліку ў 16 кавалерыйскіх, 2 бронематарызаваныя і 3 горнастралковыя брыгады. Як відаць, суадносіны сіл былі на карысць немцаў: па пяхоце – 1,8 : 1, па артылерыі – 3 : 1, па танках – 4 : 1, па авіяцыі – 5 : 1. Да таго ж польскае камандаванне не паспела закончыць мабілізацыю і разгортванне арміі. Калі немцы мелі ў поўнай гатоўнасці 95 % сваіх сіл, то палякі – каля 49 %.

Нягледзячы на мужнае супраціўленне польскіх салдат і афіцэраў, германская армія, валодаючы вялікай ваеннай перавагай, акупіравала да 16 верасня большую частку тэрыторыі Польшчы і выйшла на «лінію Керзана» – прыкладную мяжу рассялення палякаў, з аднаго боку, і украінцаў і беларусаў – з другога, якая была вызначана Парыжскай мірнай канферэнцыяй яшчэ ў 1919 г. Польскі ўрад 16 верасня пакінуў краіну, эмігрыраваўшы ў Румынію, а затым у Лондан. Многія польскія патрыёты, якія засталіся вернымі прысязе, працягвалі змагацца, выконваючы свае вайсковыя абавязкі. Асабліва геранчна змагаліся абаронцы Варшавы, якія толькі 27 верасня капітулявалі. Агульнае становішча польскіх войск аказалася



Библиотека БГУИР

катастрафічным. У другой палове верасня польскай арміі як арганізаванага цэлага ўжо не існавала. Страты польскай арміі былі значнымі. Загінула каля 65 тыс. воінаў, прыкладна 140 тыс. былі параненыя, у германскім палоне апынулася каля 400 тыс. польскіх салдат і афіцэраў, у тым ліку 70 тыс. беларусаў.

У ходзе польскай кампаніі значнымі былі і германскія страты, якія склалі 16,4 тыс. забітымі, 27,6 тыс. параненымі, было знішчана 933 танкі і бронемашыны, 6 046 аўтамабіляў, 360 гармат і мінамётаў, каля 60 самалётаў. Некаторыя аналітыкі лічаць, што вынікі германскіх страт надоўга затрымалі пачатак германскага наступлення на Францыю.

Такім чынам, нападзеннем фашысцкай Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. пачалася Другая сусветная вайна.

## Лекцыя 2. Другая сусветная вайна, падзеі ў Еўропе і Беларусі. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны

***План***

1. Уступленне войск Чырвонай Арміі ў заходнія вобласці Беларусі і Украіны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

2. СССР і краіны Балтыі ў 1939 – 1940 гг. Утварэнне Малдаўскай ССР. Савецка-фінская вайна.

3. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. Падрыхтоўка Германіі да вайны з СССР. Прыняцце плана «Барбароса».

4. Дзейнасць савецкага кіраўніцтва па падрыхтоўцы краіны да абароны: дасягненні і пралікі. Заходняя Асобая ваенная акруга.

**1. Уступленне войск Чырвонай Арміі ў заходнія вобласці Беларусі і Украіны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.** Кіраўніцтва Германіі не толькі ўважліва сачыла за развіццём сітуацыі ў СССР, але нават усяляк падштурхоўвала савецкае кіраўніцтва да

Библиотека БГУИР

актыўных дзеянняў супраць Польшчы. Ужо 3 верасня 1939 г. германскі пасол у СССР Ф. Шуленбург высвятляў у В.М. Молатава пазіцыю СССР аб магчымым увядзенні войск Чырвонай Арміі ў зону ўплыву, якая была вызначана сакрэтным пратаколам да савецка-германскага пакта аб ненападзенні. «*Мы уверены,* – падкрэслівалася ў адным з германскіх пасланняў, – *что разобьем польскую армию в течение одной недели. Однако в таком случае под германской оккупацией окажутся территории, которые определены в Москве как сфера влияния СССР... Не считает ли возможным Советский Союз выступить против польских сил и занять эти территории*».

11 верасня 1939 г. быў аддадзены загад аб стварэнні Беларускага і Украінскага франтоў, была аб'яўлена мабілізацыя рэзервістаў. Але і гэтыя дзеянні савецкага боку не задавальнялі германскіх «партнёраў». Каб прымусіць СССР выконваць дасягнутыя дамоўленасці, нацысцкія лідэры прыбеглі да палітычнага шантажу. У Маскву было накіравана пасланне, у якім гаварылася, што Германія прыпыніць наступленне супраць Польшчы, а на яе ўсходніх землях будуць створаны буферныя дзяржавы (беларуская, украінская, польская). У адказ у Берлін была накіравана таксама жорсткая заява, у якой падкрэслівалася, што ў выпадку прыняцця германскім бокам такога рашэння Савецкі Саюз наогул не пачне ваенных дзеянняў.

Развіццё падзей прымусіла СССР да больш актыўных ваенных дзеянняў. Ужо 16 верасня 1939 г. арміі Беларускага (камандуючы М.П. Кавалёў) і Украінскага (камандуючы С.К. Цімашэнка) франтоў былі разгорнутыя і падрыхтаваныя для вызваленчага паходу. Усяго мелася 60 стралковых, 13 кавалерыйскіх дывізій і 18 танкавых брыгад агульнай колькасцю 2 421 300 чал., 5 467 сярэдніх і цяжкіх гармат, 6 096 танкаў і 3 727 самалётаў.

**17 верасня 1939 г.** войскі Чырвонай Арміі перайшлі мяжу Польскай дзяржавы і пачалі паход у Заходнюю Беларусь і Заходнюю



Библиотека БГУИР

Украіну. У першы дзень былі ўжо вызвалены Баранавічы, 18 верасня – Навагрудак, Ліда, Слонім, 19 – Вільня, Пружаны, 20 – Гродна, 21 – Пінск, 22 – Беласток і Брэст. Нарэшце, пасля 20-гадовай акупацыі, сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту працоўныя заходніх абласцей Беларусі і Украіны атрымалі магчымасць уз'яднання.

Большая частка насельніцтва Заходняй Беларусі – рабочыя, сяляне, рамеснікі, працоўная інтэлігенцыя сустракалі савецкіх салдат як родных братоў, кветкамі, хлебам-соллю.У гарадах і вёсках узнікалі шматлюдныя мітынгі, на якіх працоўныя віталі сваіх вызваліцеляў. У некаторых месцах ствараліся ваенна-рэвалюцыйныя камітэты. Яны арганізоўвалі атрады з рабочых і сялян, якія раззбройвалі паліцэйскіх і асаднікаў, бралі пад ахову чыгуначныя масты, прадпрыемствы, іншыя аб'екты.

Паход войск Чырвонай Арміі працягваўся 12 дзён. Савецкія войскі занялі тэрыторыю прыкладна 190 тыс. км$^2$ з насельніцтвам каля 12 млн чал., у асноўным беларусаў і украінцаў. Польская дзяржава перастала існаваць. У перыяд з 17 па 30 верасня 1939 г. страты войск Беларускага фронту склалі 996 чал. загінуўшымі і 2002 параненымі.

А вось як З. Шыбека бачыць у сваёй кнізе рабаванне беларускага краю: *«Чырвонаармейцы нечакана для сябе ўбачылі на заходнебеларускіх землях брукаваныя дарогі, заможныя вёскі, багатыя кірмашы – і той вобраз жабрацкага краю, пра які казалі савецкія ідэолагі, імгненна знікаў. Абутыя ў брызентавыя чаравікі з абмоткамі, апранутыя ў паношанае абмундзіраванне, сталінскія байцы і афіцэры хапалі ўсё, што маглі. На ўсход пасыпаліся пасылкі. У Мінску і іншых гарадах БССР ішоў бойкі гандаль «польскімі таварамі». Па захопленых землях блукалі эмісары расійскіх музеяў, якія вывозілі беларускія скарбы… Па падліках амерыканскага*



Библиотека БГУИР

*даследчыка Яна Гроса, матэрыяльныя страты ад двухгадовага савецкага панавання на заходнебеларускіх землях склалі больш за 2 млрд польскіх злотых»* (с.303).

Брукаваныя дарогі ў некаторых мясцінах і брукаваныя вуліцы ў многіх вёсках сапраўды меліся. Але пра заможнае райскае жыццё жыхароў Заходняй Беларусі напісана занадта моцна, бо прыкладна 50 % жыхароў вёскі мелі харчовыя запасы толькі да сакавіка – красавіка кожнага года, а да ліпеня – жніўня (збору новага ўраджаю) вялі паўгалоднае жыццё. Так што савецкія ідэолагі, пра якіх піша З. Шыбека, не вельмі памыляліся ў ацэнцы жабрацкага становішча многіх жыхароў Заходняй Беларусі. А пра савецкіх салдат і афіцэраў, якія «ўсё хапалі, што маглі», З. Шыбека піша са знявагай і абразай, што недапушчальна. І, нарэшце, З. Шыбека называе аднаго з амерыканскіх аўтараў, у якога ён спісвае ўзятыя з неба і паветра лічбы, факты і ацэнкі. Якія заакіянскія настаўнікі, такі і беларускі вучань, на жаль, прафесар адной з мінскіх вышэйшых навучальных устаноў.

**28 верасня 1939 г**. СССР падпісаў з Германіяй дагавор **«Аб дружбе і граніцы»**, паводле якога граніца паміж СССР і Германіяй была праведзена па так званай «лініі Керзана», вызначанай яшчэ ў 1919 г. Вярхоўным саветам Антанты як усходняя граніца Польшчы. Гэта была сапраўдная этнічная мяжа паміж беларусамі і палякамі. Да дагавору былі прыкладзены два сакрэтныя пратаколы, згодна з якімі ў сферу ўплыву СССР былі ўключаны дадаткова Літва і Фінляндыя. Забаранялася польская агітацыя на тэрыторыі СССР і Германіі.

Дагавор з фашысцкай Германіяй «Аб дружбе і граніцы» адмоўна адбіўся на міжнародным аўтарытэце СССР. Ён дэзарыентаваў

Библиотека БГУИР

антыфашысцкія сілы ў краінах свету. Разам з тым дзяржаўная граніца СССР адсоўвалася на 200 – 300 кіламетраў на захад. Гітлер і гітлераўцы пазбаўляліся выгаднага стратэгічнага плацдарма для нападзення на СССР.

Дагавор «Аб дружбе і граніцы», як і дагавор «Аб ненападзенні» ад 23 жніўня 1939 г. і іншыя савецка-германскія дамоўленасці, у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права перасталі дзейнічаць з моманту нападзення Германіі на СССР, гэта значыць з 22 чэрвеня 1941 г.

Заўважым, што польскі эміграцыйны ўрад, створаны 30 верасня 1939 г. В. Сікорскім, кваліфікаваў савецка-германскую дамоўленасць ад 28 верасня як чацвёрты падзел Польшчы. У дэкрэце польскага прэзідэнта гаварылася аб непрызнанні і незаконнасці любых акупантаў (савецкіх і германскіх – *аўт.*) і барацьбе разам з саюзнікамі Польшчы за поўнае ўзнаўленне суверэнітэту і незалежнасці Польшчы ў межах да 1 верасня 1939 г.

Трагічнай і недастаткова даследаванай з’яўляецца праблема лёсу польскіх афіцэраў, трапіўшых у палон да Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г. З. Шыбека піша: *«Трагічны лёс напаткаў амаль 22 тыс. палонных польскага войска. Яны былі расстраляныя па загадзе крамлёўскага кіраўніцтва на чале з Іосіфам Сталіным у красавіку 1940 г. У Катынскім лесе пад Смаленскам загінуў 4421 чалавек, у Заходняй Беларусі і Украіне – 7305 чалавек, іншыя паклалі галовы ў розных месцах Савецкай Расіі (Казельск, Старабельск, Асташкава)»* (с.300). Калі ёсць «загад крамлёўскага кіраўніцтва на чале з Іосіфам Сталіным» аб растрэле палонных польскага войска, тады яго трэба надрукаваць і зрабіць даступным для грамадскасці. Але, на жаль, сапраўдных дакументаў і матэрыялаў ніхто з «дэмакратычных гісторыкаў», у тым ліку і З. Шыбека, не надрукаваў, а тое, што

Библиотека БГУИР

з’явілася на старонках некаторых расійскіх выданняў-аднадневак, сур’езныя даследчыкі лічаць фальшыўкамі.

Што тычыцца колькасці загінуўшых польскіх палонных, то ў розных кнігах, у тым ліку і школьных падручніках, сустракаюцца розныя лічбы: ад 3 – 4 тыс. да 22 тыс. чал., як у З. Шыбекі. Тут патрэбна дакладнасць, а калі яе няма – тады трэба навукова распрацоўваць гэту праблему, а не выдумляць абы якія лічбы. Зразумела, чаму З. Шыбека праяўляе такую цікавасць да трагедыі, якая адбылася ў Катынскім лесе каля Смаленска, а можа быць, і ў іншых мясцінах былога Савецкага Саюза, і не праяўляе ніякай цікавасці да генацыду польскім бокам 83 тыс. палонных чырвонаармейцаў у 1920 – 1921 гг. Незалежна ад таго, хто загубіў жыцці 83 тыс. савецкіх чырвонаармейцаў у 1920 – 1921 гг. і тысяч палонных палякаў напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, гэта цяжкія злачынствы супраць чалавечнасці, і задача гісторыкаў заключаецца ў тым, каб устанавіць гістарычную праўду для таго, каб такое больш нідзе і ніколі не паўтарылася.

На вызваленай тэрыторыі Заходняй Беларусі пачаліся сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні. У ваяводскіх і павятовых цэнтрах былі створаны **часовыя ўправы**, у мястэчках і вёсках – **сялянскія камітэты**. Гэта былі органы новай улады.

Сялянскія камітэты дзялілі памешчыцкую і царкоўную зямлю сярод беззямельных і малазямельных сялян, якія атрымалі 431 тыс. га зямлі, пераважна ворнай і сенакосу. Ім было перададзена 14 тыс. коней і 33,4 тыс. кароў, а таксама зерне на пасеў. У выніку было ліквідавана памешчыцкае землеўладанне, значна павялічылася серадняцкая праслойка ў вёсцы.

Библиотека БГУИР

У гарадах часовыя ўправы бралі на ўлік фабрыкі і заводы, пакінутыя іх уладальнікамі, арганізоўвалі вытворчасць. На многіх прадпрыемствах былі створаны групы і камісіі, якія ажыццяўлялі кантроль за іх дзейнасцю.

Адначасова вялася актыўная падрыхтоўка да выбараў у Народны Сход Заходняй Беларусі.

22 кастрычніка 1939 г. адбыліся выбары ў Народны Сход Заходняй Беларусі. На выбарчыя ўчасткі прыйшлі 2 672 тыс. чал., што складала 96,7 % выбаршчыкаў. За вылучаных кандыдатаў было аддадзена 90,7 % галасоў. З 926 абраных дэпутатаў Народнага Сходу 363 былі з сялян, пераважна беднякоў і парабкаў, 197 – з рабочых, 166 – з інтэлігенцыі і іншых пластоў насельніцтва. Сярод дэпутатаў было: 621 беларус, 127 палякаў, 72 яўрэя, 53 украінцы, 43 рускіх і 10 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

**28 – 30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку адбыўся Народны Сход Заходняй Беларусі.** Яго адкрыў старэйшы дэпутат С.Ф. Струг, селянін з вёскі Масевічы Ваўкавыскага павета. Па дакладах дэпутатаў С.В. Прытыцкага і Ф.Д. Манцэвіча Народны Сход прыняў Дэкларацыі аб дзяржаўнай уладзе і аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР. Былі прыняты таксама дэкларацыі аб канфіскацыі памешчыцкіх земляў, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. 2 лістапада 1939 г. Надзвычайная V сесія Вярхоўнага Савета СССР і 12 лістапада нечарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР адпаведна прынялі Законы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР.

У склад Беларускай ССР увайшла тэрыторыя плошчай 100 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 4,7 млн чал. Пераважную большасць насельніцтва складалі беларусы і толькі ў заходняй частцы Беластоцкай вобласці пераважала польскае насельніцтва. Плошча БССР павялічылася са 125,6 тыс. км$^2$ да 225,6 тыс. км$^2$, насельніцтва – з 5,6 млн да 10,3 млн чал.

Библиотека БГУИР

На тэрыторыі Заходняй Беларусі было ўтворана 5 абласцей – Баранавіцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская і Беластоцкая. Усяго ў БССР налічвалася 10 абласцей і 188 раёнаў.

Уключэнне заходніх абласцей у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік паклала канец падзелу беларускага і ўкраінскага народаў, захавала тэрытарыяльную цэласнасць гэтых рэспублік, уз'яднала народы ў адзінай дзяржаве СССР.

У канцы 1939 – пачатку 1940 гг. у заходніх абласцях ствараліся мясцовыя органы савецкай улады, а таксама партыйныя і камсамольскія арганізацыі. У пачатку 1941 г. мелася 1 232 пярвічныя партарганізацыі, якія аб'ядноўвалі 16 948 камуністаў.

Адбываліся сацыялістычныя пераўтварэнні ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. У лістападзе – снежні 1939 г. пачалася нацыяналізацыя прамысловых прадпрыемстваў і банкаў. На жаль, былі нацыяналізаваны не толькі буйныя і сярэднія прадпрыемствы, але і большая частка дробных, што пярэчыла рашэнням Народнага Сходу.

Аднаўляліся і пашыраліся прадпрыемствы, пачалося будаўніцтва новых фабрык і заводаў. Абсталяванне для іх завозілася з Расіі, Украіны і ўсходніх абласцей БССР. У канцы 1940 г. у заходніх абласцях дзейнічалі 392 прамысловыя прадпрыемствы, на якіх працавала каля 40 тыс. рабочых. Аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці павялічыўся амаль у 2 разы ў параўнанні з 1938 г. і склаў 27,6 % прамысловай вытворчасці рэспублікі.

Рэканструкцыя і будаўніцтва новых прадпрыемстваў, пераход на двух- і трохзменную працу дазволілі значна павялічыць колькасць занятых рабочых. 22 тыс. чал. былі накіраваны на фабрыкі і заводы Мінска, Магілёва, Віцебска, Оршы, Гомеля, іншых гарадоў усходніх абласцей БССР. У выніку да 1941 г. беспрацоўе ў рэгіёне практычна было пераадолена.



Библиотека БГУИР

Вялася работа па перабудове сельскай вытворчасці, ствараліся калектыўныя гаспадаркі. Да канца 1940 г. у заходніх абласцях БССР было арганізавана 646 калгасаў, а да чэрвеня 1941 г. – 1 115, якія аб’ядноўвалі 49 тыс. сялянскіх сем’яў. Іх абслугоўвалі 101 машынна-трактарная станцыя з 997 трактарамі, іншымі сельскагаспадарчымі машынамі, якія былі створаны за кароткі тэрмін з дапамогай усёй дзяржавы. На землях лепшых маёнткаў было арганізавана 28 саўгасаў.

Наладжваўся гандаль. У канцы 1940 г. тут дзейнічала 717 дзяржаўных магазінаў. Спажывецкая кааперацыя аб’ядноўвала каля 1 250 тыс. чал.

Некаторыя пераўтварэнні ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы выклікалі незадаволенасць у часткі польскага насельніцтва. Пры актыўнай падтрымцы польскага эміграцыйнага ўрада і касцёла ў большасці населеных пунктаў Заходняй Беларусі была створана даволі шырокая канспіратыўная сетка польскага нацыяналістычнага падполля, якое вяло барацьбу за захаванне Польшчы ў межах да 1 верасня 1939 г. Органы бяспекі правялі шэраг аперацый па разгрому канспіратыўнай сеткі. Толькі з кастрычніка 1939 г. па ліпень 1940 г. было выяўлена 109 падпольных арганізацый, якія аб’ядноўвалі 3 231 удзельніка, з якіх 2 904 чал. былі польскай нацыянальнасці.

У заходніх абласцях Беларусі за кароткі час была наладжана бясплатная сістэма медыцынскага абслугоўвання. Калі ў 1938 г. у заходніх абласцях было толькі каля 60 бальніц і каля 70 урачоў, то ў канцы 1940 г. тут мелася 243 бальніцы і радзільныя дамы. У медыцынскіх установах працавалі 1 755 урачоў і 5 585 сярэдніх медыцынскіх работнікаў.

Асабліва станоўчыя вынікі меліся ў нацыянальнай асвеце. Напрыклад, калі ў 1937 – 1938 навучальным годзе ў рэгіёне дзейнічала 4 221 школа, у якіх на польскай мове навучалася



Библиотека БГУИР

546,6 тыс. дзяцей, то ў 1939 – 1940 навучальным годзе ўжо працавала 5 643 школы, прычым у 4 278 навучанне вялося на беларускай мове, а ў астатніх дзеці вучыліся на рускай, польскай, яўрэйскай і літоўскай мовах. У пачатку 1941 г. каля 170 тыс. дарослых наведвалі школы па ліквідацыі непісьменнасці.

У заходніх абласцях Беларусі былі адкрыты 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы і 25 сярэдніх спецыяльных, у тым ліку 8 педвучылішч, 8 медвучылішч, 7 тэхнікумаў. На беларускай мове сталі выдавацца газеты, адкрыліся 5 драмтэатраў і 100 кінатэатраў, 220 бібліятэк з фондам 446 тыс. кніг.

Адкрываліся нацыянальна-культурныя ўстановы на польскай і яўрэйскай мовах. У 1940 г. у Беластоку былі адчынены польскі і яўрэйскі драматычныя тэатры. У красавіку 1941 г. у Гродне адкрыўся музей польскай літаратуры імя Э. Ажэшкі. Выходзілі на польскай мове газеты, працавалі рэдакцыі польскага радыёвяшчання.

Значны ўклад у сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ўнеслі кіраўнікі і арганізатары вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Сярод іх – А.І. Валынец, І.Я. Дабрыян, М.Е. Крыштафовіч, З.Ф. Паплаўскі, С.В. Прытыцкі, І.П. Урбановіч, У.З. Царук, В.З. Харужая і многія іншыя. Патрэбна назваць дзеячаў беларускай нацыянальнай культуры М. Танка, Я. Брыля, П. Пястрака, В. Таўлая, М. Васілька, М. Засіма, А. Салагуба, С. Новіка-Пяюна, якія шмат зрабілі для абуджэння нацыянальнай годнасці народа.

Становішча ў Заходняй Беларусі ў 1939 – 1941 гг. З. Шыбека тлумачыць наступным чынам: *«На вялікі жаль і на вялікі сорам, аб'яднанне беларускіх земляў адбылося ў выніку змовы паміж гітлераўскай Германіяй і сталінскім СССР… Трагічным было і тое, што гэтае аб'яднанне ажыццявілася ў рамках таталітарнай камуністычнай імперыі. Беларусы не займелі той незалежнай*

*нацыянальнай дзяржавы, пра якую марылі, і не сталі гаспадарамі на сваёй зямлі. Беларуская адміністрацыя крамлёўскага дыктатара пашырала сваю ўладу амаль на ўсе беларускія землі. Адзін захопніцкі рэжым Заходняй Беларусі змяніўся другім, яшчэ больш жорсткім і бязлітасным. Аб'яднаная Бацькаўшчына стала аб'ектам далейшых злачынных эксперыментаў бальшавікоў. Сталінскія рэпрэсіі ў Заходняй Беларусі сталіся нашмат болей згубнымі для беларусаў, чым для яўрэяў ці палякаў... Загінулі носьбіты беларускай незалежніцкай ідэі»* (с.309).

Навукі тут аніякай. Суцэльныя суб'ектывісцкія палітыка-ідэалагічныя ацэнкі працэсаў і з'яў, якія адбываліся ў Заходняй Беларусі. З. Шыбека так піша заўсёды, дэманструючы лютую нянавісць да ўсяго савецкага, расійскага, маскоўскага, стараючыся паставіць на адну дошку фашысцкую Германію і СССР, што не да твару нашчадку тых, хто разграміў германскі фашызм. Затое патрыётамі ён без сораму называе тых, каго беларускі народ адносіць да здраднікаў: А. Станкевіча, Р. Астроўскага, М. Шчорса, В. Тумаша і іншых.

**2. СССР і краіны Балтыі ў 1939 – 1940 гг. Утварэнне Малдаўскай ССР. Савецка-фінская вайна.** Адначасова з вызваленнем Заходняй Беларусі была вызвалена Віленшчына (Віленска-Трокскі, частка тэрыторыі Свянцянскага і Браслаўскага паветаў), якая згодна з умовамі Рыжскага міру (1921 г.) знаходзілася пад уладай Польшчы. 19 верасня 1939 г. Чырвоная Армія заняла Вільню. На вызваленых землях наладжвалася новае жыццё. Паўсюдна праходзілі мітынгі і дэманстрацыі, на якіх народ вітаў сваё вызваленне і выказваў жаданне жыць у адзінай беларускай дзяржаве.



Библиотека БГУИР

У пачатку кастрычніка 1939 г. Віленская ўправа прыняла рашэнне ўдзельнічаць у выбарах Народнага Сходу Заходняй Беларусі. Аднак насельніцтву Вільні і Віленшчыны ўдзельнічаць у іх не давялося. Справа ў тым, што **3 кастрычніка 1939 г. у Маскве пачаліся перагаворы паміж урадамі СССР і Ковенскай Літвы (сталіцай Літвы ў той час быў г. Коўна (зараз Каунас) адносна лёсу Віленшчыны**. **10 кастрычніка 1939 г. у палітычных мэтах, для схілення літоўскага кіраўніцтва на савецкі бок быў падпісаны дагавор аб далучэнні Вільні і Віленшчыны да Літвы.** Дагавор прадугледжваў пропуск савецкіх войск праз літоўскую тэрыторыю, узбраенне літоўскага войска. Літве было паабяцана не перашкаджаць у яе самастойнай унутранай і знешняй палітыцы. На тэрыторыі Літвы размяшчаўся кантынгент савецкіх войск колькасцю 20 тыс. чал.

**У лістападзе 1940 г. адбыліся новыя тэрытарыяльныя змены не на карысць Беларусі.** Згодна з указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 лістапада 1940 г. Савецкай Літве перадаваліся Свянцянскі раён і часткі тэрыторый Відзаўскага, Гадуцішкаўскага, Астравецкага, Воранаўскага і Радунскага раёнаў Беларускай ССР, а таксама курорт Друскенікі (зараз Друскенінкай), якія спрадвеку знаходзіўся ў Гродзенскай губерні. Гэтая тэрыторыя складала 2600 км$^2$ з насельніцтвам 65 тыс. чал.[1]

[1] У сувязі з заявай кіраўніцтва Літоўскай ССР аб выхадзе з СССР Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР 29 сакавіка 1990 г. заявіў Вярхоўнаму Савету Літоўскай ССР аб тым, што ў гэтым выпадку губляюць сваю моц заканадаўчыя акты адносна перадачы беларускіх тэрыторый Літоўскай ССР, тым больш што яны заключаліся без згоды Беларускай ССР. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР заявіў, што ён «будзе вымушаны настойваць на вяртанні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы беларускіх зямель». Гэтая заява засталася толькі на паперы. Кіраўніцтва нашай дзяржавы заявіла аб тым, што ў Рэспубліцы Беларусь няма тэрытарыяльных прэтэнзій да сваіх суседзяў.

Библиотека БГУИР

Гісторыкі выказваюць розныя меркаванні адносна тэрытарыяльных змен на карысць Літвы, праведзеных у 1939 – 1940 гг. Аднак многія з іх аднадушны ў тым, што гэтыя змены праводзіліся ў палітычных мэтах, без згоды Беларускай ССР, без уліку нацыянальнага складу насельніцтва.

Сапраўды, савецкае кіраўніцтва добра разумела, што Літва, Латвія і Эстонія, якія ўваходзілі ў сферу інтарэсаў СССР, у хуткім часе стануць савецкімі (так і здарылася летам 1940 г.). Таму для Масквы не мела прынцыповага значэння, каму будзе належаць Вільня, Віленскі край і некаторыя іншыя тэрыторыі, якія раней уваходзілі ў склад БССР. Галоўнае ў тым, што БССР, Літва, Латвія і Эстонія з'яўляюцца савецкімі і што ўсе яны ўваходзяць у склад СССР. Тут браўся пад увагу інтарэс не нацыянальны, а класава-палітычны, інтэрнацыяналісцкі.

Што тычыцца нацыянальнага складу насельніцтва, то гэта вельмі складанае і спрэчнае пытанне. Вядома, што ў 1939 г. у Вільні і Віленскім краі ні беларусы, ні літоўцы не складалі большасці насельніцтва. Наадварот, яны з'яўляліся нацыянальнымі меншасцямі. Большасць насельніцтва краю складалі палякі, яўрэі і рускія. Сцвярджэнне некаторых гісторыкаў аб тым, што ў Вільні ў 1939 г. большасць насельніцтва складалі беларусы, – памылковае. Па розных крыніцах, беларусы складалі ад 1,7 % да 5 % насельніцтва Вільні. Прыкладна столькі ж было і літоўцаў у агульным складзе насельніцтва Вільні. Вось і паспрабуй вырашыць тэрытарыяльнае пытанне Беларусі і Літвы, улічваючы нацыянальны склад насельніцтва!

Імкнучыся забяспечыць бяспеку паўночна-заходняй граніцы, Савецкі Саюз дамагаўся ад Эстоніі, Латвіі і Літвы згоды на размяшчэнне на іх тэрыторыі сваіх ваенных баз і воінскіх кантынгентаў. Пачаліся інтэнсіўныя перамовы, якія закончыліся

падпісаннем дагавораў. **Пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй быў падпісаны 28 верасня 1939 г., 5 кастрычніка – аналагічны пакт з Латвіяй, а 10 кастрычніка – з Літвой.** Савецкі Саюз атрымаў права размясціць на тэрыторыі гэтых краін свае ваенныя базы і воінскія гарнізоны (у Эстоніі і Латвіі – па 25 тыс. ваеннаслужачых, у Літве – 20 тыс. салдат і афіцэраў).

У сувязі з пашырэннем нямецкага ўплыву ў Еўропе з’явілася небяспека блакіравання пэўных кругоў краін Балтыі з Германіяй. У мэтах умацавання сваіх абарончых рубяжоў у гэтым рэгіёне 14 чэрвеня 1940 г. урад СССР накіраваў ураду Літвы, а 16 чэрвеня – Латвіі і Эстоніі ноты, у якіх абвінаваціў іх у парушэнні дагавораў аб узаемадапамозе. Пры гэтым абвінавачванні зводзіліся да аднаўлення імі «Балтыйскай Антанты» (саюза трох дзяржаў), хаця яна была сфарміравана яшчэ ў пачатку 1930-х гг. Акрамя таго, Літва абвінавачвалася ў «выкраданні» чатырох савецкіх ваеннаслужачых. Усім тром урадам было прад’яўлена патрабаванне даць згоду на размяшчэнне ў важнейшых цэнтрах дадатковых савецкіх вайсковых часцей, замяніць урады (некаторых іх членаў аддаць пад суд) і ўтварыць «дружалюбныя» СССР урады. Тром краінам нічога не заставалася, як падпарадкавацца.

Савецкія патрабаванні мелі ультыматыўны характар. Для іх рэалізацыі былі накіраваны ў Літву – В. Дзеканозаў (намеснік Л. Берыі), у Латвію – А. Вышынскі, у Эстонію – А. Жданаў. Былі праведзены выбары ў Народныя Сеймы Літвы і Латвіі і Дзяржаўную Думу Эстоніі, якія ў ліпені 1940 г. прынялі дэкларацыі аб абвяшчэнні ў сваіх краінах савецкай улады, уступленні ў склад СССР, прызнанні зямлі ўласнасцю дзяржавы і аб нацыяналізацыі асноўных сродкаў вытворчасці. У жніўні 1940 г. Літва, Латвія і Эстонія былі прыняты ў склад СССР у якасці рэспублік. Перад самай вайной пачалося высяленне былых памешчыкаў, крупных прадпрымальнікаў і іншых



Библиотека БГУИР

«классово чуждых элементов» з сем'ямі ў малаабжытыя раёны СССР. Усяго ў чэрвені – ліпені 1941 г. з Прыбалтыкі было выселена 26 тыс. чал.

Сёння вельмі папулярнае ў некаторых палітычных дзеячаў прыбалтыйскіх рэспублік слова «акупацыя», якое не адпавядае фактам мінулага. **Па-першае**, Чырвоная Армія імкнулася захоўваць нейтралітэт у адносінах да ўнутраных спраў Прыбалтыйскіх краін. **Па-другое**, што вельмі важна, савецкай акупацыйнай адміністрацыі на гэтых тэрыторыях не было. Народ ствараў свае органы самакіравання ў паветах і гарадах. **Па-трэцяе**, уваходжанне прыбалтыйскіх рэспублік у склад СССР адбылося ў 1940 г. паводле рашэння нацыянальных устаноўчых органаў, створаных на аснове праведзеных выбараў. Гэты акт быў прызнаны вялікімі дзяржавамі законным у 1945 г. на Патсдамскай канферэнцыі, а таксама і 35 краінамі ў 1975 г. на Хельсінкскай канферэнцыі.

Прысутнасць Чырвонай Арміі прыдавала прыхільнікам сацыялістычнай ідэі смеласці і рашучасці. Напрыклад, у Рызе, насельніцтва якой налічвала каля 350 тыс. чал., у антыўрадавых дэманстрацыях і мітынгах удзельнічала больш за 100 тыс. чал. У выбарах у Сейм у ліпені 1940 г. прыняло ўдзел 94,8 % выбаршчыкаў. За кандыдатаў блоку працоўнага народа прагаласавала 97,8 %, супраць – толькі 2,2 %. Дэпутатамі Сейма сталі 52 камуністы і 48 беспартыйных.

**У канцы чэрвеня 1940 г. савецкія войскі пасля прад'яўлення адпаведных патрабаванняў да Румыніі ўвайшлі ў Бесарабію і Паўночную Букавіну** (цяпер – Чарнавіцкая вобласць Украіны), населеную пераважна украінцамі (Бесарабія і Букавіна былі захоплены Румыніяй у маладой Савецкай рэспубліцы ў гады грамадзянскай вайны). Утварэнне Малдаўскай ССР адбылося ў жніўні 1940 г. у выніку вяртання СССР Бесарабіі і Паўночнай

Библиотека БГУИР

Букавіны і ўз’яднання іх з Малдаўскай аўтаномнай рэспублікай, якая ў гэты час ўваходзіла ў склад Украінскай ССР.

Ва ўмовах абвастрэння ваенна-палітычных абставін у Еўропе неадкладнай задачай для СССР стала забеспячэнне бяспекі паўночна-заходніх подступаў да Ленінграда – буйнейшага прамысловага цэнтра краіны. Мяжа СССР з Фінляндыяй праходзіла па Карэльскім перашыйку ўсяго ў 32 км ад Ленінграда. Па так званай «лініі Манергейма» працягласцю 135 км і глыбінёй да 90 км фінскі бок пры падтрымцы краін Захаду актыўна ажыццяўляў будаўніцтва ваенных умацаванняў, што выклікала занепакоенасць савецкага кіраўніцтва.

**12 кастрычніка 1939 г. СССР прапанаваў Фінляндыі заключыць пакт аб узаемадапамозе.** Але ўрад Фінляндыі адмовіўся гэта зрабіць на той падставе, што гэта супярэчыла б нейтралітэту краіны. Тады з мэтай узмацнення бяспекі Ленінграда савецкі бок прапанаваў аддаць яму Карэльскі перашыек і шэраг астравоў у Фінскім заліве – усяго 2 761 км$^2$ тэрыторыі, а таксама здаць у арэнду СССР тэрмінам на 30 гадоў порт Ханко на паўночным узбярэжжы Фінскага заліва для стварэння там савецкай ваенна-марской базы. Узамен СССР выказаў гатоўнасць саступіць Фінляндыі частку тэрыторыі тагачаснай Карэла-Фінскай ССР плошчай 5 529 км$^2$.

**Савецка-фінляндскія перамовы па гэтых пытаннях праходзілі ў Маскве з перапынкамі з 12 кастрычніка па 13 лістапада 1939 г.** Савецкі бок на чале з В.М. Молатавым фармуляваў свае патрабаванні ў рэзка ультыматыўнай форме. Фінская дэлегацыя ў рэшце рэшт згадзілася аддаць СССР некаторыя астравы ў Фінскім заліве і частку Карэльскага перашыйка, але рашуча адмовілася аддаць г. Выбарг і порт Ханка, аднак В.М. Молатаў не жадаў ісці ні на якія кампрамісы. Савецкае кіраўніцтва вымушана было ўзяць курс на рашэнне праблемы ваенным шляхам.



Библиотека БГУИР

26 лістапада 1939 г. на савецка-фінскай мяжы адбыўся ўзброены інцыдэнт: па савецкай версіі, фінская артылерыя абстраляла савецкія войскі ў раёне мястэчка Майніла; па фінскай версіі, яны былі абстраляны савецкай артылерыяй. **29 лістапада 1939 г. СССР разарваў дыпламатычныя адносіны з Фінляндыяй, а 30 лістапада пачаў ваенныя дзеянні.**

Некаторае ўяўленне аб колькасным і якасным стане армій у час ваеннага канфлікту паміж СССР і Фінляндыяй перадае наступная табліца.

***Суадносіны войск Фінляндыі і СССР***

| | **Фінская армія** | **Чырвоная Армія** | **Суадносіны** |
|---|---|---|---|
| Дывізіі | 14 | 24 | 1:1,7 |
| Асабовы склад | 265 000 | 425 640 | 1:1,6 |
| Гарматы і мінамёты | 534 | 2876 | 1:5,4 |
| Танкі | 26 | 2289 | 1:88 |
| Самалёты | 270 | 2446 | 1:9,1 |

Савецкае кіраўніцтва памылкова лічыла, што Чырвоная Армія сіламі войск Ленінградскай ваеннай акругі пераможа фінаў за некалькі дзён. 1 снежня 1939 г. у г. Тэрыёкі (на фінскім баку граніцы) быў утвораны «Народны ўрад Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі» на чале з сакратаром Выканкома Камінтэрна О.В. Куусіненам. З гэтым урадам урад СССР падпісаў 2 снежня дагавор аб узаемадапамозе і дружбе. Урад О.В. Куусінена прыняў усе савецкія патрабаванні.

Пачатак савецка-фінляндскай вайны прыцягнуў увагу вялікіх дзяржаў да поўначы Еўропы. У сродках масавай інфармацыі была разгорнута буйнамаштабная антысавецкая кампанія, у якой актыўна эксплуатавалася ідэя небяспекі «сусветнай камуністычнай рэвалюцыі». Ужо 2 снежня 1939 г. ЗША ўвялі «маральнае эмбарга»

Бібліятэка БГУІР

на пастаўкі ў СССР авіяцыйнай тэхнікі і тэхналогій. Па ініцыятыве англійскай дыпламатыі ў Лізе Нацый было ўзнята пытанне правамернасці дзеянняў Савецкага Саюза, і 14 снежня 1939 г. СССР быў выключаны з яе складу. Антысавецкая кампанія яшчэ больш ўзмацнілася, а англійскі ваенны кабінет нават разгледзеў 7 лютага 1940 г. мерапрыемствы па ажыццяўленні інтэрвенцыі супраць Савецкага Саюза. Аднак дапамога заходніх дзяржаў Фінляндыі абмежавалася пастаўкамі ўзбраенняў, а таксама прадастаўленнем значных крэдытаў.

Ваенныя дзеянні войск Чырвонай Арміі не прыносілі станоўчых вынікаў. Толькі 11 лютага 1940 г. савецкія войскі з вялікімі стратамі ажыццявілі паспяховае наступленне ў Фінляндыі. Была прарвана абарончая «лінія Маннергейма». **У сакавіку ў Маскве пачаліся савецка-фінляндскія перамовы, якія скончыліся падпісаннем 12 сакавіка 1940 г. мірнага дагавору**. У адпаведнасці з ім Фінляндыя пагадзілася адсунуць сваю граніцу з СССР на Карэльскім перашыйку, паўночна-заходней Ладажскага возера і ў раёне Куалаярві: Карэльскі перашыек, шэраг астравоў у Фінскім заліве, невялікая тэрыторыя з горадам Куалаярві, частка паўвастравоў Рыбачы і Сярэдні адыйшлі да СССР. Паўвостраў Ханка перадаваўся у арэнду Савецкаму Саюзу тэрмінам на 30 гадоў.

Нягледзячы на перамогу, вайна з Фінляндыяй, як адзначаў новы нарком абароны СССР С. Цімашэнка на нарадзе кіруючага складу Чырвонай Арміі ў канцы 1940 г., *«выявила всю пагубность нашей системы боевой подготовки – проводить занятия на условности, кабинетным методом. Наши командиры и штабы, не имея практического опыта, не умели по-настоящему организовать усилия родов войск и тесного взаимодействия, а главное – не умели по-настоящему командовать»*. Вялікія страты савецкіх войск, тактычная непаваротлівасць і слабасць камандавання падарвалі ў



Библиотека БГУИР

сусветнай грамадскасці думку аб баяздольнасці Чырвонай Арміі, што потым не ў малой ступені адбілася і на рашэнні Гітлера пачаць летам 1941 г. вайну з СССР.

Такім чынам, дзякуючы намаганням кіруючых колаў СССР у 1939 – 1940 гг. адбылося значнае ўзмацненне краіны. Больш чым на 20 млн чал. павялічылася колькасць насельніцтва Савецкага Саюза, на 400 тыс. км$^2$. пашырылася яго тэрыторыя. У складзе Савецкага Саюза заходнія вобласці Украіны і Беларусі ўключыліся ў агульнасаюзны працэс сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Аднак савецка-фінская вайна прывяла да таго, што Фінляндыя стала вернай саюзніцай Германіі і ў чэрвені 1941 г. уступіла ў вайну з СССР на баку рэйха.

**3. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. Падрыхтоўка Германіі да вайны з СССР. Прыняцце плана «Барбароса».** Пасля разгрому польскай арміі баявыя дзеянні паміж Германіяй, Англіяй і Францыяй былі прыпынены да вясны 1940 г. Гэты перыяд у гісторыі атрымаў назву **«дзіўнай вайны»**, калі ваенныя дзеянні англа-французскіх і нямецкіх войск абмяжоўваліся нязначнымі аперацыямі на моры. На Заходнім фронце гаспадарыла цішыня, толькі дзе-нідзе завязваліся выпадковыя перастрэлкі. Дзеянні авіяцыі не выходзілі за рамкі разведвальных палётаў.

Гітлераўскае кіраўніцтва выкарыстала перыяд «дзіўнай вайны» у першую чаргу для прывядзення ў гатоўнасць узброеных сіл, выпуску неабходнай колькасці баявой тэхнікі і боепрыпасаў, а таксама для пераадолення шэрагу «вузкіх месцаў» у ваеннай падрыхтоўцы войск, якія выявіліся ў ходзе баявых дзеянняў у Польшчы.

Германскія спецслужбы і дыпламатыя разгарнулі ў заходніх краінах інфармацыйна-прапагандысцкую кампанію, якая ўсяляк дэманстравала міралюбівыя намеры нацыстаў. Работа вялася сярод

Библиотека БГУИР

інтэлігенцыі, вучоных, служыцеляў культа, ветэранаў Першай сусветнай вайны. У перадваенныя гады Трэці рэйх выдаткаваў звыш 250 млн марак на прапаганду і шпіянаж за мяжой. З дапамогай розных форм і метадаў «псіхалагічнай вайны» была дэзарыентавана грамадская думка ў многіх краінах Захаду, актывізавалася дзейнасць «пятай калоны».

У апошні час апублікавана шмат матэрыялаў, якія сведчаць аб тым, што заходнія краіны актыўна ажыццяўлялі сакрэтныя перамовы з нацысцкім кіраўніцтвам, каб накіраваць германскую ваенную машыну супраць Савецкага Саюза. З верасня 1939 па красавік 1940 гг. адбылося не менш як 160 тайных сустрэч паміж прадстаўнікамі Германіі, Англіі і Францыі. Нават больш таго, восенню 1939 г. ваенна-палітычныя колы Англіі і Францыі пачалі ўважліва вывучаць магчымасць нападу на СССР з поўначы і з поўдня. Да ўдзелу ў рэалізацыі гэтых планаў ўсяляк падштурхоўваліся Нарвегія, Швецыя, Фінляндыя, Турцыя і Іран.

Варожасць кіраўніцтва заходніх краін да Савецкай дзяржавы ўзрастала і дасягнула сваёй кульмінацыі пасля пачатку савецка-фінляндскай вайны. Як ужо адзначалася, антысавецкая кампанія ў той час значна ўзмацнілася, а англійскі ваенны кабінет разгледзеў 7 лютага 1940 г. мерапрыемствы па ажыццяўленні інтэрвенцыі супраць Савецкага Саюза са Скандынаўскага паўвострава. У гэтай аперацыі планавалася задзейнічаць тры англійскія дывізіі. Толькі заключэнне мірнага пагаднення паміж СССР і Фінляндыяй не дазволіла ажыццявіць агрэсію.

Пазбавіўшыся магчымасці распачаць ваенныя дзеянні на Поўначы, мілітарысцкія колы Францыі і Англіі актывізавалі дзейнасць на Поўдні. Планавалася нанесці паветраныя бомбавыя ўдары па нафтавых промыслах Закаўказзя. Аднак і гэтыя планы не



Библиотека БГУИР

ажыццявіліся, паколькі **вясной 1940 г. германская армія распачала буйнамаштабнае наступленне на Захадзе**.

Для вядзення баявых дзеянняў Германія сканцэнтравала на Заходнім фронце каля 3 млн салдат і афіцэраў (136 дывізій, якія мелі 7 378 гармат, 2 445 танкаў і 3 643 самалётаў). Агульная колькасць войск саюзнікаў дасягала каля 4 млн чал. (148 дывізій, якія мелі 13 874 гармат і 3 373 танкаў, 2 833 самалёты).

**Перад уварваннем у Францыю нацысцкая Германія акупіравала Данію і Нарвегію.** Ваенныя падзеі развіваліся маланкава. На працягу дня 9 красавіка 1940 г. была захоплена Данія. Для правядзення гэтай аперацыі аказалася дастаткова адной германскай дывізіі. Акупацыя Нарвегіі патрабавала значна большых сіл і часу. Але і ўзброеныя сілы Нарвегіі (каля 16 тыс.) не маглі процістаяць 100-тысячнай германскай групоўцы.

Пасля акупацыі Даніі і Нарвегіі ваенныя намаганні Германіі перанесліся ў цэнтр Еўропы. Вермахт абрушыў сваю моц на Бельгію, Галандыю і Францыю. **10 мая 1940 г. па ўмоўным сігнале «Данцыг» нямецкія войскі ўварваліся ў Бельгію.** Ужо 28 мая нямецкі генерал Рэйхенаў і бельгійскі генерал Дэуссо падпісалі пратакол капітуляцыі бельгійскай арміі, каля 500 тыс. салдат і афіцэраў бельгійскай арміі склалі зброю. **У кароткі тэрмін былі акупіраваны Галандыя і Люксембург.** Паспяховаму ажыццяўленню баявых аперацый германскіх войск садзейнічала актыўная дзейнасць германскіх спецслужб і падтрымка **«пятай калоны»**. У Галандыі, Грэцыі, Бельгіі, Даніі, Люксембургу, Францыі, Югаславіі іх дзейнасць была даволі актыўнай і рознабаковай, мела на мэце падарваць не толькі ваенна-эканамічны патэнцыял кожнай з краін, але і маральны дух войск і насельніцтва.

Нягледзячы на тое, што поспех быў дасягнуты лёгка, камандаванне вермахта чакала, што саюзнікі выкарыстаюць



Библиотека БГУИР

стратэгічныя рэзервы і нанясуць контрудар, каб ліквідаваць прарыў. Аднак гэтага не адбылося. 18 мая 1940 г. немцы пачалі наступленне і праз дзень захапілі Амьен і перадавымі атрадамі выйшлі да ўзбярэжжа ў раёне Дзюнкерка. 40 англійскіх, французскіх і бельгійскіх дывізій былі адсечаны ад галоўных сіл. Германскае камандаванне палічыла, што лёс гэтай групоўкі вырашаны і 24 мая Гітлер аддаў загад прыпыніць наступленне танкавых злучэнняў (так званы стоп-загад). Штучна створаная паўза дапамагла ў далейшыя дні вырвацца саюзнікам з жалезных германскіх клешняў і эвакуіравацца морам з Францыі.

Сёння маюцца розныя думкі наконт таго, чаму з'явіўся такі загад? Чаму немцы дазволілі групоўцы ў 338 226 чал. у перыяд з 27 мая па 4 чэрвеня 1940 г. пераправіцца праз Ла-Манш? Ёсць пункт гледжання, што «дзюнкеркскае дзіва» – гэта вынік перш за ўсё палітычных прычын, звязаных з імкненнем Гітлера выпусціць англійскія войскі, каб дасягнуць заключэння міру з Англіяй і яе нейтралітэту ў перыяд будучай вайны з СССР.

5 чэрвеня 1940 г. германскае камандаванне ўвяло ў дзеянне план «Рот» – план наступлення ў цэнтральныя раёны Францыі. Сілы былі вельмі няроўнымі, адчувалася маральная і фізічная стомленасць французскіх войск. Францыя страціла каля 90 тыс. чал. забітымі. Ужо 14 чэрвеня германская армія фактычна без бою ўвайшла ў Парыж.

**22 чэрвеня 1940 г. у Камп'ен прыбыў Гітлер** ў суправаджэнні Герынга, Кейтэля, Радэра, Браўхіча, Рыбентропа і Гесса. Падпісанне перамір'я адбывалася непадалёку ад таго месца, дзе знаходзілася мемарыяльная пліта, на якой значылася: «*Здесь 11 ноября 1918 года была побеждена преступная гордость германской империи, поверженной свободными людьми, которых она пыталась поработить»*. Гітлер з яўнай знявагай прайшоў па пліце і ўвайшоў у вагон, у якім 22 гады таму адбывалася прыняцце капітуляцыі



Библиотека БГУИР

Германіі. Праз некаторы час для падпісання перамір'я ўвялі французскую дэлегацыю на чале з Петэнам. Умовы перамір'я былі больш суровымі, чым навязаныя Германіі ў 1918 г. Уся паўночная Францыя з Парыжам стала зонай нямецкай акупацыі; Італія акупіравала частку паўднёва-усходняй Францыі; французская армія скарачалася да 100 тысяч. Францыі было дазволена захаваць калоніі, але аплачваць утрыманне на сваёй тэрыторыі германскіх войск. Ваеннапалонныя заставаліся ў германскіх руках, гэта азначала, што 5 % мужчынскага насельніцтва Францыі выкарыстоўваліся на прымусовых работах на карысць Германіі.

Па ўмовах Кампьенскага перамір'я паўднёвая частка Францыі засталася пад уладай урада Петэна (т. зв. урад Вішы), які стаў на шлях супрацоўніцтва з захопнікамі. Такія ўзаемаадносіны атрымалі назву *калабарацыянізм – сістэма адносін, якая патрабуе добраахвотнага супрацоўніцтва з акупантамі ў ваеннай, палітычнай, эканамічнай і гуманітарнай галінах на карысць агрэсара.*

Нягледзячы на тое што ў ваеннай кампаніі супраць Францыі вермахт страціў 27 тыс. забітымі, 18,4 тыс. прапаўшымі без вестак, 111 тыс. параненымі, 18 ліпеня 1940 г. ў Берліне адбыўся ваенны парад у гонар перамогі над Францыяй. Найбольш вызначыўшымся 12 генералам вермахта Гітлер прысвоіў чын фельдмаршала, а бліжэйшаму паплечніку па партыі Герынгу – унікальны чын рэйхсмаршала. Прадпрынятая акцыя была разлічана на міжнародную дэманстрацыю магутнасці Германіі, палітычнае ўздзеянне на саюзнікаў і падтрымку палітыкі Гітлера з боку ваенных.

Францыя вымушана была заключыць перамір'е і з Італіяй, якая ўступіла ў вайну супраць яе 10 чэрвеня 1940 г., калі лёс Францыі быў амаль што вырашаны. Германскае і італьянскае камандаванне падзялілі тэатр ваенных дзеянняў. Італія, якая вяла «паралельную вайну», дзейнічала ў раёне паўднёвых Альпаў. Італьянскія войскі

Библиотека БГУИР

захапілі Брытанскія Самалі, частку Кеніі, Судан, а ў верасні пранiклi праз Лівію ў Егіпет, аднак тут былі спынены і разбіты англічанамі.

**Пасля капітуляцыі Францыі Англія засталася адна супраць Германіі.** 31 ліпеня 1940 г. Гітлер аддаў распараджэнне ваеннаму камандаванню рыхтаваць высадку на Брытанскія астравы (аперацыя **«Марскі леў»**). **13 жніўня 1940 г**. пачалася **«бітва за Англію»** – масіраваныя бамбардзіровачныя налёты германскай авіяцыі. Англія паспяхова выстаяла. Страты Германіі ў самалётах былі настолькі вялікімі (1 733 самалёты), што 17 верасня 1940 г. Гітлер прыняў рашэнне адкласці аперацыю «Марскі леў» на нявызначаны час.

Англія з кабінетам У. Чэрчыля ў канцы 1940 г. не ўяўляла сур'ёзнай палітычнай сілы, паколькі была выгнана немцамі з Еўрапейскага кантынента, пакінуўшы значную частку сваіх ўзбраенняў і вайсковага рыштунку. Францыя, адзіны яе саюзнік, капітулявала, і перад брытанцамі паўстала праблема фінансавай запазычанасці па аплаце ваеннай прадукцыі, якая пастаўлялася ім ЗША. Таму І. Сталін, нягледзячы на жаданне У. Чэрчыля наладзіць асабістыя кантакты з Масквой, адносіўся да яго з недаверам і не без падстаў лічыў, што У. Чэрчыль робіць спробу ўцягнуць СССР у вайну супраць Германіі.

Да аказання дапамогі англічанам усё больш схіляўся ўрад ЗША, які вясной 1941 г. высадзіў ваенныя падраздзяленні ў Грэнландыі і Ісландыі, стварыўшы там свае базы. Актывізавалася барацьба супраць германскіх агрэсараў на марскіх прасторах.

Пасля прыпынення Германіяй аперацыі «Марскі леў» наблізілася чарга Савецкага Саюза. «*Расія павінна быць ліквідавана, – заявіў Гітлер у гутарцы з ваеннымі кіраўнікамі. – Тэрмін – вясна 41 года… Расія будзе знішчана шляхам раптоўнага нападзення прыкладна 120 дывізіямі ў накірунку Кіева, Масквы, а затым Баку*». **18 снежня 1940 г.** Гітлер зацвердзіў план нападзення на Савецкі Саюз, вядомы

пад назвай **план «Барбароса»**. У снежні 1940 г. Германія пачала непасрэдную падрыхтоўку да вайны з СССР. У маі 1941 г. быў прыняты яшчэ адзін план **«Ост»** – разгорнутая праграма знішчэння і каланізацыі народаў Савецкага Саюза. Барацьба за сусветнае панаванне ўступала ў новую стадыю.

**Рыхтуючы агрэсію супраць Савецкага Саюза, нацысцкая Германія імкнулася замацаваць сувязі з саюзнікамі, уцягнуць у агрэсіўны блок новыя краіны. Асаблівая ўвага надавалася ўмацаванню адносін з Балгарыяй, Румыніяй, Венгрыяй і Фінляндыяй**, якія павінны былі стаць важнымі плацдармамі агрэсіі супраць Савецкай краіны. Так, Венгрыі за яе згоду ўдзельнічаць у барацьбе супраць СССР былі абяцаны землі ў Югаславіі і Савецкім Саюзе. Румынскаму дыктатару Антанеску былі абяцаны тэрыторыі Малдавіі і паўднёвыя раёны Украіны, за што румынскі ўрад дазволіў ўвесці на сваю тэрыторыю германскія войскі і даў згоду на сумеснае нападзенне на СССР.

**Восенню 1940 г. пачаліся перамовы паміж Фінляндыяй і Германіяй**, на якіх была дасягнута дамоўленасць аб сумеснай агрэсіі супраць СССР. Фінляндыі былі абяцаны тэрыторыі Карэліі (акрамя Кольскага паўвострава), а таксама Ленінградскай вобласці. 1 сакавіка 1941 г. аб далучэнні да Траістага пакта заявіў царскі ўрад Балгарыі. У гэты ж дзень у краіну былі ўведзены нямецкія войскі. Балгарскі народ, які заўжды з пачуццём глыбокай сімпатыі адносіўся да рускага народа, свайго славянскага брата, з абурэннем сустрэў вестку аб здрадзе ўрада. У гарадах з'явіліся шматлікія лозунгі: «Далоў немцаў з Балгарыі!», «Далоў фашысцкую Германію!» і г.д.

Германская дыпламатыя рабіла захады для ўцягвання ў агрэсіўны саюз і Югаславіі. 25 сакавіка 1941 г. урад Цветкавіча падпісаў пратакол аб далучэнні Югаславіі да Траістага пакта. Гэты антынацыянальны акт выклікаў востры палітычны крызіс у краіне.

Библиотека БГУИР

У ноч на 27 сакавіка 1941 г. адбыўся дзяржаўны пераварот. Урад Цветкавіча паў. Новае кіраўніцтва генерала Сімавіча накіравала ў Маскву дэлегацыю для перамоў. 5 красавіка 1941 г. быў заключаны дагавор аб сяброўстве і ненападзенні паміж СССР і каралеўствам Югаславіі. Падпісаўшы дагавор, Савецкі Саюз імкнуўся прадухіліць распаўсюджванне фашысцкай агрэсіі на Балканскі паўвостраў. Неабходна было захаваць незалежнасць Югаславіі і Грэцыі і памяшаць выкарыстаць балканскі плацдарм для вайны супраць Савецкага Саюза.

**У адказ на мірнае пагадненне Югаславіі з СССР германскія войскі 6 красавіка 1941 г. пры падтрымцы італьянскіх і венгерскіх дывізій уварваліся ў Югаславію.** Важнейшыя гарады краіны, у тым ліку і яе сталіца Белград, падверглiся масіраваным ударам авіяцыі. Гітлер спяшаўся стварыць неабходны плацдарм, не чакаючы заканчэння баёў. Ужо 12 красавіка ён падзяліў Югаславію паміж Германіяй, Італіяй, Венгрыяй і Балгарыяй, хоць акт аб капітуляцыі Югаславіі быў падпісаны ў Сараеве толькі 18 красавіка 1941 г.

**Адначасова з агрэсіяй супраць Югаславіі нямецкія і італьянскія войскі разгарнулі ваенныя дзеянні супраць Грэцыі.** Нават нягледзячы на значнае пераўзыходжанне сіл і выкарыстанне вялікай колькасці танкаў і артылерыі, нямецка-фашысцкія войскі на працягу некалькіх дзён не маглі прасунуцца праз грэка-балгарскую мяжу, а італьянскія – у раёне Фларыны (з боку Албаніі). Падтрымку Грэцыі аказаў англійскі экспедыцыйны корпус, які налічваў 50 тыс. чал. Тым не менш суадносіны сіл складваліся на карысць Германіі. У выніку здрады камандуючага грэчаскай арміі, 23 красавіка 1941 г. яна здалася немцам і італьянцам. Германскія войскі хутка акупіравалі краіну і шматлікія астравы ў Эгейскім моры.

У канцы мая вермахт авалодаў востравам Крыт, які павінен быў стаць плацдармам для нападу на краіны Блізкага Усходу і захопу



Бібліятэка БГУИР

Суэцкага канала. Фактычна ўся паўднёва-усходняя Еўропа апынулася пад пятой акупантаў. Югаславія, Грэцыя, падзеленыя паміж Германіяй і Італіяй, страцілі сваю нацыянальную незалежнасць. Харватыя была абвешчана «незалежнай» дзяржавай. З захопам краін Балканскага паўвострава агрэсіўны блок значна ўмацаваў свае пазіцыі.

Дзякуючы намаганням Савецкага Саюза ад гітлераўскай акупацыі была выратавана Швецыя. У сувязі з акупацыяй Балканскіх краін была створана рэальная пагроза для бяспекі Турцыі. У пачатку сакавіка 1941 г. савецкі ўрад заявіў, што калі Турцыя будзе падвергнута нападзенню, Савецкі Саюз будзе прытрымлівацца заключанага паміж абедзвюма краінамі пакта аб нейтралітэце.

З першых дзён акупацыі ў большасці еўрапейскіх краін разгарнулася шырокая па размаху і формах барацьба супраць германскага акупацыйнага рэжыму, якая атрымала назву **«рух Супраціўлення»**. У ім ўдзельнічалі людзі розных сацыяльных слаёў і груп, палітычных і рэлігійных поглядаў: інтэлігенцыя і буржуазія, рабочыя і сяляне, камуністы і сацыялісты, лібералы і кансерватары, а таксама беспартыйныя, хрысціяне і мусульмане. Іх аб'ядноўвала агульная мэта – супрацьстаяць германскаму акупацыйнаму рэжыму і аднавіць нацыянальна-дзяржаўную незалежнасць сваіх краін.

**4. Дзейнасць савецкага кіраўніцтва па падрыхтоўцы краіны да абароны: дасягненні і пралікі. Заходняя Асобая ваенная акруга.** У выніку індустрыялізацыі і калектывізацыі ў Савецкім Саюзе была пабудавана моцная цэнтралізаваная прамысловасць і калектывізаваная сельская гаспадарка. У перадваенныя гады было ўведзена ў эксплуатацыю звыш 9 тыс. новых заводаў, фабрык, шахт, большая іх частка будавалася на Усходзе краіны. Асноўнымі месцамі іх размяшчэння былі Паволжа, Урал, Сібір, Казахстан, тыя раёны,

Библиотека БГУИР

якія знаходзіліся далёка ад заходняй мяжы і былі недасягальнымі для варожай авіяцыі, што ў значнай ступені садзейнічала ўмацаванню абароны дзяржавы.

Новыя прадпрыемствы будаваліся з разлікам іх магчымага пераводу на вытворчасць баявой тэхнікі і зброі. Былі пабудаваны такія гіганты, як Магнітагорскі, Кузнецкі і Нова-Тагільскі металургічныя камбінаты, ажыццёўлена тэхнічная рэканструкцыя вугальнай базы на Украіне, распрацаваны новыя вугальныя басейны у Сібіры і на Урале, асвоены Волга-Уральскі нафтавы раён. Да 1940 г. СССР меў усе неабходныя прамысловыя вытворчасці для паспяховага развіцця ваенна-эканамічнага патэнцыялу.

Хуткімі тэмпамі будаваліся прадпрыемствы каляровай металургіі. Былі ўведзены ў эксплуатацыю нікелевыя камбінаты на Кольскім паўвостраве, Паўднёвым Урале і ў Запаляр’і, алюмініевы завод на Урале, свінцовыя заводы ў Казахстане. Завяршылася будаўніцтва буйнейшых Сярэдне-Уральскага, Орскага і Балхашскага медзеплавільных камбінатаў. Рост выпуска каляровых металаў у перадваенныя гады дазволіў значна скараціць, а па некаторых матэрыялах поўнасцю адмовіцца ад іх увозу з-за мяжы.

У перадваенны час дзяржава зрабіла гіганцкі крок наперад у развіцці прамысловасці, перагнаўшы Англію і Францыю. З 1928 па 1940 г. уключна нацыянальны даход СССР вырас больш чым у пяць разоў, вытворчасць электраэнергіі ўзрасла ў 9,7, здабыча вугалю – у 4,7, выплаўка сталі павялічылася больш чым у 4, нафты – у 2,7, вытворчасць машынабудавання – у 20 разоў.

Пагроза вайны патрабавала выдзяляць значныя сродкі на абарону. Так, калі ў 1938 г. на патрэбы абароны было выдаткавана 23 млрд рублёў, то ў 1940 г. – амаль 57 млрд, што складала 32,6 % дзяржаўнага бюджэту.



Библиотека БГУИР

Разам з тым у прамысловым развіцці меліся і негатыўныя тэндэнцыі. Так, чорная металургія, якая складала аснову ваеннага машынабудавання, напярэдадні вайны значна адставала і не задавальняла народнагаспадарчых і абарончых патрэб краіны. Выпуск сродкаў вытворчасці за 1938 – 1940 гг. вырас на 53 %, а прадукцыі машынабудавання – на 76 %, у той час калі выплаўка сталі і чыгуну за гэты час узрасла толькі на 3 %. Такая дыспрапорцыя адмоўна адбівалася на развіцці абароннай прамысловасці.

Умацоўваючы ваенна-эканамічны патэнцыял краіны, кіраўніцтва Савецкага Саюза імкнулася ўдасканальваць арганізацыю вытворчасці і ўзровень дысцыпліны на прадпрыемствах і ва ўстановах. Згодна загада Вярхоўнага савета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г. усе працоўныя пераходзілі на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы рабочы тыдзень, актывізавалася барацьба за ўмацаванне дысцыпліны на вытворчасці, забаранялася самавольна пакідаць рабочыя месцы.

Вялікая ўвага надавалася накапленню дзяржаўных рэсурсаў і мабілізацыйных запасаў. З 1940 па чэрвень 1941 г. іх аб’ёмы павялічыліся амаль што ўдвая. Стваралася сетка навучальных устаноў па падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых кадраў (школы фабрычна-заводскага навучання і рамесныя вучылішчы). Спецыяльныя навучальныя ўстановы штогод рыхтавалі да 1 млн маладых рабочых. Яны складалі дзяржаўны рэзерв працоўнай сілы.

Значна выраслі магутнасці танкавых і авіяцыйных заводаў. На пачатак Вялікай Айчыннай вайны іх магчымасці ў 1,5 раза перавышалі германскую прамысловасць. Усё гэта дазволіла наладзіць выпуск новай тэхнікі і боепрыпасаў. Са снежня 1939 г. да ліпеня 1941 г. Чырвоная Армія атрымала 7 тыс. танкаў, каля 18 тыс. баявых самалётаў. Прамысловасць выпусціла 82 тыс. мінамётаў і гармат, больш чым 105 тыс. кулямётаў розных мадыфікацый, каля 100 тыс. аўтамабіляў.

Библиотека БГУИР

Палітычнае кіраўніцтва СССР значную ўвагу надавала ўмацаванню Узброеных Сіл. Значным крокам у гэтым напрамку з’явілася **прынядце 1 верасня 1939 г. Закона аб усеагульнай вайсковай павіннасці**. Чырвоная Армія пераводзілася на кадравую сістэму камплектацыі замест тэрытарыяльна-кадравага прынцыпу яе камплектавання, зніжаўся прызыўны ўзрост з 21 года да 19 гадоў. Значна пашыралася сетка ваенных навучальных устаноў. Колькасць Узброеных Сіл СССР вырасла з 1,5 млн чал. у 1938 г. да 5,3 млн у 1941 г., вытворчасць узбраенняў за гэтыя гады павялічылася ў 4 разы.

Быў створаны моцны падводны флот, праведзена значная мадэрнізацыя баявых караблёў, прадугледжвалася далейшае пашырэнне будаўніцтва вялікага марскога і акіянскага флоту. У перадваенныя гады была ўзмоцнена дзейнасць палітычных органаў арміі і флоту. У студзені 1939 г. Прэзідыум Вярхоўнага савета СССР зацвердзіў новы тэкст прысягі.

**Пагроза распальвання вайны патрабавала мадэрнізацыі ўзбраення арміі і флоту.** Ужо ў 1939 г. быў выпушчаны штурмавік ІЛ-2, а знішчальнік ЯК-1 – у пачатку 1940 г. Аднак у войскі гэтыя самалёты сталі паступаць толькі ў 1941 г. Лепшыя ў свеце танкі КВ і Т-34 былі сканструяваны і прыняты на ўзбраенне ў канцы 1939 г., але іх серыйная вытворчасць пачалася толькі ў другой палове 1940 г.

Наркамат абароны вельмі зацягнуў рашэнне аб пераўзбраенні арміі новымі тыпамі самалётаў, танкаў, артылерыйскай і стралковай зброяй. Толькі ў ліпені 1940 г. былі прыняты на ўзбраенне самалёты МІГ-1, МІГ-3, ЯК-1, ЯК-4, ІЛ-2, ПЕ-2, якія валодалі вялікай хуткасцю і павышанай бомбавай нагрузкай. З вялікім спазненнем было прынята рашэнне аб серыйнай вытворчасці танкаў КВ і Т-34. Усё гэта значна паўплывала на баяздольнасць Чырвонай Арміі ў трагічным 1941 г. Асноўныя мерапрыемствы па пераўзбраенні арміі планавалася ажыццявіць у 1941 г.



Библиотека БГУИР

Чырвоная Армія мела самую разнастайную зброю айчыннай вытворчасці. Многія ўзоры савецкага ўзбраення былі не толькі на ўзроўні аналагічных відаў зброі заходніх краін, але і пераўзыходзілі іх, аднак новыя ўзоры баявой тэхнікі і зброі толькі пачыналі паступаць у войскі. Як відаць, краіна зрабіла шмат дзеля абароны, аднак ні часу, ні сродкаў, каб належным чынам падрыхтавацца для адпору ворагу, было недастаткова. Савецкі Саюз яўна адставаў у вытворчасці новай зброі і тэхнікі ад германскай прамысловасці.

Магутнай групоўцы германскіх узброеных сіл, якія былі сканцэнтраваны ўздоўж заходняй мяжы СССР і падрыхтаваны для нападу, супрацьстаялі Паўночны флот, войскі Ленінградскай ваеннай акругі, Балтыйскі флот, а таксама войскі Прыбалтыйскай, Заходняй, Кіеўскай асобных акруг, Адэскай акругі і Чарнаморскага флоту. З пачаткам вайны кожная акруга (акрамя Адэскай) была пераўтворана ў фронт.

У сувязі з абвастрэннем агульнай абстаноўкі ў маі – чэрвені 1941 г. у войсках Чырвонай Арміі праводзіліся значныя перагрупоўкі. Спачатку яны ахапілі толькі прыгранічныя ваенныя акругі, а з 13 мая пачалася передыслакацыя войск з унутраных акруг бліжэй да мяжы. Войскі прыгранічных акруг складалі больш паловы колькасці войскаў усёй Чырвонай Арміі (каля 54 %). Гэта былі буйныя сілы, дастатковыя для паспяховай абароны. Аднак асабовы склад большасці дывізій быў укамплектаваны па штатах мірнага часу. Асабовы склад Заходняй асобай ваеннай акругі (ЗахАВА) налічваў 37 – 71 % штатаў ваеннага часу. Забяспечанасць тылавых органаў транспартам складала 40 – 45 %. З 6 механізаваных карпусоў толькі адзін меў амаль поўную матэрыяльную частку. Асновай танкавага парку і авіяцыі былі машыны састарэлых марак. Ваенна-паветраныя сілы размяшчаліся скучана, блізка ля мяжы і не мелі цэнтралізаванага кіравання. Не было і сучасных сродкаў сувязі.

Библиотека БГУИР

Войскі былі размешчаны на вялікай тэрыторыі па фронце (да 4,5 тыс. км і на 400 км у глыбіню). Дывізіі другога эшалону былі аддалены ад мяжы на 50 – 100 км, а злучэнні рэзерва – на 150 – 400 км. Усе танкавыя дывізіі ўваходзілі ў склад другога эшалону і рэзерваў. Пралікі меліся і ў размяшчэнні мабілізацыйных запасаў. Іх вялікая колькасць знаходзілася каля дзяржаўнай мяжы, што ў першыя месяцы вайны непазбежна паставіла іх пад пагрозу знішчэння.

Разам з тым узброеныя сілы, у тым ліку і тая іх частка, якая дыслацыравалася ў БССР, былі аслаблены рэпрэсіямі. Яны пазбавілі Чырвоную Армію каля 40 тыс. вопытных камандзіраў. Праўда, напярэдадні і ў пачатку вайны каля 12,5 тыс. рэпрэсіраваных было вызвалена і напраўлена ў дзеючую армію, ў тым ліку К.К. Ракасоўскі, К.А. Мерацкоў, А.В. Гарбатаў, а таксама каля 20 генералаў-беларусаў. У два разы зменшылася колькасць каманднага складу Чырвонай Арміі з вышэйшай адукацыяй. Гэта адмоўна адбілася на стане баявой падрыхтоўкі асабовага складу і ўпраўлення часцямі і падраздзяленнямі.

У Беларусі праводзілася работа па ўмацаванні заходніх рубяжоў краіны. Планавалася пабудаваць 4 умацаваныя раёны: Гродзенскі, Асавецкі, Замброўскі, Брэсцкі. Кожны ўмацаваны раён меў працягласць ад 80 да 180 км і глыбіню абароны ад 3 да 8 км. Аднак да чэрвеня 1941 г. з запланаваных 1 174, было пабудавана толькі 505, а абсталявана і ўзброена толькі 193 доўгатэрміновыя агнявыя збудаванні (толькі 38,4 %). Зразумела, што такая колькасць не дазволіла ў пачатку вайны стварыць устойлівую сістэму абароны заходніх межаў Беларусі.

Асаблівая ўвага надавалася будаўніцтву ў Мінску і Магілёве авіяцыйных, а ў Віцебску і Баранавічах – танкарамонтных заводаў.

Ужо ў 1939 г. у ЦК, абкомах і райкомах партыі былі створаны ваенныя аддзелы, якія ажыццяўлялі кіраўніцтва ваенна-

Библиотека БГУИР

мабілізацыйнай работай і патрыятычным выхаваннем насельніцтва. Усе камуністы (асабліва кіруючы склад), абавязаны былі валодаць адной з вайсковых прафесій, актыўна ўдзельнічаць у рабоце абаронных арганізацый.

Актывізавалася дзейнасць абаронных і спартыўных таварыстваў, арганізацый Чырвонага Крыжа сярод насельніцтва, вучнёўскай і студэнцкай моладзі. На прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах ствараліся гурткі па вывучэнню ваеннай справы. Іх удзельнікі авалодвалі майстэрствам меткай стральбы, кіданнем гранаты, санітарнай і аўтамабільнай справамі. Рыхтаваліся значкісты ПВХО, ГТО, ГСО, варашылаўскія стралкі, кулямётчыкі, снайперы, шафёры, матацыклісты, лётчыкі, парашутысты, радысты, варашылаўскія коннікі і іншыя спецыялісты вайсковай справы. Праводзіліся ваенізаваныя пераходы студэнтаў і навучэнцаў, ваенна-тактычныя вучэнні і гульні. Ствараліся і працавалі спартыўныя секцыі, праходзілі вечары фізкультурнікаў, праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы, лыжныя паходы і спартакіяды. Гэта садзейнічала падрыхтоўцы насельніцтва і перш-наперш моладзі да абароны Айчыны.

Часці **ЗахАВА** (камандуючы генерал арміі **Дз.Р. Паўлаў**, начальнік штаба генерал-маёр У.Я. Клімаўскіх, член ваеннага савета карпусны генерал А.Я. Фаміных) складаліся з 44 дывізій агульнай колькасцю 671,9 тыс. чал. У войсках было 10 087 гармат і мінамётаў, 2 201 танк і 1 685 самалётаў (у асноўным старых мадэляў).

Фактычна ігнаравалася верагоднасць нападу нацысцкай Германіі на СССР. У выніку савецкія войскі не былі прыведзены ў баявую гатоўнасць, а жорсткае патрабаванне не паддавацца на правакацыі дэзарыентавала армію і народ.

Такімі былі дасягненні і пралікі савецкага кіраўніцтва па падрыхтоўцы краіны да абароны.

Библиотека БГУИР

# РАЗДЗЕЛ II. БАРАЦЬБА САВЕЦКАГА НАРОДА СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКАЙ АГРЭСІІ (8 ГАДЗІН)

## Лекцыя 3. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны

***План***

1. Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза.
2. Мабілізацыя сіл і сродкаў краіны для барацьбы з фашысцкай агрэсіяй.

**1. Напад фашысцкай Германіі на СССР. Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза.** 22 чэрвеня 1941 г. у 3 гадзіны 30 хвілін тры групы армій фашысцкага блока на фронце паміж Балтыйскім і Чорным марамі і тры асобныя арміі паміж Фінскім залівам і Барэнцавым морам (усяго 190 варожых дывізій, з якіх 153 дывізіі – нямецкія і 37 дывізій – фінскія, венгерскія, італьянскія і румынскія, агульнай колькасцю 5,5 млн чал.) пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі ўварваліся на тэрыторыю Савецкага Саюза. Варожая авіяцыя нанесла ўдар па аб’ектах у Заходняй прыгранічнай паласе на адлегласці 400 км, г.зн. на глыбіню размяшчэння войск нашых заходніх прыгранічных ваенных акруг. Масіраваным бамбардзіроўкам падвергліся гарады Мурманск, Ліепая, Рыга, Каўнас, Мінск, Смаленск, Кіеў, Жытомір і інш., а таксама ваенна-марскія базы Кранштадт, Ізмаіл, Севастопаль і інш. Савецкая авіяцыя прыгранічных акруг з-за скучанага базіравання часцей і непрывядзення ў стан баявой гатоўнасці страціла ў першы дзень вайны 1 200 самалётаў, 738 з якіх было знішчана на беларускай зямлі.

Задачу разбурэння ліній сувязі, парушэння ўпраўлення войскамі вырашалі дыверсійныя групы палка «Брандэнбург», скінутыя на парашутах на савецкую тэрыторыю. Імі былі знішчаны таксама



Библиотека БГУИР

многія савецкія камандзіры і дэлегаты сувязі ў першыя гадзіны вайны. Як адзначаў начальнік генштаба сухапутных войск Германіі Ф. Гальдэр, *«наступление наших войск, по-видимому, явилось для противника на всём фронте полной тактической внезапностью. Части были захвачены врасплох в казарменном расположении, самолёты стояли на аэродромах, покрытые брезентом, а передовые части, внезапно атакованные нашими войсками, запрашивали командование о том, что им делать»*.

У чатыры гадзіны раніцы ў Берліне савецкаму паслу В. Дзеканозаву быў уручаны мемарандум нямецкага ўрада, у якім гаварылася: *«Варожыя паводзіны ў адносінах да Германіі савецкага ўрада і сур'ёзная пагроза, якая праявілася ў руху савецкіх войск на нямецкую ўсходнюю граніцу, прымушае рэйх да дзеянняў у адказ»*. Тое ж самае гаварылася ў заяве германскага пасла ў Маскве Шуленбурга, якую ён афіцыйна зрабіў савецкаму ўраду. У дэмагагічным звароце да войск на Усходнім фронце 22 чэрвеня А. Гітлер заявіў: *«Кремлёвские власти ... намеревались уничтожить не только Германию, но и всю Европу. ... Противник вооружился до такой степени, что это превзошло самые серьёзные опасения. ... Бог был милосерден к нашему народу и ко всему европейскому миру – если бы этот варварский враг двинул десятки тысяч своих танков до того, как мы двинули свои, вся Европа была бы потеряна…»*.

Як бачна, абвінавачанне СССР ў падрыхтоўцы нападу на Германію неаднойчы гучала з вуснаў Гітлера і бліжэйшага яго акружэння. Што тычыцца гістарыяграфіі, то міф аб тым, што СССР рыхтаваў прывентыўны ўдар, быў шырока распаўсюджаны адразу пасля вайны ва ўспамінах былых германскіх генералаў і афіцэраў і чыноўнікаў Трэцяга рэйха, якія імкнуліся апраўдаць свой удзел у рэалізацыі экспансіўнай захопніцкай палітыкі.

Библиотека БГУИР

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны гісторык З. Шыбека характарызуе наступным чынам: *«Вайна для СССР выбухнула з непазбежнасцю. Абодва “саюзнікі” рыхтаваліся да нападу адзін на аднаго, але Гітлер апярэдзіў. Бальшавікі і нацысты, што трызнілі пра сусветнае панаванне, уцягнулі ў крывавую бойню і Беларусь. Беларускі народ стаў перад праблемай пошуку паратунку. Але ці можна было спадзявацца на сталінскую таталітарную дзяржаву, на акупаваную Польшчу, на нацысцкую Германію, на далёкія Англію і ЗША?»* (с.310).

Няўжо З. Шыбека не ведае, што такімі сцвярджэннямі ён паўтарае міфы заправілаў гітлераўскай Германіі, якія апраўдвалі факт агрэсіі супраць Савецкага Саюза. На жаль, не толькі З. Шыбека, але і некаторыя іншыя “дэмакратычныя” палітыкі, гісторыкі і публіцысты паўтараюць міфы фашысцкай прапаганды аб тым, што не Германія, а Савецкі Саюз распачаў Вялікую Айчынную вайну.

Ніхто не ўцягваў у крывавую бойку Беларусь. Яна з’яўлялася часткай Савецкага Саюза, які падвергся агрэсіі з боку фашысцкай Германіі. Беларускі народ разам з усім савецкім народам падняўся на абарону Айчыны. Пры гэтым ён не шукаў паратунку і не спадзяваўся, як піша З. Шыбека, “на акупаваную Польшчу, на нацысцкую Германію, на далёкія Англію і ЗША”. На гэтых “выратавальнікаў” спадзявалася меншасць беларускага народа, якая ў гады вайны супрацоўнічала з фашыстамі. Беларускі народ спадзяваўся на ваенную і эканамічную магутнасць СССР, на духоўную і маральную несакрушальнасць народа.

Библиотека БГУИР

Разам з фашысцкай Германіяй супраць СССР выступілі **Італія**, **Фінляндыя, Румынія, Венгрыя**, марыянетачная прагерманская **Славакія** (выдзелілася з Чэхаславакіі), прагерманская **Харватыя** (выдзелілася з Югаславіі). Іспанія, Партугалія, Турцыя, Швецыя, Данія і Нарвегія вайны Савецкаму Саюзу афіцыйна не аб'яўлялі, але на справе гэтыя дзяржавы ўступілі ў тайную змову з агрэсарам. Прывядзем некаторыя цікавыя факты і статыстыку. Пасля 22 чэрвеня 1941 г. з'явіліся добраахвотныя фашысцкія легіёны «Фландрыя», «Нідэрланды», «Валонія», «Данія», якія пазней ператварыліся ў дывізіі СС «Норланд» (скандынаўская), «Лангемарк» (бельгійска-фламандская), «Шарлемань» (французская) і інш. З агульнай колькасці 3 770 290 ваеннапалонных краін фашысцкага блоку асноўную масу складалі немцы і аўстрыйцы – 2 546 242 чал.; 766 901 чал. належалі да іншых аб'явіўшых нам вайну нацый (венгры, румыны, італьянцы, фіны і інш.), але яшчэ 464 147 ваеннапалонных – гэта французы, бельгійцы, чэхі і прадстаўнікі іншых, быццам бы не ваяваўшых з намі нацый (Гриф секретности снят. Потери вооружённых сил СССР в боевых действиях и военных конфликтах: статистическое исследование. – М., 1993, с.391).

22 чэрвеня ў 12 гадзін дня ад урада СССР да савецкага народа звярнуўся нарком замежных спраў В.М. Молатаў. Яго выступленне закончылася словамі, якія хутка сталі крылатымі: *«Наше дело правое. Враг будет разбит. Победа будет за нами»*.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна – састаўная і рашаючая частка Другой сусветнай вайны. Яна працягвалася **1418 дзён і начэй**.

З самага пачатку вайна атрымала найменне **«Вялікая Айчынная»**. Сёння некаторыя «дэмакратычныя» гісторыкі па палітыка-ідэалагічных матывах ці пад уплывам "грантаманіі" (атрымання грантаў ад уплывовых людзей Захаду), беспадстаўна, без навуковых аргументаў, са знявагай да народа-пераможцы і яго нашчадкаў

называюць Вялікую Айчынную вайну савецка-германскай і нават германа-савецкай. Іншы раз тэрмін “Вялікая Айчынная вайна” не ўжываецца, а замяняецца тэрмінам “Другая сусветная вайна”.

У кнізе Захара Шыбекі “Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002” тэрмін “Вялікая Айчынная вайна” наогул не ўжываецца, а гэтая вайна на с. 310 называецца “нямецка-савецкай вайной”. У кнізе гісторыкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта “Гісторыя Беларусі. У 2 частках. Частка 2. XIX – XX стагоддзі: Курс лекцый” (Мн., 2002), напісанай пад кіраўніцтвам былога міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктара гістарычных навук П.І. Брыгадзіна, тэма VII называецца “Беларусь у перыяд Другой сусветнай вайны”. Ніводная з назваў лекцый гэтай кнігі не ўтрымлівае тэрміна “Вялікая Айчынная вайна”, затое ў саміх тэкстах лекцый гэты тэрмін хітра-сарамліва некалькі разоў упамінаецца. Гэткая ж пазіцыя аўтараў адлюстравана ў кнізе “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: Дапаможнік” (Мн., 2003, пад рэдакцыяй Л.В. Лойкі, кіраўнік аўтарскага калектыву У.А. Сосна), выдадзенай Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы. Ізноў “Беларусь у гады Другой сусветнай вайны” і ніводнага тэрміна “Вялікая Айчынная вайна” у назвах параграфаў. Некалькі разоў гэты тэрмін ўжываецца ў тэксце. Аналіз вучэбных планаў і праграм гістарычных факультэтаў некаторых універсітэтаў сведчыць пра тое, што тэрмін “Вялікая Айчынная вайна” у гэтых вучэбных дакументах адсутнічае.

Складваецца ўражанне, што гэтыя кнігі пісалі не нашчадкі гераічнага савецкага народа, які ў чэрвені 1941 г. стаў на абарону сваёй Айчыны, а нашчадкі амерыканцаў, англічан і французаў, для якіх 1939 – 1945 гг. з’яўляюцца сапраўды гадамі Другой сусветнай вайны. Для беларусаў, як і для прадстаўнікоў іншых народаў вялікага Савецкага Саюза, 1941 – 1945 гг. – гэта гады Вялікай Айчыннай вайны

Библиотека БГУИР

савецкага народа. Цяжка паверыць у тое, што прафесійныя беларускія гісторыкі гэтага не ведаюць ці пра гэта забыліся.

**Па-першае**, канкрэтна-гістарычныя матэрыялы сведчаць пра тое, што гэта была вайна савецкага народа за незалежнасць сваёй Айчыны, а па маштабах баявых дзеянняў, жорсткасці барацьбы, ваенна-палітычных і міжнародных выніках яна з'яўлялася сапраўды Вялікай. **Па-другое**, з Савецкім Саюзам ваявала не толькі Германія, але і іншыя краіны Еўропы, краіны фашысцкага блоку, таму ніяк не назавеш гэту вайну савецка-германскай ці германа-савецкай, калі прытрымлівацца навуковага падыходу да аналіза гістарычных фактаў. **Па-трэцяе**, вайну «Вялікай Айчыннай» назвалі тыя, хто ўступіў у смяротную схватку з фашызмам і за кошт вялікіх ахвяр і пакут задушыў яго ва ўласным логавішчы. Маладым гісторыкам патрэбна было б паважаць тых пераможцаў над фашызмам, хто жыве побач з намі, і ўшаноўваць памяць тых, каго ўжо няма сярод нас, паважаць краіну-пераможцу і крышачку сябе, нашчадкаў пераможцаў над фашызмам.

**Мэты фашысцкай Германіі ў развязанай ёю вайне** зводзіліся да наступнага:

– Пашырэнне жыццёвай прасторы для германцаў, заваяванне сусветнага панавання. Зыходзячы з ідэі аб «націску на ўсход» *(Drang nach Osten),* Гітлер абгрунтаваў у свёй працы «Mein Kampf» ідэю пашырэння «жыццёвай прасторы» германскай нацыі за кошт далучэння ўсходніх тэрыторый. Гітлер адмаўляў славянскім народам у здольнасці ствараць уласныя дзяржавы. Ідэалагічным ворагам пад нумарам адзін у германскага нацыянал-сацыялізму з'яўляўся «савецкі яўрэйска-бальшавісцкі рэжым». *«Граница между Европой и Азией, – говорил Гитлер в сентябре 1941 г., – проходит не по Уралу, а на том месте, где кончаются поселения настоящих германцев… Наша задача состоит в том, чтобы передвинуть эту границу возможно дальше на Восток, если нужно ... за Урал ... Азиаты и большевики*



Библиотека БГУИР

*будут изгнаны из Европы, эпизод 250-летней азиатчины закончен. Восток будет для Западной Европы рынком сбыта и источником сырья»*;

– Разгром Узброеных Сіл СССР, знішчэнне савецкай дзяржавы, падзел тэрыторыі і багаццяў СССР паміж Германіяй і яе сатэлітамі, стварэнне на прасторах СССР дробных дзяржаўных утварэнняў каланіяльнага і поўкаланіяльнага тыпу. Фашысты планавалі засяліць Украіну, Беларусь, Літву, Латвію, Эстонію 10 млн нямецкіх каланістаў – «сапраўдных гаспадароў зямлі і прамысловасці», потым уключыць гэтыя землі ў склад «вялікай Германіі». У Закаўказзі і Сярэдняй Азіі меркавалі арганізаваць з буржуазных нацыяналістаў марыянетачныя ўрады, цалкам падпарадкаваныя Берліну і дыслакаваным там гарнізонам нямецкіх войск. На месцы Масквы фашысты хацелі стварыць вялікае возера, Ленінград разбурыць і перадаць саюзнай Фінляндыі. Румыніі за ваенную дапамогу абяцалі аддаць Малдавію і Адэсу, Італіі – шэраг зямель на поўдні СССР. Правячым колам Турцыі пры ўступленні ў вайну абяцалі перадаць шэраг раёнаў Закаўказзя, Японіі – савецкі Далёкі Усход і Усходнюю Сібір. Не забыліся фашысты і пра Злучаныя Штаты і Англію. Калі яны прызнаюць першынство Германіі ў свеце, вернуць ёй калоніі, прымкнуць да ваеннага паходу супраць СССР ці будуць нейтральнымі – пры гэтых умовах нацысты абяцалі ЗША аддаць Чукотку і Камчатку, Англіі – поўнач Еўрапейскай часткі СССР з Мурманскам і Архангельскам.

– Фізічнае знішчэнне большай часткі славян – насельніцтва «ніжэйшай расы», анямечванне астатніх славян і ператварэнне іх у рабоў нямецкіх гаспод. У адпаведнасці з планам «Ост» меркавалася 75 % насельніцтва Беларусі знішчыць ці выселіць за Урал, 25% анямечыць і прымусіць працаваць на немцаў-каланізатараў. У Мінску, напрыклад, планавалася пакінуць 100 тыс. чал. мясцовага



Библиотека БГУИР

насельніцтва і пасяліць 50 тыс. нямецкіх каланістаў, у Гомелі – адпаведна 50 і 30 тыс., у Магілёве і Бабруйску – па 50 і 20 тыс., у Барысаве, Лідзе і Навагрудку – па 15 тыс. мясцовага насельніцтва і 5 тыс. нямецкіх каланістаў і г.д.

У адпаведнасці з нямецкім планам пасляваеннай перабудовы Мінска на галоўных магістралях пры выездзе з горада і ў яго цэнтры намячалася пабудаваць казармы для размяшчэння гарнізонаў эсэсаўцаў. Уздоўж р. Свіслач паміж вуліцамі Першамайскай і Інтэрнацыянальнай гітлераўцы планавалі ўзвесці будынак галоўнага ваенна-фашысцкага ўпраўлення, у межах вуліц Свярдлова, Камсамольскай і Кірава – будынкі СД, жандармерыі, іншых карных органаў. У раёне вуліц Берсана і Мяснікова планавалі пабудаваць вязніцу, а ў раёне вуліцы Лібкнехта – крэматорый з пляцоўкай для расстрэлаў і спецыяльнымі пад'язднымі пуцямі. Такія ж збудаванні для масавага знішчэння насельніцтва гітлераўцы планавалі стварыць і ў іншых гарадах Беларусі. Хіба ж можна сур'ёзна ўспрымаць сёння некаторых «недавучаных інтэлігентаў», якія з выглядам «вялікіх мысліцеляў» сцвярджаюць аб тым, што «калі б не ваявалі з Германіей у 1941 – 1945 гг., то сёння сядзелі б у піўных Мюнхена і пілі б баварскае піва». Не, не з півам, а з танкамі, самалётамі, гарматамі і аўтаматамі прыходзілі да нас фашысты, каб знішчаць нас, а не частаваць смачным напоем. Гэта быў звычайны генацыд, накіраваны на знішчэнне славян, яўрэяў і іншых народаў.

Каб «цывілізаваныя» немцы ўзяліся за зброю і сталі на злачынны шлях, Гітлер і яго кліка паабяцалі ім «тысячагадовае квітненне рэйха», «райскае жыццё» пасля перамогі над СССР: кожнаму – народны аўтамабіль («фольксваген»), вызваленне ўсіх немцаў ад падаткаў, магчымасць атрымаць на ўсходзе зямлю, маёмасць і рабоў-славян, якія дзень і ноч будуць працаваць на каланізатараў-немцаў. На жаль, нямецкі народ «клюнуў» на гэтую нажыўку фашысцкай



Библиотека БГУИР

прапаганды. За злачынствы гітлерызма ў гады Другой сусветнай вайны ён нясе адказнасць перад гісторыяй і сваім сумленнем.

Савецкі Саюз у навязанай яму вайне ставіў задачай абарону Айчыны, вызваленне акупаванай ворагам савецкай тэрыторыі і насельніцтва; аказанне дапамогі народам Еўропы ў вызваленні ад фашызму, ліквідацыю фашызму і яго «новага парадку», выратаванне сусветнай цывілізацыі ад фашысцкага варварства; недапушчэнне ў будучым магчымасці новай вайны з боку агрэсіўных сіл і дзяржаў.

У першы дзень вайны Прыбалтыйская, Заходняя і Кіеўская асобныя ваенныя акругі былі пераўтвораны адпаведна ў Паўночна-Заходні, Заходні і Паўднёва-Заходні франты. 24 чэрвеня Ленінградская ваенная акруга была пераўтворана ў Паўночны фронт, а з 9-й і 18-й армій сфарміраваны Паўднёвы фронт. Для непасрэднага кіраўніцтва ўзброенай барацьбой на франтах 23 чэрвеня 1941 г. была створана Стаўка Галоўнага Камандавання, якая пазней пераўтворана ў **Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандавання** пад старшынствам Сталіна. Сталін прызначаецца наркомам абароны і Вярхоўным Галоўнакамандуючым Узброенымі сіламі СССР.

**2. Мабілізацыя сіл і сродкаў краіны для барацьбы з фашысцкай агрэсіяй.** Канкрэтнай праграмай мабілізацыі сіл і сродкаў краіны на барацьбу з ворагам з’яўлялася **дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня 1941 г**. Савецкі ўрад і ЦК партыі заклікалі перабудаваць усю работу на ваенны лад, арганізаваць усебаковую дапамогу фронту, павялічыць вытворчасць зброі, боепрыпасаў, танкаў, самалётаў, пачаць партызанскую барацьбу ў тыле ворага. Мерапрыемствы па мабілізацыі сіл і сродкаў краіны для барацьбы з ворагам былі выкладзены **І.В. Сталіным у яго прамове па радыё 3 ліпеня 1941 г**.

**Вайна запатрабавала аператыўнай перабудовы дзейнасці партыі, органаў дзяржаўнай улады і кіравання.** У аснову перабудовы быў пакладзены прынцып максімальнай цэнтралізацыі палітычнага, гаспадарчага і ваеннага кіраўніцтва.

**30 чэрвеня 1941 г**. ствараецца **Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА)** ў наступным складзе: І. Сталін (старшыня), В. Молатаў (намеснік старшыні), К. Варашылаў, Г. Маленкоў, Л. Берыя. Пазней у яго склад былі ўведзены М. Булганін, М. Вазнесенскі, Л. Кагановіч і А. Мікаян. Камітэт валодаў надзвычай вялікай кампетэнцыяй: прызначаў і здымаў з пасад вышэйшае камандаванне; займаўся падрыхтоўкай ваенных рэзерваў для дзеючай арміі; вырашаў ваенна-стратэгічныя пытанні; наладжваў работу прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі, забеспячэнне насельніцтва і арміі; займаўся падрыхтоўкай працоўных рэзерваў і размеркаваннем рабочай сілы па вытворчых аб’ектах.

Для аператыўнага кіраўніцтва ваеннай гаспадаркай былі пашыраны правы народных камісарыятаў СССР, саюзных рэспублік і створаны наркаматы танкавай і мінамётнай прамысловасці.

Наступнай састаўной часткай праграмы пераўтварэння краіны ў адзіны баявы лагер з’яўлялася **мабілізацыя, разгортванне і павышэнне боегатоўнасці Савецкіх Узброеных Сіл**. З амаль 12 млн ваеннаабавязаных, якія былі на ўліку, больш 4 млн з’яўляліся неабучанымі, не валодалі нават элементарнымі ведамі ваеннай справы. Вострым быў недахоп у кулямётчыках, мінамётчыках, артылерыстах, радыстах, шафёрах, трактарыстах, а таксама ў тэхніках і інжынерах. У кароткі тэрмін патрэбна было разгарнуць шматмільённую армію і зрабіць яе баяздольнай.

За першыя 8 дзён вайны было прызвана ў армію 5,3 млн чал. Мабілізацыя праходзіла ў абставінах вялікага пытрыятычнага ўздыму. Масавым была падача заяў аб добраахвотным уступленні ў

Бібліятэка БГУІР

рады Чырвонай Арміі. Да 1 снежня 1941 г. дзеючая армія папоўнілася 291 дывізіяй і 94 брыгадамі. За гады вайны ў армію было прызвана больш за 29 млн чал.

Формай масавага патрыятычнага руху савецкага народа ў гады вайны сталі **знішчальныя батальёны**. Ужо 24 чэрвеня 1941 г. СНК СССР прымае пастанову аб стварэнні на добраахвотных пачатках у прыфрантавой паласе знішчальных батальёнаў для барацьбы з дыверсійнымі і дэсантнымі групамі праціўніка. Да канца ліпеня ў СССР было арганізавана 1 755 такіх батальёнаў агульнай колькасцю звыш 328 тыс. чал. Усяго за гады вайны ў іх знаходзілася каля 400 тыс. чал.

На Беларусі фарміраванне знішчальных батальёнаў пачалося ў выніку аб’яднання рабочых атрадаў і груп самаабароны, створаных у першыя гадзіны вайны мясцовымі партыйнымі органамі. Да 15 ліпеня 1941 г. у рэспубліцы было створана 78 знішчальных батальёнаў (больш за 13 тыс. чал.) і 300 груп самаабароны (27 тыс. чал.). Знішчальныя батальёны змагаліся з дыверсантамі і паветранымі дэсантамі ворага, рабілі на дарогах завалы, «воўчыя ямы», ліквідавалі вынікі налётаў варожай авіяцыі, ратавалі матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці, праводзілі палітработу сярод насельніцтва, удзельнічалі ў абарончых баях, знішчалі групы праціўніка, якія прарваліся ў савецкі тыл, з’яўляліся папаўненнем Чырвонай Арміі.

Адной з форм масавага патрыятычнага руху савецкага народа, яго непасрэднага ўдзелу ў вайне супраць германскіх захопнікаў было **народнае апалчэнне**. У кароткі час у яго запісалася да 1 млн чал. Было створана каля 60 дывізій народнага апалчэння, з якіх 37 у той ці іншы час удзельнічалі ў баях. Аднак масавы рух апалчэння ва ўмовах баявых дзеянняў быў неадназначнай з’явай. З аднаго боку, безумоўна, апалчэнне з’яўлялася адлюстраваннем патрыятычнага ўздыму насельніцтва. У той жа час дрэнна ўзброеныя і навучаныя,

Бібліятэка БГУІР

апалчэнцкія дывізіі ў баях неслі вялікія страты. Істотны ўрон наносіўся і народнай гаспадарцы, паколькі ад вытворчасці адрывалася вялізная колькасць рабочых рук. Невыпадкова, што па меры зніжэння напружання на франтах кіраўніцтва краіны ўсё радзей звярталася да набору апалчэння.

На аснове пастаноў ДКА ад 16 ліпеня 1941 г. «Аб падрыхтоўцы рэзерваў у сістэме наркамата абароны і наркамата Ваенна-Марскога Флоту і ад 17 верасня 1941 г. «Аб усеагульным ваенным навучанні ваеннай справе грамадзян СССР» за гады вайны праз сістэму ўсенавуча было падрыхтавана звыш 7 млн чал. Навучанне праходзілі ўсе мужчыны ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў, у першую чаргу дапрызыўнікі і ваеннаабавязаныя запасу, уводзілася ваенная і фізкультурная падрыхтоўка вучняў 8 – 10 класаў сярэдняй школы.

ЦК ВКП(б) прыняў меры **па ўзмацненні партыйна-палітычнага ўплыву ў дзеючай арміі**. 27 і 29 чэрвеня 1941 г. ён прыняў рашэнні аб мабілізацыі камуністаў і камсамольцаў на фронт у якасці палітбайцоў. Кожны абком і крайком ВКП(б) павінен быў у трохдзённы тэрмін мабілізаваць ад 500 да 5 тыс. камуністаў і накіраваць іх у распараджэнне наркамата абароны. Толькі ў першы год вайны партыя накіравала ва Узброеныя Сілы не менш 1 млн камуністаў і каля 2 млн камсамольцаў. Усяго ў гады вайны 80 % камуністаў знаходзіліся ва Узброеных Сілах СССР, 3 млн з іх (кожны другі) загінулі ў баях. Каб аблегчыць прыём у партыю воінаў, якія вызначыліся ў баях, ЦК ВКП(б) дазволіў паступаючым прадстаўляць рэкамендацыі трох членаў партыі не з 3-гадовым, а з гадавым партыйным стажам. У снежні 1941 г. ЦК ВКП(б) пастанавіў прымаць у члены партыі ваеннаслужачых, якія вызначыліся ў баях, па заканчэнні трохмесячнага кандыдацкага стажу. Усяго ў партыю на фронце ўступіла больш 5 млн чал. Гітлер аддаў загад камуністаў у палон не браць, расстрэльваць на месцы.

**Палітыка-выхаваўчая работа** была перабудавана і сканцэнтравана на рашэнні 3 галоўных задач: выхаванне непрымірымай нянавісці да захопнікаў; цвёрдай упэўненасці ў непазбежнасці перамогі; гатоўнасці ісці на любыя ахвяры і страты дзеля разгрома ворага. Многае рабілася для пастаяннага і аператыўнага інфармавання насельніцтва аб падзеях на фронце і ў тыле. Было створана **Савецкае Інфармацыйнае Бюро**, звесткі якога перадаваліся па радыё 5 разоў у дзень, былі павялічаны тыражы цэнтральных газет.

Праграма ператварэння краіны ў адзіны баявы лагер уключала ў сябе **разгортванне партызанскага руху і стварэнне партыйна-камсамольскага падполля на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі**. Гэтаму будзе прысвечана асобная лекцыя.

І, нарэшце, яшчэ адна важная састаўная частка праграмы ператварэння краіны ў адзіны баявы лагер – **перавод савецкай эканомікі на ваенныя рэйкі, стварэнне магутнай ваеннай гаспадаркі, здольнай забяспечыць Узброеныя Сілы ўсім неабходным для дасягнення перамогі над ворагам**.

Перавод народнай гаспадаркі на ваенныя рэйкі пачаўся з перагляду эканамічных планаў. 30 чэрвеня 1941 г. ЦК ВКП(б) і СНК СССР зацвердзілі мабілізацыйны народнагаспадарчы план на III квартал 1941 г., які прадугледжваў павелічэнне вытворчасці ваеннай тэхнікі на 26 %. У сярэдзіне жніўня быў зацверджаны ваенна-гаспадарчы план на IV квартал 1941 г. і на 1942 г. па раёнах Паволжа, Урала, Заходняй Сібіры, Казахстана і Сярэдняй Азіі, які адыграў важную ролю ў стварэнні ваенна-прамысловай базы ва ўсходніх раёнах краіны і ў поўнай перабудове народнай гаспадаркі на ваенны лад.

Для рашэння задач эвакуацыі вытворчых сіл з прыфрантавых раёнаў на ўсход краіны быў створаны **Савет па эвакуацыі пры СНК СССР** у складзе Н.М. Шверніка (старшыня), А.М. Касыгіна, А.І. Мікаяна. Усяго летам і восенню 1941 г. было вывезена ў тылавыя

раёны звыш 10 млн чал. і 1523 прамысловыя прадпрыемствы. З тэрыторыі Беларусі ва ўсходнія раёны краіны было адпраўлена абсталяванне і кадры 124 буйных прамысловых прадпрыемстваў і каля 1,5 млн жыхароў. Раёнамі размяшчэння беларускай прамысловасці сталі Паволжа (47 заводаў і фабрык), Урал (35), сярэдняя паласа РСФСР (28), Заходняя Сібір (8) і інш. На час вайны ўводзіліся надзвычайныя меры: рабочы дзень – 12 гадзін, адмяняліся водпускі, выхадныя і святочныя дні, шырока выкарыстоўвалася праца жанчын і падлеткаў, прадугледжвалася строгая адказнасць за невыкананне нормы, забаранялася самавольнае пакіданне прадпрыемстваў без дазволу адміністрацыі. У лютым 1942 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў Указ «Аб мабілізацыі на перыяд ваеннага часу працаздольнага гарадскога насельніцтва для работы на вытворчасці і будаўніцтве». Мабілізаваным лічылася ўсё працаздольнае гарадское насельніцтва – мужчыны ва ўзросце ад 16 да 55 гадоў і жанчыны ва ўзросце ад 15 да 45 гадоў. Да станка стала звыш мільёна служачых цэнтральных дзяржаўных устаноў. На вытворчасць вярнуліся старыя кадравыя рабочыя – пенсіянеры. Без адрыва ад вучобы працавалі сотні тысяч студэнтаў і школьнікаў. Паўмільёна рабочых штогод рыхтавалі школы і вучылішчы сістэмы працоўных рэзерваў.

Дзякуючы намаганням дзяржавы, рабочага класа і інжынерна-тэхнічных работнікаў да снежня 1941 г. работа прамысловасці наладзілася, падзенне вытворчасці было спынена. У пачатку 1942 г. вызначыўся агульны рост прамысловай вытворчасці. Калі ў першай палове 1941 г. вытворчасць танкаў складала 1800 адзінак, то ў другой палове гэтага ж года – 4 700, а ў 1942 г. – 25 тыс. танкаў. Сур’ёзным чынам перабудавалася работа ўсіх відаў транспарта і перш-наперш чыгуначнага. Чыгуначны і водны віды транспарту былі ваенізаваны. На транспарце пачаў дзейнічаць ваенны дысцыплінарны статут. На

Бібліотека БГУИР

ўсіх чыгунках быў устаноўлены строгі графік першачарговых і спецыяльных ваенных маршрутаў.

Цяжкія задачы ў час вайны вырашалі работнікі сельскай гаспадаркі. У выніку часовай акупацыі фашысцкімі захопнікамі шэрагу раёнаў еўрапейскай часткі краіны, дзе да вайны пражывала больш 80 млн чал., СССР пазбавіўся 47 % усіх пасяўных плошчаў, 38 % валавой прадукцыі збожжа, 84 % цукру, 38 % агульнага пагалоўя буйной рагатай жывёлы і 60 % пагалоўя свіней. Увесь цяжар нялёгкай працы лёг на плечы жанчын і падлеткаў, для аказання дапамогі вёсцы шырока выкарыстоўвалася гарадское насельніцтва. У лістападзе 1941 г. былі створаны палітаддзелы ў МТС і саўгасах. Прымаліся меры па далейшаму пад'ёму збожжавай гаспадаркі ў калгасах і саўгасах усходніх абласцей СССР.

Агульная колькасць насельніцтва СССР, па ўдакладненых дадзеных, да пачатку Вялікай Айчыннай вайны складала каля 200 млн чал., у тым ліку 133,6 млн – сельскае насельніцтва. Да канца 1941 г. у краіне была ўведзена картачная сістэма забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання. Насельніцтва вёскі, звязанае з сельскай гаспадаркай, на дзяржаўнае забеспячэнне прадуктамі харчавання не ставілася. Гарантаваныя нормы забеспячэння хлебам устанаўліваліся толькі для сельскай інтэлігенцыі, эвакуіраваных, работнікаў савецкага і партыйнага звяна, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Асноўнай крыніцай харчавання для сялянскай сям'і сталі прысядзібныя дзялянкі, у большасці калгасаў прадукты на працадні не выдаваліся. На працягу 1942 г. была ўведзена картачная сістэма забеспячэння прамысловымі таварамі насельніцтва ўсіх гарадоў і рабочых пасёлкаў.

Такім чынам, да сярэдзіны 1942 г. завяршылася перабудова на ваенны лад народнай гаспадаркі СССР. Да канца 1942 г. была вырашана задача стварэння хуткароставай ваеннай гаспадаркі, якая



Библиотека БГУИР

забяспечвала армію самым сучасным узбраеннем і баявой тэхнікай. За кароткі тэрмін Савецкі Саюз ператварыўся ў адзіны баявы лагер.

## Лекцыя 4. Баявыя дзеянні на франтах. Маскоўская бітва. Крах «бліцкрыга»

### *План*

1. Баявыя дзеянні на франтах. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.
2. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам – восенню 1941 г.
3. Ваенна-палітычнае і міжнароднае значэнне разгрома нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой.

**1. Баявыя дзеянні на франтах. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.** З першых дзён вайны тэрыторыя Беларусі, як і тэрыторыя іншых прыгранічных раёнаў СССР, стала арэнай жорсткіх баявых дзеянняў. Гераічна змагаліся з ворагам пагранічнікі, лётчыкі, прадстаўнікі ўсіх родаў войск. Паміралі, але не пакідалі баявыя пазіцыі воіны пагранічных застаў, якімі камандавалі афіцэры М.К. Ішкоў, А.М. Кіжаватаў, І.Г. Ціханаў. 22 чэрвеня 1941 г. на паўночным захадзе ад Гродна 3-я пагранзастава пад камандаваннем начальніка заставы лейтэнанта В.М. Усава 10 гадзін адбівала атакі пераўзыходзячых сіл праціўніка, каля вёскі Галавенчыцы байцы 1-й пагранзаставы на чале з малодшым лейтэнантам А.М. Сівачовым 11 гадзін вялі няроўны бой, каля вёскі Драгунь 5 варожых атак адбілі пагранічнікі 4-й заставы на чале з лейтэнантам Ф.П. Кірычэнка, амаль усе пагранічнікі загінулі ў баях. Лётчыкі П.С. Рабцаў, А.С. Данілаў, С.М. Гудзімаў, Д.В. Кокараў таранілі варожыя самалёты. На працягу першага дня вайны ў паветраных баях было збіта больш за 100 нямецкіх самалётаў.

Усяму свету вядома гераічная абарона Брэсцкай крэпасці. У поўным акружэнні, без вады і ежы, пры вострай нястачы

Библиотека БГУИР

боепрыпасаў і медыкаментаў гарнізон крэпасці больш месяца змагаўся з ворагам. Абаранялі цытадэль над Бугам прадстаўнікі больш 30 нацыянальнасцей СССР. Аб мужнасці салдат і афіцэраў сведчаць надпісы, якія захаваліся на сценах крэпасці: «Нас было трое, нам было цяжка, але мы не палі духам і паміраем як героі», «Паміраю, але не здаюся! Бывай, Радзіма!». Абаронцаў узначальвалі камандзіры і палітработнікі: у тым ліку маёр П.М. Гаўрылаў, капітан І.М. Зубачоў, палкавы камісар Я.М. Фамін, капітан У.У. Шаблоўскі, лейтэнант А.М. Кіжаватаў, палітрукі П.П. Кашкароў, С.С. Скрыпнік, сержант Т.Г. Грабянюк і інш, у асобных выпадках – радавыя байцы. Яны здолелі згуртаваць сілы абаронцаў і стварыць з іх баявыя групы і атрады. За бессмяротны подзвіг, які здзейснілі абаронцы Брэсцкай крэпасці, ёй было прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-герой».

Савецкія войскі вялі цяжкія баі ў раёне Гродна, Ваўкавыска, Кобрына, Пружан. Абодва бакі неслі значныя страты.

26 і 27 чэрвеня 1941 г. напружаныя баі разгарнуліся на подступах да беларускай сталіцы. Яе абарона была ўскладзена на войскі 44-га стралковага корпуса. Салдаты і афіцэры 100-й стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр І.М. Русіянаў) мужна адбівалі атакі ворага каля Астрашыцкага гарадка, што бліз Мінска. Яны ўмела выкарыстоўвалі для барацьбы з варожымі танкамі звязкі гранат і бутэлькі з гаручай сумессю.

У баях за Мінск каля Радашковіч здзейсніў свой гераічны подзвіг экіпаж бамбардзіроўшчыка пад камандаваннем капітана М.Ф. Гастэлы. Свой падбіты самалёт ён накіраваў у калону нямецкіх танкаў і аўтамашын.

У сувязі з пагрозай захопу Мінска нямецка-фашысцкімі войскамі 25 чэрвеня 1941 г. ЦК КП(б)Б і ўрад Беларусі эвакуіраваліся з Мінска ў Магілёў. Тры дні – 25 – 27 чэрвеня Мінск быў у руках ваенных, цывільнай улады не было, фактычна ў горадзе панавала безуладдзе.



Библиотека БГУИР

Нягледзячы на мужнасць і гераізм савецкіх салдат і афіцэраў, 28 чэрвеня 1941 г. нямецка-фашысцкія войскі захапілі Мінск. У гіганцкім катле на захад ад беларускай сталіцы, у трохвугольніку Мінск – Беласток – Брэст у акружэнні ворага апынуліся амаль цалкам злучэнні 3 і 10-й армій, частка сіл 4 і 13-й армій, было захоплена шмат баявой тэхнікі, зброі, вайсковай маёмасці. 323 тыс. салдат і камандзіраў апынуліся ў нямецкім катле. Толькі частка воінаў змагла прабіцца з акружэння, а частка засталася ў лясах і потым перайшла да партызанскай барацьбы. Людскія страты войск Заходняга фронту і Пінскай ваеннай флаціліі склалі 418 тыс. чал.

Адказнасць за адступленне савецкіх войск, вялізныя людскія і матэрыяльныя страты нясуць І.В. Сталін і яго бліжэйшае акружэнне, Наркамат абароны і Генеральны штаб Узброеных Сіл СССР, камандаванне Заходняга фронту, камандзіры палкоў, дывізій, карпусоў, воінскіх злучэнняў. Але абвінавачванне было ўскладзена толькі на камандаванне Заходняга фронту і камандзіраў воінскіх злучэнняў. Камандуючага фронтам Дз. Паўлава, начальніка штаба В. Клімаўскіх, начальніка сувязі А. Грыгор’ева, камандуючага 4-й арміяй А. Карабкова і іншых военачальнікаў згодна з прыгаворам Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 22 ліпеня 1941 г. расстралялі.

У складанай ваенна-стратэгічнай сітуацыі ў ліпені 1941 г. войскі Заходняга фронту ажыццявілі шэраг контрудараў. 6 ліпеня войскі 20-й арміі пад камандаваннем генерала П.А. Курачкіна нанеслі контрудар у напрамку Сянно – Лепель і адкінулі ворага на 30 – 40 км. Адбыўся адзін з буйнейшых у пачатковым перыядзе вайны танкавых баёў, у якім з абодвух бакоў дзейнічала больш за 1500 машын. 13 ліпеня войскі 63-га корпуса пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Л.Р. Пятроўскага фарсіравалі Днепр, вызвалілі Жлобін і Рагачоў і пачалі развіваць наступленне на Бабруйск. 22 ліпеня пачаўся



Библиотека БГУИР

12-дзённы рэйд па тылах ворага кавалерыйскай групы генерала А.І. Гарадавікова. Былі вызвалены Глуск, Старыя Дарогі, нанесены раптоўны ўдар па Асіповічах. 30 ліпеня быў вызвалены Крычаў. Аднак не падтрыманыя агульным наступленнем контрудары поспеху не мелі.

Выключна напружанымі былі баі на рубяжы Дняпра. 14 ліпеня 1941 г. пад Оршай упершыню нанесла магутны ашаламляльны ўдар па ворагу батарэя рэактыўных установак («кацюша») пад камандаваннем капітана І.А. Флёрава.

На працягу 23 дзён стрымлівалі савецкія войскі націск ворага пад Магілёвам. Непасрэдна абарона горада была ўскладзена на 172-ю стралковую дывізію пад камандаваннем генерал-маёра М.Ц. Раманава. Салдаты і афіцэры мужна змагаліся з браніраванымі полчышчамі танкавай групы Гудэрыяна. Разам з воінамі горад абаранялі атрады народнага апалчэння. Толькі пасля таго як Магілёў быў акружаны фашыстамі, яго абаронцы прарвалі варожае кальцо і адыйшлі на ўсход.

Больш месяца ішлі баі за Гомель. Разам з воінамі супраць ворага змагаўся гомельскі полк народнага апалчэння. 19 жніўня 1941 г., прарваўшы абарону ў раёне Добруша, гітлераўцы ўварваліся ў Гомель.

Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі апынулася пад нямецка-фашысцкай акупацыяй.

Паўночна-Заходні фронт таксама панёс вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы і не здолеў арганізаваць устойлівую абарону. 9 ліпеня 1941 г. салдаты варожай групы армій «Поўнач» узялі Пскоў. Абазначылася небяспека іх прарыву да Лугі, а далей да Ленінграда. У сярэдзіне верасня немцы выйшлі да Фінскага заліва.

Лепшая сітуацыя склалася на Паўднёва-Заходнім фронце пад камандаваннем М. Кірпаноса. Фронту ўдалося скаваць пад Кіевам, на

Библиотека БГУИР

рубяжы Дняпра варожую групу армій «Поўдзень». Стабілізаваўся фронт у Карэліі. Жорсткія баі ў другой палове ліпеня разгарнуліся ў раёне Смаленска і ў міжрэччы Дняпра і Бярэзіны.

У такіх умовах група армій «Цэнтр» не змагла выйсці на стратэгічную прастору, каб рухацца на Маскву. 30 ліпеня 1941 г. Гітлер аддаў загад групе армій «Цэнтр» перайсці да абароны. 2-я танкавая група і 2-я палявая армія былі павернуты з усходняга накірунку на поўдзень з тым, каб нанесці ўдар у тыл Паўднёва-Заходняму фронту, які ўтрымліваў рубеж Дняпра і абараняў Кіеў.

25 – 30 жніўня немцы выйшлі да Дняпра і, за выключэннем невялікіх плацдармаў у раёне Кіева і Адэсы, захапілі Правабярэжную Украіну. 9 верасня 1941 г. немцы фарсіравалі Днепр і захапілі плацдарм у раёне Крамянчуга. 2-я танкавая група армій «Цэнтр» прарвала абарону Бранскага фронту ў раёне Канатопа. З'явілася пагроза акружэння войск Паўднёва-Заходняга фронту. Толькі 17 верасня І. Сталін дазволіў фронту пакінуць Кіеў. Аднак з прыняццем гэтага рашэння вышэйшае кіраўніцтва краіны спазнілася. 15 верасня танкавыя групоўкі, якія ішлі насустрач адна другой, у раёне Лохвіца – Лубны перахапілі камунікацыі Паўднёва-Заходняга фронту. У акружэнні апынулася 450 тыс. чал., у тым ліку 60 тыс. чал. каманднага складу. Прабіваючыся з акружэння, у баях загінулі камандуючы фронтам М. Кірпанос і начальнік штаба В. Тупікаў. Немцы атрымалі магчымасць аднавіць наступленне на Маскву.

На думку маршала Савецкага Саюза А. Васілеўскага, спазненне рашэння аб адводзе войск Паўднёва-Заходняга фронту абумоўлена наступнымі абставінамі: а) І. Сталін прыменшыў пагрозу акружэння і пераацаніў магчымасці фронту ліквідаваць яе ўласнымі сіламі; б) І. Сталін вельмі сур'ёзна ўспрыняў настойлівыя завярэнні камандуючага Бранскім фронтам А. Яроменкі ў безумоўнай перамозе над танкавай групоўкай Гудэрыяна, але гэтага не здарылася;

Библиотека БГУИР

в) Стаўка вымушана была больш-менш раўнамерна размяркоўваць сілы, не ведаючы дакладна месца канцэнтрацыі сіл праціўніка, гатовых для нанясення ўдара. На многіх участках фронту ў нашых войскаў не было ні другіх эшалонаў, ні буйных рэзерваў.

На думку нямецкага камандавання, захопу Масквы павінен быў папярэднічаць захоп Ленінграда. 30 жніўня 1941 г. немцы захапілі станцыю Мга, пасля чаго чыгуначная сувязь Ленінграда з краінай поўнасцю прыпынілася. Прарваўшыся да Нявы і захапіўшы Іванаўскае, вораг перарэзаў апошнюю шашу, якая выходзіла з Ленінграда. 8 верасня немцы ўзялі Шлісельбург і блакіравалі Ленінград з сушы. У гэты дзень у выніку налётаў варожай авіяцыі пажар знішчыў драўляныя сховішчы Бадаеўскіх складаў, на якіх захоўвалася некалькі тысяч тон мукі і цукру. У горадзе ў гэты час знаходзілася каля 2,5 млн жыхароў. Абвастрылася харчовая праблема. Была пракладзена дарога па лёдзе Ладажскага возера, па якой перавозіліся грузы і эвакуіраваліся людзі. Гераічная абарона Ленінграда працягвалася 900 дзён і начэй і стала сімвалам мужнасці і гераізму савецкага народа.

Ва ўмовах ваенных няўдач былі прыняты **надзвычайныя меры па ўмацаванні баяздольнасці Чырвонай Арміі**.

У ліпені 1941 г. у Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце ўводзіўся інстытут ваенных камісараў, які дзейнічаў ва ўсіх палках і дывізіях; у ротах, батарэях і эскадронах дзейнічаў інстытут палітрукоў. Разам з камандзірамі камісары і палітрукі неслі *«полную ответственность за выполнение войсковой частью боевой задачи, за её стойкость в бою и непоколебимую готовность драться до последней капли крови с врагами»*.

16 жніўня 1941 г. Стаўка выдае загад № 270, згодна з якім *«срывающих во время боя знаки различия и сдающихся в плен считать злосными дизертирами, семьи которых подлежат аресту*



Библиотека БГУИР

*как семьи нарушивших присягу и предавших Родину».* Дэзерціраў расстрэльвалі на месцы. Гэта рабілі створаныя ў ліпені 1941 г. асобыя аддзелы НКУС, замест якіх у красавіку 1943 г. у складзе наркамата абароны СССР было арганізавана Упраўленне контрразведкі «СМЕРШ».

Для недапушчэння несанкцыянаваных камандаваннем адыходаў і панікі па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў верасні 1941 г. у кожнай стралковай дывізіі ўводзіліся загараджальныя атрады колькасцю да батальёна. У крайніх выпадках ім дазвалялася прымяняць зброю супраць «одержимых паникой военнослужащих».

3 ліпеня 1941 г. Ф. Гальдар у дзённіку запісаў: *«Не будет преувеличением, если я скажу, что поход против России был выигран в течение 14 дней».* Безумоўна, вораг з заявай аб перамозе паспяшаўся. Але для СССР сітуацыя склалася крытычная. Над краінай навісла смяротная небяспека.

**2. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам – восенню 1941 г.** Як магло здарыцца, што Чырвоная Армія ў пачатковы перыяд вайны пацярпела паражэнне?

**Прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі былі абумоўлены шэрагам эканамічных, палітычных і ваенных фактараў – аб’ектыўных і суб’ектыўных.**

Пачнем з разгляду **аб’ектыўных фактараў няўдач Чырвонай Арміі**.

1. Да пачатку Другой сусветнай вайны Германія з дапамогай іншых капіталістычных краін стварыла магутную ваенную эканоміку, перабудавала сваю гаспадарку на ваенны лад, разгарнула масавую вытворчасць усіх відаў сучасных узбраенняў. Да таго ж фашысты распараджаліся рэсурсамі 12 краін Еўропы. Перад нападзеннем на СССР ваенна-эканамічны патэнцыял і людскія рэсурсы Германіі, яе

Библиотека БГУИР

васалаў і захопленых краін у некалькі разоў перавышалі ваенна-эканамічны патэнцыял і людскія рэсурсы Савецкага Саюза.

2. Пасля заваявання Еўропы фашысцкая Германія мела вопытную, правераную ў баях армію, якая знаходзілася ў поўнай баявой гатоўнасці, добра наладжаную работу штабоў, адпрацаванае амаль па гадзінах узаемадзеянне пяхоты, артылерыі, танкаў і авіяцыі. Нямецка-фашысцкая армія была сканцэнтравана ў трох моцных кампактных групоўках, разгорнутых уздоўж заходніх граніц СССР, добра забяспечана тэхнічна, амаль поўнасцю матарызавана, чаму ў значнай ступені садзейнічала трафейная тэхніка і ўзбраенні, захопленыя ў акупаваных краінах Еўропы. Вермахт выкарыстаў узбраенне і тэхніку 180 дывізій (92 нямецкія дывізіі былі забяспечаны трафейнымі аўтамашынамі). Толькі ў Францыі фашысцкія войскі захапілі да 5 тыс. танкаў і бронетранспарцёраў і 3 тыс. самалётаў.

Чырвоная Армія не мела багатага вопыту вядзення сучаснай вайны. Больш таго, не было зроблена глыбокага аналізу ваенных аперацый Германіі супраць Польшчы і Францыі. У снежні 1940 г. нарком абароны С.К. Цімашэнка заявіў: *«В смысле стратегического творчества опыт войны в Европе, пожалуй, не даёт ничего нового»*. Хаця па колькасці танкаў і самалётаў мы пераўзыходзілі Германію (у СССР к чэрвеню 1941 г. было 7,6 тыс. танкаў і 17 тыс. самалётаў, у Германіі – 6 тыс. танкаў і 10 тыс. самалётаў), аднак іх большую частку складалі машыны старых канструкцый, з выпрацаваным рэсурсам, якія патрабавалі рамонта ці спісання. Напрыклад, у агульным парку баявых самалётаў 82,7 % складалі старыя тыпы. У пачатку вайны ў савецкіх войсках было недастаткова супрацьтанкавых і зенітных установак, сродкаў сувязі і транспарта. Дрэнна было і з боепрыпасамі.

3. Значныя ваенныя сілы Савецкі Саюз быў вымушаны трымаць на Далёкім Усходзе (40 дывізій – супраць японскіх мілітарыстаў) і ў

Библиотека БГУИР

Закаўказзі (супраць пагрозы з боку Турцыі). У сувязі з гэтым Савецкі Саюз не ў стане быў усе сілы і сродкі накіраваць на адпор гітлераўскай навале.

Побач з аб’ектыўнымі прычынамі існавалі і **суб’ектыўныя прычыны** няўдач Чырвонай Арміі. Вось некаторыя з іх.

1. Няўдачы Чырвонай Арміі тлумачацца не толькі тым, што савецкія войскі былі атакаваны нечакана, што яны былі вымушаны ўступаць у бой без патрэбнага стратэгічнага разгортвання, што многія палкі і дывізіі не былі ўкамплектаваны па штатах ваеннага часу, мелі абмежаваныя матэрыяльныя і транспартныя сродкі і сродкі сувязі, часта дзейнічалі без паветранай і артылерыйскай падтрымкі. Апошняе нельга пераацэньваць, бо 22 чэрвеня 1941 г. падвергліся ўдарам толькі 30 савецкіх дывізій першага эшалона арміі прыкрыцця. Трагедыя паражэння галоўных сіл Заходняга, Паўночна-Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў выявілася ў час контрбітваў 23 – 30 чэрвеня 1941 г. паміж новай і старой граніцамі.

Ход прыгранічных бітваў паказаў, што **нашы войскі на ўсіх узроўнях – ад Стаўкі Галоўнага Камандавання да камсастава тактычнага звяна не былі падрыхтаваны да вядзення сучаснай вайны з масавым выкарыстаннем артылерыі, танкаў, авіяцыі.** Авалодваць навыкамі вядзення сучаснай вайны Чырвонай Арміі прыйшлося ў ходзе бітваў з вялікімі стратамі ў жывой сіле і тэхніцы. Недахопы ў баегатоўнасці нашых войск, якія былі выяўлены ў бітвах каля воз. Хасан, на р. Халхін-Гол і ў савецка-фінскай вайне, не былі і не маглі быць ліквідаваны ў кароткі тэрмін. У 1937 г. былі расфарміраваны механізаваныя карпусы, што не адпавядала патрабаванням сучаснай вайны. Толькі ў 1940 г. іх зноў пачалі ствараць, але да пачатку вайны іх фарміраванне не здолелі завяршыць. Не было завершана таксама фарміраванне авіяцыйных злучэнняў і ўзбраенне іх навейшай тэхнікай, тэхнічнае пераўзбраенне

Бібліятэка БГУИР

ўсёй Чырвонай Арміі. Галоўная ўвага ў баявой вучобе надавалася пяхоце. Падрыхтоўцы бронетанкавых войск і авіяцыі, узаемадзеянню родаў войск у сучаснай вайне такой увагі не надавалася. У германскай арміі, наадварот, на полі боя назіралася ўзаемадзеянне танкаў з пяхотай, артылерыяй і авіяцыяй.

2. Негатыўную ролю адыгралі пралікі Сталіна і яго бліжэйшага акружэння ў ацэнцы ваенна-стратэгічнай сітуацыі і ў вызначэнні магчымых тэрмінаў нападзення Германіі на СССР. Лічылася, што спачатку Германія разаб'е Англію, затым магчымы ваенны паход на Блізкі і Сярэдні Усход і толькі пасля гэтага яна можа пачаць вайну супраць СССР. Паварот у палітыцы фашысцкай Германіі, звязаны з фактычнай адмовай ад дагавору аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г., савецкімі кіраўнікамі не быў своечасова заўважаны, таму лічылася, што ваеннае сутыкненне з ёю можна адцягнуць. Інфармацыя аб блізкасці вайны, якая паступала ад разведчыкаў (разведка называла супярэчлівыя даты пачатку вайны: 14 і 15 мая, 20 і 21 мая, 15 чэрвеня, 22 чэрвеня...), дыпламатаў, ваенных аташэ і іншых афіцыйных асоб, ігнаравалася. У гэтай сувязі прадстаўляе інтарэс дакладная запіска Берыі Сталіну ад 21 чэрвеня 1941 г. У ёй гаварылася: *«Я вновь настаиваю на отзыве и наказании нашего посла в Берлине Деканозова, который по-прежнему бомбардирует меня «дезой» о якобы готовящемся Гитлером нападении на СССР. Он сообщил, что это «нападение» начнётся завтра.*

*То же радировал и генерал-майор В.И. Тупиков, военный атташе в Берлине. Этот тупой генерал утверждает, что три группы армий вермахта будут наступать на Москву, Ленинград и Киев, ссылаясь на свою берлинскую агентуру…*

*Начальник разведуправления генерал-лейтенант Ф.И. Голиков жалуется на Деканозова и на своего подполковника Новобранца,*

Библиотека БГУИР

*который тоже врёт, будто Гитлер сосредоточил 170 дивизий против нас на нашей западной границе.*

*Но я и мои люди, Иосиф Виссарионович, твёрдо помним Ваше мудрое предначертание: в 1941 г. Гитлер на нас не нападёт! ...»*

Як адзначае пісьменнік В.В. Карпаў у кнізе «Генералиссимус: Историко-документальное издание» (М., 2002, с.356), перад вайной была вялікая вера ў Сталіна, яго палітычны розум, яго дальнабачнасць і здольнасць знаходзіць выхады з самых цяжкіх сітуацый. Верылі ў яго здольнасць пазбегнуць вайны, адсунуць яе на больш позні час. Пісьменнік спасылаецца пры гэтым на савецкага палкаводца Г.К. Жукава, які пісаў: *«Тревога грызла душу. Но вера в Сталина ... была сильней. И как бы ни смотреть на это сегодня – это правда...»*.

І ўсё-такі перад пагрозай вайны наркамату абароны ўдалося дабіцца ад Сталіна дазволу часткова прызваць у армію паўмільёна запасных і перадыслакаваць у заходнія ваенныя акругі дадаткова чатыры арміі. Дазволу на прывядзенне ў баявую гатоўнасць войск прыгранічных акруг Сталін не даў, мяркуючы, што такая мера ўсхвалюе Гітлера і справакуе немцаў на ўзброенае сутыкненне. У сувязі з гэтым усялякая ініцыятыва з боку камандуючых войскамі акруг, арміямі і флатамі па прывядзенню ў баявую гатоўнасць часцей і злучэнняў не дазвалялася. Пры парушэнні германскімі самалётамі паветранай прасторы СССР (толькі за першую палову 1941 г. было зарэгістравана 324 парушэнні) катэгарычна забаранялася іх збіваць. За дзесяць дзён да фашысцкага нападзення ўсім камандуючым прыгранічнымі акругамі было прыказана *«во избежание могущих быть провокаций запретить полёты нашей авиации в 10-километровой пограничной полосе»*.

Толькі ў ноч на 22 чэрвеня 1941 г. пад ціскам новых звестак І. Сталін дазволіў наркамату абароны даць у акругі дырэктыву аб

Библиотека БГУИР

магчымым нечаканым нападзенні немцаў 22 – 23 чэрвеня і аб прывядзенні ўсіх часцей у поўную баявую гатоўнасць. Аднак у войскі дырэктыва паступіла з вялікім спазненнем, фактычна пасля з'яўлення ворага на савецкай тэрыторыі.

3. Няўдачы Чырвонай Арміі былі абумоўлены **памылковасцю савецкай ваеннай дактрыны, недахопамі і пралікамі ў стратэгічнай і тактычнай падрыхтоўцы савецкіх войск.** У адпаведнасці з савецкай ваеннай дактрынай агрэсар павінен быць абяскроўлены і затрыманы на граніцы ў выніку кароткатэрміновых, непрацяглых прыгранічных баёў. Затым вайна пераносіцца на тэрыторыю агрэсара. Чырвоная Армія толькі наступае, робіць гэта паспяхова, знішчае ворага ў яго логаве і дабіваецца перамогі. **Вайна вядзецца на чужой тэрыторыі і малой крывёю.** У сувязі з гэтым Чырвоная Армія рыхтавалася да вядзення вайны ва ўмовах наступлення і не ўмела весці вайну ў абароне. У савецкага камандавання адсутнічаў надзейны план стратэгічнай абароны, а ў пачатку вайны прышлося менавіта абараняцца. На жаль, камандзіры і салдаты не ўмелі рабіць гэта прафесійна.

Вышэйшае савецкае кіраўніцтва ў першай палове 1941 г. з цэнтральных рэгіёнаў СССР на тэрыторыі Беларусі, Украіны і Прыбалтыкі перадыслакавала 4 арміі, перакінула вялікую колькасць баявой тэхнікі, боепрыпасаў, гаруча-змазачных матэрыялаў, ваеннага рыштунку з тым, каб на выпадак агрэсіі прыпыніць ворага на граніцы, а затым, у адпаведнасці з ваеннай дактрынай, перанесці баявыя дзеянні на тэрыторыю агрэсара.

Факт канцэнтрацыі савецкіх войск і ўзбраенняў каля заходніх граніц былы афіцэр разведкі, здраднік Рэзун (Сувораў) выкарыстоўвае ў сваёй кнізе «Ледакол» для абвінавачвання кіраўніцтва СССР у развязванні вайны. Гітлер, па Рэзуну, справакаваны Сталіным, нанёс прэвентыўны, апераджальны ўдар, бо

калі б ён гэтага не зрабіў, СССР напаў бы на Германію. Рэзун нічога новага не сказаў. Ён перапісаў словы Гітлера, сказаныя ім у свой час у звароце да салдат Усходняга фронту. Ніякіх навуковых доказаў і аргуметаў Рэзун не прыводзіць. Яго сцвярджэнне з’яўляецца галаслоўным, надуманым.

4. **Недахоп кадравага, прафесійнага каманднага складу і прафесійных штабоў, ад Стаўкі, наркамата абароны і генштаба да камандзіраў палкоў, батальёнаў і начальнікаў штабоў палкоў, адсутнасць у іх неабходных ваенных ведаў і баявога вопыту** – яшчэ адна з прычын няўдач Чырвонай Арміі. Да пачатку вайны 70 % начальніцкага складу Чырвонай Арміі мелі вопыт службы на пасадзе ад 1 да 6 месяцаў, 50 % камандзіраў батальёнаў і 68 % камандзіраў рот былі выпускнікамі 6-месячных курсаў, яны не закончылі нават ваеннага вучылішча. Толькі каля 15 % каманднага складу валодалі вопытам вядзення ваенных дзеянняў у 1938 – 1940 гг., а таксама ў Кітаі і Іспаніі. Не было неабходнага вопыта і ў Стаўкі. Яе загады любымі сродкамі ўтрымліваць займаемыя рубяжы нават ва ўмовага глыбокага флангавага абходу праціўніка часта станавіліся прычынай падстаўкі пад удары ворага цэлых груповак савецкіх войск. Гэта прыводзіла да вядзення бітваў ва ўмовах акружэння, вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы, а таксама узмацняла панічныя настроі.

Савецкія военачальнікі і камандзіры мелі лепшага ў свеце салдата, які ў час савецка-фінскай вайны 1939 – 1940 гг. пры 40-градусным марозе, 2-метровым пласце снегу, у лясістай мясцовасці з мноствам азер і рэк узяў штурмам лінію Манергейма. На думку экспертаў, гэтага зрабіць не здолеў бы ніводзін другі салдат свету. Савецкі салдат прадэманстраваў свае лепшыя якасці і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але ў пачатку яе па віне перш-наперш военачальнікаў і камандзіраў розных узроўняў ён быў вымушаны адступаць.

Библиотека БГУИР

5. Пятая прычына няўдач Чырвонай Арміі – **востры недахоп падрыхтаваных прафесійных малодшых камандзіраў (сяржантаў і старшынь) і малодшых афіцэрскіх кадраў – ад малодшага лейтэнанта да капітана ўключна.** Генералаў і вышэйшых афіцэрскіх кадраў, нягледзячы на рэпрэсіі, у Чырвонай Арміі хапала, а вось малодшых камандзіраў і малодшых афіцэрскіх кадраў адчуваўся востры недахоп. Гэта было выклікана павелічэннем Узброеных Сіл СССР з 1,9 млн чал. у 1939 г. да 5 млн чал. у пачатку 1941 г. пасля прыняцця 1 верасня 1939 г. Закона аб усеагульнай воінскай павіннасці. Калі ўзяць пяхотны полк у 1 500 чал. па штатах ваеннага часу, то вышэйшых афіцэраў (маёр – падпалкоўнік – палкоўнік) трэба было некалькі дзесяткаў, камандзіраў узводаў (малодшы лейтэнант – лейтэнант – старшы лейтэнант) больш за 60 чал., а сержантаў і старшынь – больш за 200 чал.

У сувязі з павелічэннем Узброеных Сіл СССР у 1941 г. ім дадаткова патрабавалася яшчэ 550 тыс. афіцэраў. Не генералаў і палкоўнікаў, а камандзіраў узводаў, рот і батальёнаў. На падрыхтоўку камандзіра стралковага ўзвода (лейтэнант) патрабавалася мінімум 3 гады (2 – у ваенным вучылішчы і хаця б 1 год у войсках). А каб мець камандзіра роты (капітана), патрэбна яшчэ 3 гады. У Чырвонай Арміі ніжэйшыя афіцэрскія пасады займалі людзі, якія не мелі ніякага вопыта службы. Справа ўскладнялася тым, што малодшых камандзіраў і малодшых афіцэраў рыхтавалі часта на кароткатэрміновых афіцэрскіх і сержанцкіх курсах з людзей з вельмі нізкім узроўнем агульнай адукацыі і культуры. Армія расла колькасна, а не якасна. Дакладна вядома, што ад малодшых камандзіраў і афіцэраў у многім залежаў поспех аперацыі на кожным канкрэтным участку фронту.

6. Шостая прычына няўдач Чырвонай Арміі – **велізарныя страты ў жывой сіле узбраеннях, і тэхніцы, панесеныя ўжо ў**



Библиотека БГУИР

**першыя тыдні і месяцы вайны**. Усяго, па дадзеных вермахта, у палон трапіла 5,7 млн савецкіх ваеннаслужачых, па дадзеных нашых архіўных служб – каля 4 млн чал. Акрамя таго, у першыя месяцы вайны былі страчаны шматлікія склады з баявой тэхнікай, боепрыпасамі, стралковай зброяй, вайсковым рыштункам, склады гаруча-змазачных матэрыялаў, што ствараліся паблізу тэатраў магчымых ваенных дзеянняў на тэрыторыі агрэсара, як таго патрабавала савецкая ваенная дактрына. Аднавіць страчанае ў кароткі тэрмін было немагчыма.

7. Роўна за тыдзень да пачатку вайны, 14 чэрвеня 1941 г. радыёвяшчанне і друк распаўсюдзілі паведамленне ТАСС аб тым, што *«Германия также неуклонно соблюдает условия советско-германского пакта о ненападении, как и Советский Союз, ввиду чего, по мнению советских кругов, слухи о намерении Германии порвать пакт и предпринять нападение на СССР лишены всякой почвы»*. У той час як германская прэса з пачатку 1941 г. не скупілася на правакацыйныя матэрыялы супраць СССР, спасылаючыся на кнігу Гітлера «Майн Кампф», савецкія газеты і часопісы друкавалі матэрыялы, у якіх амаль адсутнічала інфармацыя аб германскім фашызме, аб яго «новым парадку» ў Еўропе. Фактычна ў СССР забаранялася антыфашысцкая прапаганда і нават выказванні па адрасу Гітлера і Германіі. Такі **тон савецкага друку, а таксама паведамленне ТАСС ад 14 чэрвеня 1941 г. аб'ектыўна прытуплялі ў савецкага народа пачуццё пільнасці і не садзейнічалі яго мабілізацыйнай гатоўнасці напярэдадні і ў пачатку вайны. Нападзенне фашысцкай Германіі аказалася нечаканым для савецкага народа і яго Узброеных Сіл.**

8. У перадваенныя тыдні мелі месца факты, з якімі нельга было не лічыцца. Гэта частыя, адкрыта правакацыйныя пералёты нямецкімі самалётамі нашых граніц, перамяшчэнне на тэрыторыю СССР

дыверсійных і разведвальных груп, масавае высяленне германскімі ўладамі палякаў з прыгранічных раёнаў, падвоз пантонных сродкаў да рэк, выгрузка боепрыпасаў на грунт, зняцце дротавых загарод. Такога рода факты заўсёды служаць сігналам аб тым, што да нападзення ворага застаюцца ўжо не тыдні, а дні і нават гадзіны. І тым не менш ні палітычным кіраўніцтвам краіны, ні ваенным кіраўніцтвам правільных рашэнняў не было прынята.

У гэтым суровая праўда трагічнай гісторыі пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

**3. Ваенна-палітычнае і міжнароднае значэнне разгрома нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой.** 6 верасня 1941 г. Гітлер выдаў новую дырэктыву аб наступленні на Маскву. Галоўная стаўка ў ёй рабілася на танкавыя злучэнні і авіяцыю, асаблівая ўвага звярталася на скрытнасць падрыхтоўкі аперацыі. Спачатку прадугледжвалася разграміць савецкія войскі ў раёнах Вязьмы і Бранска, затым, знішчаючы адыходзячыя на Маскву злучэнні Заходняга фронту ў паласе ад верхняга цячэння Волгі да Акі, авалодаць сталіцай СССР.

Генеральнае наступленне на Маскву пачалося **30 верасня 1941 г. (аперацыя «Тайфун»)** ударам 2-й танкавай арміі ворага па леваму крылу Бранскага фронту, а 2 кастрычніка на пазіцыі войск Заходняга фронту абрушыліся асноўныя сілы немцаў. 7 кастрычніка 1941 г. немцы ў раёне Вязьмы завяршылі акружэнне 19-й, 20, 24 і 32-й армій. У «кацёл» пад Бранскам трапілі часці 3, 13 і 50-й армій. Па дадзеных айчынных гісторыкаў, у акружэнне папала 7 (з 15) палявых упраўленняў арміямі, 64 (з 95) дывізіі, 11 (з 13) танкавых брыгад, 50 (з 64) артпалкоў. Да сваіх з акружэння ўдалося прабіцца 34 савецкім дывізіям і 13 артпалкам. Ворага ўдалося прыпыніць на мажайскай лініі, прыкладна ў 100 – 110 км ад Масквы. Над сталіцай навісла смяротная пагроза.



Библиотека БГУИР

Цяжкія бai на маскоўскім накірунку разгарэліся 13 – 18 кастрычніка 1941 г. Немцамі ўзяты Мажайск, Малаяраславец і Таруса, узнікла пагроза выхада іх да Масквы. З раніцы 17 кастрычніка на бліжніх подступах да сталіцы стала займаць абарону народнае апалчэнне. Сюды ж былі накіраваны знішчальныя батальёны, якія да гэтага неслі патруліраванне горада. Прадпрыемствы Масквы перайшлі на работу ў тры змены.

На будаўніцтва абарончых збудаванняў і супрацьтанкавых ірвоў выйшла больш 500 тыс. масквічоў, 24 тыс. жыхароў сталіцы ўступілі ў войскі Маскоўскай супрацьпаветранай абароны. На вуліцах горада было ўстаноўлена 30 км надалбаў, 17 тыс. супрацьтанкавых і супрацьпяхотных «яжоў», 26 км барыкад і вялікая колькасць агнявых кропак.

19 кастрычніка 1941 г. ДКА аб'явіў Маскву на асадным становішчы. Частка цэнтральных урадавых і партыйных устаноў эвакуіравалася ў Куйбышаў (зараз Самара). У сталіцы заставаліся Палітбюро ЦК ВКП(б), СНК СССР, ДКА і Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання. Дакументальна не пацверджаны і не даказаны сцвярджэнні, якія з'явіліся ў асобных публікацыях, аб намеры І. Сталіна ў кастрычніку – лістападзе 1941 г. здаць Маскву фашыстам і аб зандзіраванні ім мірных адносін з Германіяй.

Да канца кастрычніка 1941 г. вораг быў спынены. Першае «генеральнае» наступленне нямецка-фашысцкіх войск на Маскву закончылася няўдачай. У гэтай сітуацыі 6 лістапада 1941 г. у падземнай зале станцыі метро «Плошча Маякоўскага» адбылося ўрачыстае пасяджэнне Маскоўскага Савета, на якім з дакладам аб 25-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі выступіў І.В. Сталін. На наступны дзень, 7 лістапада, на Краснай плошчы адбыўся традыцыйны парад савецкіх войск. І.В. Сталін звярнуўся да яго ўдзельнікаў з наступнымі словамі: *«...На вас*

Библиотека БГУИР

*смотрит весь мир, как на силу, способную уничтожить грабительские полчища немецких захватчиков. На вас смотрят порабощённые народы Европы, подпавшие под иго немецких захватчиков, как на своих освободителей. Великая освободительная миссия выпала на вашу долю. Будьте же достойными этой миссии! Война, которую вы ведёте, есть война освободительная, война справедливая. Пусть вдохновляет вас в этой войне мужественный образ наших великих предков – Александра Невского, Димитрия Донского, Кузьмы Минина, Димитрия Пожарского, Александра Суворова, Михаила Кутузова! Пусть осенит вас победоносное знамя великого Ленина!»* Войскі, якія ўдзельнічалі ў парадзе, з Краснай плошчы накіроўваліся ў бой.

**15 – 16 лістапада 1941** г. пачалося другое «генеральнае» наступленне нямецка-фашысцкіх войск на Маскву. Па задумцы гітлераўцаў магутныя танкавыя ўдары павінны былі ахапіць горад з поўначы і поўдня, а пяхотныя часці – нанесці франтальны ўдар. Да пачатку снежня 1941 г. вораг падышоў на 25 – 30 км да сталіцы. Упершыню за ўсю вайну ў канцы лістапада – пачатку снежня 1941 г. вораг сутыкнуўся з фактам свайго бяссілля перад праціўнікам, немагчымасці прарваць абарону савецкіх войск нягледзячы на выкарыстанне амаль усіх сваіх рэзерваў. Варожыя групоўкі ў пачатку снежня 1941 г. вымушаны былі прыпыніць наступленне.

Сканцэнтраваўшы буйныя сілы, Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання прыняла рашэнне аб пераходзе савецкіх войск у контрнаступленне, якое пачалі **5 – 6 снежня 1941 г**. войскі Заходняга, Калінінскага і Паўднёва-Заходняга франтоў агульнай працягласцю ў 800 км. Знішчаючы ворага, савецкія войскі да 23 лютага 1942 г. адкінулі ворагаў на захад на 350 – 400 км, вызваліўшы ад іх цалкам Маскоўскую і Тульскую вобласці, шэраг раёнаў Калінінскай (зараз Цвярской) вобласці. У баях за Маскву і



Библиотека БГУИР

Тулу вызначыліся стралковыя дывізіі, якімі камандавалі нашы землякі генералы У.Р. Вашкевіч і М.М. Макаўчук, а таксама падпалкоўнікі камандзіры злучэнняў А.А. Барэйка, Е.У. Дабравольскі, М.М. Мультан, І.Л. Рагуля, А.Д. Царашкоў, П.М. Чарнышоў.

Контрнаступленне савецкіх войск, якое пачалося пад Масквой, перарасло ў агульнае наступленне па ўсяму фронту. Яно працягвалася да красавіка 1942 г. 29 лістапада 1941 г. савецкія войскі вызвалілі Растоў-на-Доне. Разгром ударнай групоўкі праціўніка пад Ціхвінам (Ленінградская вобласць) сарваў план Гітлера і Маннергейма аб злучэнні нямецка-фашысцкіх і фінскіх войск для захопу Ленінграда.

Разгром нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой і паспяховае наступленне Чырвонай Арміі зімой 1941 – 1942 гг. мелі ваенна-палітычнае і міжнароднае значэнне. Перамога Чырвонай Арміі, **па-першае**, завяршыла крах гітлераўскай стратэгіі «бліцкрыга», маланкавай вайны супраць СССР. Надзеі кіраўніцтва фашысцкай Германіі на магчымасць дабіцца ў вайне супраць СССР хуткай перамогі і закончыць яе да восені 1941 г. цалкам праваліліся. Цяпер гітлераўская Германія вымушана была разлічваць на цяжкую і доўгую вайну.

**Па-другое**, разгром нямецка-фашысцкіх войск зімой 1941 – 1942 гг. канчаткова развеяў міф аб «непераможнасці» гітлераўскай арміі, моцна падарваў яе маральны дух і баяздольнасць. У войсках вермахта ўпершыню сталі з’яўляцца панічныя настроі, зніжацца дысцыпліна, а ў кіраўніцтве Германіі – рознагалоссе ў ацэнцы прычын паражэння пад Масквой і ў пытаннях далейшага вядзення вайны супраць СССР. Пазней гітлераўскія генералы назавуць бітву пад Масквой «катастрофай» і «пачаткам трагедыі на Усходзе». Разгром германскага вермахта пад Масквой быў першым буйным паражэннем «непераможнай арміі» у Другой сусветнай вайне і

Библиотека БГУИР

рашаючай ваенна-палітычнай падзеяй першага перыяда Вялікай Айчыннай вайны.

**Па-трэцяе**, перамога савецкіх войск пад Масквой натхніла народы міра на ўзмацненне вызваленчай барацьбы і партызанскага руху ў парабаваных германскім фашызмам і японскім мілітарызмам краінах Еўропы і Азіі, на актывізацыю руху Супраціўлення. Да восені 1942 г. былі створаны Нацыянальна-вызваленчы фронт у Грэцыі, Адзіны народна-вызваленчы фронт у Югаславіі, Нацыянальна-вызваленчы фронт у Албаніі, Фронт незалежнасці ў Бельгіі, Нацыянальны фронт у Францыі. У Югаславіі і Грэцыі ў 1941 – 1942 гг. былі створаны народна-вызваленчыя арміі на чале з камуністамі. Рух Супраціўлення аслабляў тыл гітлераўскай Германіі, зніжаў магчымасць поўнага выкарыстання эканамічнага патэнцыяла парабаваных краін, прымушаў фашыстаў пэўныя сілы выдзяляць на ахову транспартных камунікацый і барацьбу з партызанамі.

**Па-чацвёртае**, перамога савецкіх войск пад Масквой падзейнічала на ўрады Японіі і Турцыі, якія чакалі зручнага моманту для нападу на СССР. Гэтая перамога садзейнічала значнай змене сітуацыі на іншых тэатрах вайны, палегчыла, у прыватнасці, становішча Англіі на Міжземным моры і ў Афрыцы, зняла пагрозу ўварвання фашыстаў у Англію.

І, **нарэшце**, значэнне бітвы пад Масквой заключаецца ў тым, што яна рашаючым чынам падзейнічала на паскарэнне працэсу фарміравання антыгітлераўскай кааліцыі – ўнікальнага палітычнага дасягнення Другой сусветнай вайны.

12 ліпеня 1941 г. у выніку перагавораў у Маскве было падпісана савецка-англійскае пагадненне, па якому бакі абавязваліся аказваць адзін аднаму дапамогу і падтрымку ў вайне супраць Германіі. 2 жніўня 1941 г. урад ЗША прыняў рашэнне *«аказаць усё магчымае*

*эканамічнае садзеянне з мэтай умацавання Савецкага Саюза ў яго барацьбе супраць узброенай агрэсіі»*.

Акрамя агульных дэкларацый, урад СССР дабіваўся канкрэтызацыі пагадненняў. З гэтай мэтай з 29 верасня па 1 кастрычніка 1941 г. у Маскве праводзілася канферэнцыя трох краін – СССР, ЗША і Англіі, на якой абмяркоўваліся пытанні аб дапамозе СССР з боку саюзнікаў і аб узаемных пастаўках. ЗША і Англія абавязваліся з 1 кастрычніка 1941 г. да 30 чэрвеня 1942 г. штомесячна пастаўляць у СССР 400 самалётаў, 500 танкаў, 200 супрацьтанкавых ружжаў, матэрыялы ваеннага прызначэння. Савецкі ўрад абавязваўся пастаўляць сыравіну для вытворчасці ваеннай прадукцыі. Упершыню Савецкаму Саюзу быў прадастаўлены беспрацэнтны крэдыт на суму 1 млрд долараў. Канферэнцыя паскорыла прыняцце амерыканскім урадам рашэння аб распаўсюджанні на СССР **закона аб «ленд-лізе»** – сістэме перадачы ў арэнду ці ўзаймы іншым дзяржавам розных матэрыялаў, неабходных ім для абароны. (Аднак у 1941 – 1942 гг. пастаўкі па «ленд-лізу» праводзіліся павольна і ў нязначных памерах).

14 жніўня 1941 г. на нарадзе, якая праводзілася на ваенна-марской базе Арджэнцыя (в. Ньюфаундленд) была падпісана англа-амерыканская дэкларацыя аб мэтах вайны, атрымаўшая найменне «Атлантычная хартыя». Пры гэтым Савецкі Саюз як рэальная сіла на сусветнай арэне саюзнікамі не разглядаўся, таму ў тэксце дакумента не было ніводнага слова ні аб ім, ні аб савецка-германскім фронце. Па сутнасці, англа-амерыканская хартыя насіла сепаратны характар, была свайго роду палітычным кампрамісам, выражала прэтэнзію дзвюх дзяржаў на захаванне сусветнага панавання.

**7 снежня 1941 г**. Японія без аб’яўлення вайны напала на амерыканскую ваенна-марскую базу Пёрл-Харбар, размешчаную на Гавайскіх астравах. 8 снежня ЗША аб’явілі вайну Японіі. Тое ж самае

Библиотека БГУИР

зрабіла і Англія. 11 снежня Германія і Італія аб’явілі вайну ЗША. Зона Другой сусветнай вайны значна пашырылася.

**1 студзеня 1942 г**. у Вашынгтоне 26 дзяржаў антыфашысцкай кааліцыі, у тым ліку СССР, ЗША, Англія і Кітай, падпісалі «Дэкларацыю Аб’яднаных Нацый», па якой абавязваліся выкарыстоўваць усе свае ваенныя і эканамічныя рэсурсы для барацьбы супраць фашысцкага блока. Гэтыя дзяржавы, а таксама краіны, якія далучыліся пазней (у канцы вайны ў антыгітлераўскай кааліцыі налічвалася больш 50 краін), сталі называцца «Аб’яднанымі Нацыямі». Вялікім поспехам знешняй палітыкі СССР з’явілася падпісанне 26 мая 1942 г. дагавору з Англіяй і 11 чэрвеня 1942 г. пагаднення з ЗША аб саюзе ў вайне супраць фашысцкай Германіі. Гэтымі дакументамі быў канчаткова аформлены саюз СССР, ЗША і Англіі ў вайне. Працэс утварэння антыгітлераўскай кааліцыі завяршыўся.

Завяршаўся і першы перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Савецкі Саюз па-ранейшаму асноўны цяжар вайны нёс на сваіх плячах, па сутнасці, сам на сам супрацьдзейнічаў магутнай ваеннай арганізацыі Трэцяга рэйха. Другі фронт у Еўропе ЗША і Англіяй не быў адкрыты.

## Лекцыя 5. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі

### *План*

1. Ваенна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні акупацыйных улад на захопленых тэрыторыях.
2. Беларускі калабарацыянізм.

**1. Ваенна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні на захопленых тэрыторыях.** На акупіраваных тэрыторыях СССР хутка ўсталёўваецца германскі «новы парадак» – нацысцкая сістэма ваенных, палітычных, ідэалагічных і эканамічных мер у адносінах да мясцовага насельніцтва.



Бібліятэка БГУІР

Мэта акупацыйнага рэжыму на Беларусі– татальная эканамічная эксплуатацыя, паступовая каланізацыя яе тэрыторыі, германізацыя, высяленне і ў значнай ступені знішчэнне карэннага насельніцтва.

Ідэалагічная падстава палітыкі акупантаў – тэорыя аб «расавай выключнасці» нямецкай нацыі ў параўнанні з іншымі народамі. Яна сцвярджала неабходнасць пашырэння «жыццёвай прасторы» для немцаў, іх «правы» на сусветнае панаванне.

Як ужо адзначалася, у адпаведнасці з распрацаваным нацыстамі ў адносінах да насельніцтва захопленых тэрыторый планам **«Ост»** прадугледжвалася 75 % насельніцтва Беларусі знішчыць ці высяліць за Урал, 25 % анямечыць і прымусіць працаваць на немцаў-каланізатараў.

Для рэалізацыі плана ў рэйху было створана асобнае міністэрства па пытаннях усходніх тэрыторый на чале з А.Розенбергам.

У Беларусі пад нацысцкую акупацыю патрапіла каля 7 млн чал. (12,7 % ад колькасці жыхароў, якія апынуліся на захопленай тэрыторыі СССР). Беларускае насельніцтва спачатку не ўяўляла сабе ўсіх жахаў акупацыі. Людзі былі ў стане прыгнечанасці і разгубленасці, паводзілі сябе насцярожана. У некаторай часткі насельніцтва з'явіліся ілюзіі адносна «вызваленчай ролі Германіі». Але такіх было няшмат. Іх спадзяванні моцна пахіснуліся з увядзеннем жорсткага акупацыйнага рэжыму.

Фашысты знішчылі дзяржаўнасць беларускага народа і нават тэрытарыяльную цэласнасць рэспублікі. Тэрыторыя Літвы, Латвіі і Эстоніі, а таксама значная частка Беларусі (53 % ад перадваеннай тэрыторыі) былі ўключаны ў склад рэйхскамісарыятаў «Остланд» і «Украіна». Тэрыторыя Беларусі была падзелена на 5 частак:

1. Тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай, усходнія раёны Мінскай і некалькі раёнаў Палескай абласцей былі аднесены да вобласці армейскага **тылу групы армій «Цэнтр»**. Улада

Библиотека БГУИР

на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў руках камандавання ваенных і паліцэйскіх органаў. Вышэйшым органам на гэтай тэрыторыі быў штаб тылу групы армій «Цэнтр».

2. Паўднёвыя раёны Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей з абласнымі цэнтрамі Мазыр, Пінск, Брэст былі далучаны да рэйхскамісарыята **«Украіна»**, граніца якога праходзіла прыкладна за 20 км на поўнач ад чыгункі Брэст – Гомель.

3. Беластокскую, паўночныя раёны Брэсцкай, частку раёнаў Баранавіцкай абласцей гітлераўцы ўключылі ў склад **Усходняй Прусіі**.

4. Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі далучаны да **Генеральнай акругі Літва**.

5. У склад уласна Беларусі, ці, як яе акупанты называлі, **Генеральнай акругі Беларусь** (ГАБ), было ўключана 68 раёнаў з агульным лікам 192 сельскіх і 9 гарадскіх раёнаў, якія ўваходзілі ў склад БССР напярэдадні вайны. Агульная плошча ГАБ складала прыкладна чацвёртую частку тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3,1 млн чал. (на 04.12.41 г.), і была ўключана ў склад рэйхскамісарыята «Остланд» з рэзідэнцыяй у Рызе.

Генеральная акруга Беларусь падзялялася на 10 акруг (гебітаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Слонімскую, Слуцкую, Навагрудскую. Мінск з’яўляўся цэнтрам Генеральнай акругі Беларусь і выдзяляўся ў асобную акругу. Вышэйшым выканаўчым органам тут з’яўляўся Генеральны камісарыят Беларусі, які ўзначальваў **Вільгельм Кубэ**, а з верасня 1943 г. – групэнфюрэр войск СС **Курт фон Готберг**. Яму падпарадкоўваліся гебітскамісарыяты, штатскамісарыяты (гарады), артскамісарыяты (раёны). У воласцях прызначаліся валасныя старшыні, а ў вёсках – старасты. Іх работу кантралявалі прадстаўнікі акупацыйных улад.



Библиотека БГУИР

Узброенай апорай створанага рэжыму з’яўляліся акупацыйныя войскі вермахта – ахоўныя дывізіі. Яны забяспечвалі ахову камунікацый і ваенных аб’ектаў, лагераў ваеннапалонных, вялі барацьбу супраць партызан і насельніцтва. Для падтрымкі акупацыйнага рэжыму быў прыдадзены значны паліцэйскі апарат. Ён ствараўся з мясцовых людзей, якія перайшлі на бок немцаў. Пры гэтым пастаянны недахоп паліцэйскіх на Беларусі акупацыйныя ўлады кампенсавалі ўкраінскімі, літоўскімі і латышскімі паліцэйскімі батальёнамі. Каб утрымліваць пад кантролем тэрыторыю захопленай Беларусі, акупанты вымушаны былі трымаць тут ваенна-паліцэйскія сілы колькасцю да 160 тыс. чал. без уліку франтавых часцей.

На працягу ўсяго перыяду акупацыі фашысты планамерна ажыццяўлялі **палітыку генацыду – планамернага знішчэння цэлых груп насельніцтва па тых ці іншых матывах: з-за прыналежнасці да савецкіх актывістаў, камуністаў, яўрэяў і г.д.** Пры гэтым акупацыйныя ўлады выкарыстоўвалі сістэму мер: заложніцтва, аблавы, турмы, лагеры смерці, карныя аперацыі і інш.

Акупанты стварылі на тэрыторыі Беларусі сістэму турмаў і канцэнтрацыйных лагераў. Больш за 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі: для ваеннапалонных, для цывільнага насельніцтва, жаночыя лагеры, перасыльныя лагеры СС, штрафныя, гета. Адзін з першых лагераў смерці быў створаны ў в. Дразды каля Мінска, дзе ў ліпені – верасні 1941 г. ўтрымліваліся ваеннапалонныя і цывільныя асобы ва ўзросце ад 15 да 60 гадоў. Самым буйным не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй захопленай савецкай зямлі з’яўляўся Трасцянецкі лагер смерці. Тут было знішчана больш за 206 тыс. чал.

Адным з буйнейшых гарадскіх лагераў смерці было мінскае гета, створанае гітлераўцамі 19 ліпеня 1941 г. Гета было абнесена высокай агароджай з калючым дротам. Выходзіць з гета яўрэі маглі толькі на

Бібліятэка БГУІР

работу ці па спецыяльным дазволе. На спіне і грудзях яны павінны былі насіць жоўтыя зоркі. За парушэнне правілаў паграджаў расстрэл. На насельніцтва гета фашысты накладвалі кантрыбуцыі, зборам якіх займаўся яўрэйскі камітэт і яўрэйская паліцыя. У гады акупацыі ў мінскім гета сістэматычна паўтараліся пагромы. У выніку тут было знішчана каля 100 тыс. чал. Усяго на Беларусі існавала больш за 100 яўрэйскіх гета, у якія фашысты сагналі сотні тысяч яўрэяў – жыхароў рэспублікі і іншых краін.

Сродкам рэалізацыі планаў па знішчэнні насельніцтва былі **карныя аперацыі – тэрарыстычныя акцыі ваеннага, палітычнага і эканамічнага характару**. За гады акупацыі фашысты правялі больш як 140 карных аперацый, у ходзе якіх спалілі 5 454 населеныя пункты разам з усімі ці часткай жыхароў. Трагічны лёс *Хатыні* падзялілі **627** беларускіх вёсак. З вясны 1942 г. карныя аперацыі, іх арганізацыя і правядзенне набылі сістэматычны характар. Варварскія расправы з цывільным насельніцтвам, знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі сталі паўсядзённай практыкай гітлераўскіх захопнікаў.

Адной з праяў акупацыйнай палітыкі быў вываз насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію. У рэйху такіх людзей называлі **«ўсходнімі рабочымі» («остарбайтэрамі»)**, пазбавіўшы іх не толькі імя, але і нацыянальнасці.

На акупіраваных тэрыторыях вялася актыўная кампанія па прапагандзе нямецкага ладу жыцця і закліку на добраахвотную працу ў Германіі. Абяцалі добрыя ўмовы працы, высокую заработную плату, сацыяльную абарону. Аднак тыя, хто выехаў у Германію ў пачатку 1942 г., сутыкнуліся з неймаверна цяжкімі ўмовамі працы і побыту. Харчаванне «ўсходніх рабочых» было значна горшым за харчаванне рабочых іншых еўрапейскіх краін, заработная плата – малая, людзей дрэнна забяспечвалі рабочым адзеннем, за правіннасці



Библиотека БГУИР

накладваліся штрафы і ужываліся цялесныя пакаранні.

Колькасць жадаючых добраахвотна выехаць на работу ў Германію была нязначнай. У гэтых умовах акупанты з другой паловы 1942 г. пачалі прымусовы вываз рабочых. Мясцовым біржам было даручана весці ўлік працаздольнага насельніцтва, усталёўвалася штомесячная квота пастаўкі «остарбайтэраў». Людзей вывозілі ў таварных вагонах, па некалькі дзён яны не атрымлівалі харчавання і вады. Захопам насельніцтва займаліся армейскія часці, жандармерыя, атрады СС і СД, паліцыя. Камісія па зборы працоўнай сілы арганізоўвала прагляд новага фільма, збіраючы такім чынам людзей, потым іх акружалі і ўсіх працаздольных забіралі для адпраўкі ў Германію. Людзям не давалі нават развітацца з блізкімі, не дазвалялі нічога ўзяць з сабой. Былі выпадкі, калі войскі вермахта і паліцыі акружалі вёскі і забіралі ўсё насельніцтва. Пры аказанні супраціўлення расстрэльвалі.

Нават дзяцей фашысты прымушалі выконваць непасільную фізічную працу, марылі голадам, змяшчалі ў канцэнтрацыйныя лагеры, вывозілі на катаржныя работы ў Германію, у іх бралі кроў для параненых гітлераўскіх салдат. За час акупацыі з Беларусі ў Германію было вывезена 380 тыс. чал., у тым ліку больш за 24 тыс. дзяцей.

Эканамічная палітыка акупантаў мела каланіяльны характар. Часткай планаў фашыстаў з’яўлялася «гаспадарчае выкарыстанне СССР у інтарэсах эканомікі Германіі». З планаў вынікала, што выключнае значэнне для далейшага вядзення вайны будзе мець неадкладная і поўная эксплуатацыя захопленых абласцей у інтарэсах ваеннай эканомікі Германіі, у асаблівасці ў вобласці харчавання і нафтавай галіны.

Дзеля грабяжу і падрыву гаспадарчага патэнцыялу Беларусі існаваў спецыяльны штаб «Ольдэнбург», які каардынаваў збор прадукцыі. Усе захопленыя матэрыяльныя і людскія рэсурсы

Библиотека БГУИР

аб'яўляліся ўласнасцю рэйха. У Германію вывозілі каштоўнае абсталяванне з прадпрыемстваў, прадукты харчавання, лес, лесаматэрыялы. На Беларусі было высечана больш за 100 тыс. гектараў лесу. У рэйх адправілі 90 % станочнага і тэхнічнага абсталявання, больш за 9 тыс. трактароў, каля 20 тыс. аўтамашын.

Разам з тым акупацыйныя ўлады ў інтарэсах Германіі арганізоўвалі работу часткі прадпрыемстваў прамысловасці, транспарта, гандлю. У першую чаргу наладжвалася дзейнасць прадпрыемстваў, якія працавалі на патрэбы германскага вермахта. На тэрыторыі Беларусі была адноўлена праца некаторых прадпрыемстваў металургічнай, лёгкай і харчовай прамысловасці. Рабочыя і служачыя падвяргаліся жорсткай эксплуатацыі. Працоўны дзень складаў у сярэднім 12 гадзін.

Насельніцтва гарадоў рабавалі living рознымі падаткамі і паборамі. Харчовыя і прамысловыя тавары вывозіліся ў Германію. Немцы аддалі загад аб наладжванні «свабоднага гандлю». Хутка ўзніклі дробныя гандлёвыя прадпрыемствы. На рынку пераважаў натуральны тавараабмен: прадукты сельскай гаспадаркі абменьваліся на прамысловыя тавары. Цэны на ўсе тавары былі надзвычай высокімі. Акупацыйныя ўлады катэгарычна забаранілі продаж на рынках буйной рагатай жывёлы, коней. У заняпадзе знаходзілася камунальная гаспадарка гарадоў і сістэма аховы здароўя. Медыцынскую дапамогу аказвалі толькі за высокую плату. Таму ў акупіраваных гарадах была вялікая смяротнасць. Людзей ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў прымушалі працаваць на будоўлі абарончых аб'ектаў, мастоў, дарог. Пры гэтым у кожнай частцы Беларусі аплата працы была розная. У цэлым жа яе памеры не задавальнялі нават элементарныя патрэбы людзей.

У сувязі з правядзеннем аграрнай палітыкі акупанты аб'явілі ўсю калгасную маёмасць уласнасцю Германіі. Яны не дапускалі падзелу

Библиотека БГУИР

зямлі, не распускалі праўленні калгасаў, пакінулі іх старшынь і брыгадзіраў. У завяршаючы перыяд акупацыі (чэрвень 1943 – ліпень 1944) фашысты дазволілі передачу зямлі ва ўласнасць сялян. Аднак з фактычнай рэалізацыяй гэтага плана акупанты не спяшаліся. А тым часам у верасні 1943 г. савецкія войскі пачалі вызваляць першыя раёны Беларусі.

Увесь час акупацыі гітлераўцы бязлітасна грабілі беларускае сялянства. Яны абрабавалі 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасы. У Германію вывезлі больш за 1,6 млн т збожжа, каля 430 тыс. т мукі, значную колькасць сабранай бульбы і гародніны.

Эканамічны прыгнёт суправаджаўся духоўным. Фашысты знішчалі ці вывозілі ў Германію культурную і гістарычную спадчыну беларускага народа. Так, з будынкаў Акадэміі навук і Белдзяржвыдавецтва былі выкінуты як смецце і знішчаны шматлікія каштоўныя рукапісы беларускіх пісьменнікаў і вучоных. Многія рэдкія кнігі (у тым ліку збор старадрукаваных выданняў Ф. Скарыны, першае выданне Статута ВКЛ), карціны знакамітых мастакоў, калекцыі славутых слуцкіх паясоў былі вывезены ў Германію.

На акупіраванай тэрыторыі дзейнічала сістэма школьнай адукацыі. Вучэбны працэс меў яскравую прагерманскую накіраванасць і нацыянал-сацыялістычную сутнасць. У кожным класе абавязкова вывешваўся партрэт Гітлера, упрыгожаны з бакоў бела-чырвона-белымі сцягамі. Настаўнік, уваходзячы ў клас, вітаў вучняў узнятай правай рукой з воклічам «Хайль Гітлер» або «Жыве Беларусь». Вучні павінны былі ў такой жа форме адказваць настаўніку. Перад пачаткам урокаў праводзіліся гутаркі пра біяграфію Гітлера і яго паплечнікаў, аб жыцці народа ў «Новай Еўропе», перамогах войск вермахта. На ўроках прыроды вучні засвойвалі такія тэмы, як «Паняцце аб расах», «Характарыстыка рас», «Арыйская раса як вышэйшая культурная і цывілізаваная раса



Библиотека БГУИР

чалавецтва». На ўроках гісторыі вучні абавязваліся засвойваць тэмы «Беларусь і Германія», «Беларусь у будаўніцтве Новай Еўропы», «Жыццё Адольфа Гітлера» і інш. З канца 1941/1942 навучальнага года пачаў уводзіцца лацінскі алфавіт. В. Кубэ папярэджваў: *«Кожны бальшавіцкі ўплыў, што будзе выходзіць са школы, будзе карацца смерцю».*

На тэрыторыі акупіраванай Беларусі выходзілі газеты і часопісы. Напрыклад, у Мінску друкаваўся орган генеральнага камісарыята Беларусі «Урадавы веснік» на нямецкай і беларускай мовах. Вяліся перадачы радыё, дзейнічалі тэатры, кіно. Немцы выдалі загад, каб артысты Мінскага драмтэатра здалі экзамен па беларускай мове, а таксама вывучылі нямецкі гімн, маршы, вершы, прысвечаныя Гітлеру.

Такой у агульных рысах была сітуацыя ў перыяд германскай акупацыі.

З восені 1942 г., асабліва пасля разгрому пад Сталінградам, сярод нямецкага ваеннага камандавання і ў іншых сферах выказваліся думкі пра неабходнасць памякчэння акупацыйнай палітыкі. Памяншэнне жорсткасці ў адносінах да мясцовага насельніцтва павінна было заваяваць яго сімпатыі і паралізаваць волю да супраціўлення. Былі зроблены пэўныя ўступкі ў культурна-асветніцкай, адміністрацыйнай, ваеннай галінах. У пачатку 1943 г. Кубэ нават загаварыў пра захаваную на працягу тысячагадовай гісторыі так званую «нардычную кроў» у беларусаў. Аднак сутнасць акупацыйнага рэжыму ад гэтага не змянілася і фашыстам не ўдалося зламіць волю беларускага народа да супраціўлення.

**Вынікі акупацыі.** За гады акупацыі (1941–1944 гг.) Беларусь страціла палову свайго нацыянальнага багацця. Амаль поўнасцю былі знішчаны энергетычныя магутнасці, 90 % станочнага парку, на 40 % скараціліся пасяўныя плошчы, без даху над галавой засталося амаль 3 млн чал. Пасля вызвалення ў рэспубліцы налічвалася 60 тыс.

Библиотека БГУИР

дзяцей-сірот. Цалкам было знішчана 6 177 і часткова 2 648 школьных памяшканняў, 24 навуковыя ўстановы, 200 бібліятэк, 4 756 тэатраў і клубаў, 1 377 бальніц і амбулаторый, 2 188 дзіцячых устаноў. Ахвяраю фашысцкай палітыкі генацыду стала больш за чвэрць насельніцтва Беларусі.

**2. Беларускі калабарацыянізм.** Няўдачы вермахта на савецка-германскім фронце, нарастаючая барацьба ў тыле акупантаў вымушалі германскія ўлады шукаць падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва. Асобы, якія супрацоўнічалі з фашыстамі ў акупіраваных краінах у гады Другой сусветнай вайны, у гістарыяграфіі атрымалі назву **калабарацыяністаў**. Не была выключэннем і Беларусь. Акупанты стваралі розныя структуры грамадзянскай улады і вайскова-паліцэйскія фарміраванні, прыцягваючы ў іх пэўныя колы жыхароў.

У **кастрычніку 1941 г**. была створана так званая **Беларуская народная самапомач (БНС)**. На чале яе стаў кіраўнік пражскага філіяла Беларускага камітэта самапомачы І. Ермачэнка. В. Кубэ зацвердзіў склад кіраўніцтва БНС, а таксама праграму яе дзейнасці. Галоўнай мэтай БНС было: *«памагаць пацярпелым беларусам ад ваенных дзеянняў, бальшавіцкага і польскага праследавання, памагаць адбудаваць зруйнаваны чужынцамі беларускі край...»*. Пры кіраўніцтве БНС быў створаны Цэнтральны савет (Цэнтраль), у склад якога ўваходзілі 10 чал. Членаў савета прызначаў і звальняў В. Кубэ.

Акупацыйныя ўлады цвёрда трымалі ў сваіх руках кантроль над БНС, не дазваляючы арганізацыі хаця б якой-небудзь самастойнасці. Яе кіраўнікі, аднак, марылі пераўтварыць арганізацыю ў орган беларускага дзяржаўнага кіравання. З гэтай мэтай яны настойвалі на стварэнні беларускіх узброеных ваенных атрадаў для барацьбы з партызанамі і на фронце, арганізацыі пры акупацыйных органах

Библиотека БГУИР

аддзелаў з ліку беларусаў і г.д. Аднак нямецкая палітыка не прадугледжвала стварэння на акупіраваных тэрыторыях якіх-небудзь нацыянальных дзяржаўных мясцовых структур.

І ўсё ж, ідучы насустрач патрабаванням калабарантаў, В. Кубэ 29 чэрвеня 1942 г. надаў Ермачэнку званне дарадчыка і Мужа даверу беларускага народа. Адначасова ён дазволіў стварыць галоўную раду БНС у складзе 12 чал. Пры ёй утвараліся 13 ведамасных аддзелаў: адміністрацыйны, палітычны, вайсковы, школьны, аховы здароўя і інш. з адпаведнымі падраздзяленнямі ў акругах. Фактычна быў створаны апарат, які мог у адпаведны час пераняць з нямецкіх рук кіраўніцтва краем.

Асаблівая ўвага надавалася корпусу **Беларускай самааховы (БСА)**. Планавалася стварыць у кожным раёне адзінкі БСА ад роты да батальёна. Камандуючым БСА быў прызначаны І. Ермачэнка. Ён і створаны ім штаб распачалі кіпучую дзейнасць па стварэнні БСА, паколькі бачылі ў ёй праваобраз будучага беларускага войска. Былі арганізаваны курсы па перападрыхтоўцы афіцэраў-беларусаў, праводзілася актыўная прапагандысцкая кампанія ў акругах. З беларусаў добраахвотна ў БСА амаль ніхто не пайшоў. Камплектавалася яна шляхам прымусу, аблаў. Справай БСА зацікавілася разведка партызан і польскай Арміі Краёвай, якія рабілі ўсё магчымае, каб сарваць гэтае мерапрыемства. Створаныя ў хуткім часе, фарміраванні БСА падвяргаліся ўзмоцненай ідэалагічнай апрацоўцы і ваеннаму ўздзеянню з боку партызан. Да таго ж немцы не спяшаліся ўзбройваць гэтыя фарміраванні, у выніку яны лёгка разганяліся партызанамі. Восенню 1942 г. цікавасць акупантаў да гэтага мерапрыемства стала слабець. Замест БСА яны вырашылі ствараць беларускія паліцэйскія батальёны на чале са сваімі прадстаўнікамі. Вясной 1943 г. гітлераўцы адмовіліся ад беларускай самааховы.



Библиотека БГУИР

27 чэрвеня 1943 г. было аб'яўлена аб стварэнні з прадстаўнікоў беларускай грамадскасці дарадчага органа – **Беларускага даверанага бюро ці «Рады даверу»**. У склад бюро (Рады) ўвайшлі па аднаму прадстаўніку з акруг, якія вызначаліся акруговымі камісарамі, а таксама шэсць чалавек ад цэнтра. На працягу 1943 г. «Рада даверу» збіралася 2 разы (23 і 28 жніўня 1943 г.). Асноўным пытаннем, якое абмяркоўвалася на паседжаннях, было пытанне аб формах і метадах барацьбы з партызанамі. Члены рады выказалі свае меркаванні і параілі акупантам узмацніць агентурную разведку ўнутры партызанскіх злучэнняў, стварыць таксама ілжэпартызанскія атрады. Такім спосабам рада даверу выконвала ролю «народнага прадстаўніцтва».

21 верасня 1943 г. у Мінску падпольшчыкамі быў знішчаны В. Кубэ. Яго пераемнікам на пасадзе генеральнага камісара стаў генерал-лейтэнант паліцыі і СС групенфюрэр фон Готберг, які пачаў інтэнсіўна шукаць сродкі для барацьбы з антыгерманскім рухам. У верасні – лістападзе 1943 г. акупацыйныя ўлады, прымяняючы метад прымусовых мабілізацый, распачалі фарміраванне **беларускіх паліцэйскіх батальёнаў**. Да канца 1943 г. былі сфарміраваны тры такія батальёны.

Акрамя прымусовых мабілізацый акупантамі ствараліся т. зв. **абарончыя вёскі**. Туды пазней пасяліліся і сем'і паліцэйскіх, эвакуіраваных жыхароў усходніх абласцей СССР, у тым ліку казакоў, што служылі ў германскай арміі. Узброеныя жыхары гэтых паселішч павінны былі супрацьстаяць партызанам і падпольшчыкам. Больш шырокія памеры гэта акцыя мела на тэрыторыі заходніх раёнаў Беларусі. Аднак на Беларусі паўсюдна не існавала неабходных умоў для ажыццяўлення гэтай задумы. Часам мясцовыя жыхары вёсак разбягаліся, як толькі заўважалі нямецкія войскі, якім было даручана стварыць «абарончую вёску».

Библиотека БГУИР

У 1943 г. пад уплывам перамог Чырвонай Арміі, прапагандысцкай дзейнасці партызан і падпольшчыкаў актывізаваўся пераход на бок партызан ваеннаслужачых са створаных акупантамі розных вайсковых дапаможных фарміраванняў і паліцыі. У лютым 1943 г. да віцебскіх партызан перайшла большая частка байцоў 825-га волжска-татарскага батальёна, легіёна «Ідэль – Урал», якія былі створаны з ліку ваеннапалонных татар, башкіраў і іншых прадстаўнікоў народаў Паволжа. 16 жніўня 1943 г. на бок партызан перайшла т. зв. 1-я руская нацыянальная брыгада СС палкоўніка У.У. Гіль-Радыёнава, агульнай колькасцю каля 2 тыс. чал. Свой пераход байцы 1-й Антыфашысцкай брыгады (так яна стала называцца) адзначылі разгромам нямецка-фашысцкіх гарнізонаў у Докшыцах і Крулеўшчызне.

Актыўную работу калабаранты праводзілі сярод моладзі Беларусі. **22 чэрвеня 1943 г**. В. Кубэ аб’явіў аб дазволе стварыць антысавецкую арганізацыю моладзі па тыпу гітлерюгенда, якая атрымала назву **«Саюза беларускай моладзі»** (СБМ). Уступіць у яго мог любы беларус ад 10 да 20 гадоў, які даваў пісьмовыя доказы аб арыйскім паходжанні і жаданні служыць фашызму. Мэтай СБМ было аб’яднанне беларускай моладзі, выхаванне ў ёй нацыянальнай свядомасці, гатоўнасці змагацца за Беларусь, якая будзе «адноўлена» з дапамогай Германіі.

Шэфам-кіраўніком штаба СБМ быў прызначаны *М. Ганько*, беларус, адукацыя незакончаная вышэйшая, настаўнік. У 1941 г. ён добраахвотна здаўся ў палон немцам. Пасля заканчэння школы прапагандыстаў працаваў у генеральным камісарыяце Беларусі. Тройчы ўзнагароджаны нямецкімі медалямі. Намеснікам Ганько была прызначана *Н. Абрамава*, беларуска, урач. Працавала ў аддзеле аховы здароўя Генеральнага камісарыяту Беларусі. Двойчы ўзнагароджвалася нямецкімі медалямі.



Библиотека БГУИР

У чэрвені 1943 г. былі адкрыты школы па падрыхтоўцы кіруючых кадраў СБМ у Мінску, Альберціне, Драздах, а з лютага 1944 г. – у Фларыянаве. У Мінску, пры галоўным штабе, рыхтаваліся вышэйшыя кіраўнікі СБМ. За час дзейнасці школ СБМ было падрыхтавана звыш 1300 кіраўнікоў саюза. Гэта дазволіла стварыць даволі шырокую сетку арганізацый, якія аб'ядноўвалі каля 12,5 тыс. юнакоў і дзяўчат.

Такой ідэалагічнай апрацоўцы, як моладзь, не падвяргалася ніводная з катэгорый насельніцтва Беларусі. СБМ арганізоўваў т. зв. «выхаваўчыя размовы». Вось вытрымка з вучэбнага плана школ СБМ за 1943 г.:

«*1. Малодшае юнацтва: А. Гітлер – наш вызваліцель. Жыды і бальшавікі – нашы смяротныя ворагі.*

*2. Юнакі: Жыда-камуністы – найбольшыя ворагі беларускага народа. Інтарэс асабісты і інтарэс грамадскі. А. Гітлер – вялікі правадыр Германіі, сябр беларускага народа.*

*3. Старэйшыя юнакі: Арыйскі дух на службе бацькаўшчыне.*»

СБМаўцы даглядалі магілы «нямецкіх герояў», удзельнічалі ў пахаваннях В. Кубэ, В. Іваноўскага, святкавалі 55-годдзе А. Гітлера.

З канца 1943 г. у СБМ пачалася актыўная вярбоўка ў дапаможныя вайсковыя фарміраванні і атрады СС. М. Ганько выдаў сакрэтны загад аб мабілізацыі ў роту СС юнакоў 1920 – 1927 г. нараджэння. Акруговыя кіраўнікі абавязваліся да 10 студзеня 1944 г. закончыць падбор кандыдатаў. Пачынаючы з вясны 1944 г., акупанты і іх памагатыя вымушаны былі разгарнуць адкрытую дабравольна-прымусовую вярбоўку 15 – 20-гадовых юнакоў у ваенна-дапаможныя фарміраванні Германіі. Радыё, газеты, шматлікія каляровыя лістоўкі заклікалі моладзь вербавацца на службу ў германскую армію.

Вясной 1944 г. германскія вайсковыя ўлады дазволілі стварыць Саюз рускай моладзі, Саюз барацьбы супраць бальшавізма, Саюз

Библиотека БГУИР

татарскай моладзі. Рабілася ўсё магчымае, каб уцягнуць моладзь у сферу германскіх інтарэсаў.

У **снежні 1943 г**. акупацыйныя ўлады абвясцілі аб стварэнні **Беларускай цэнтральнай рады (БЦР)**. Гэта была толькі бачнасць беларускага нацыянальнага ўрада. Захопнікі разглядалі яе як сродак мабілізацыі сіл беларускага народа для барацьбы супраць партызан, больш поўнага выкарыстання эканомікі Беларусі ў сваіх інтарэсах. Беларускія калабарацыянісцкія сілы разлічвалі выкарыстаць дадзеную сітуацыю для ажыццяўлення сваёй даўняй мары – стварэння беларускай дзяржаўнасці пад германскім пратэктаратам. У склад БЦР уваходзіла 14 чалавек. Прэзідэнтам БЦР стаў *Р. Астроўскі*, былы слуцкі памешчык. Падчас вучобы ў Пецярбургскім універсітэце зрабіў данос на свайго земляка-студэнта. Па гэтай прычыне вымушаны быў пакінуць універсітэт. У гады грамадзянскай вайны – дзянікінскі афіцэр. З 1922 г. – тайны агент польскай дыфензівы ў Вільні. За 200 тыс. злотых у 1925 г. выдаў палякам членаў Беларускай сялянска-рабочай грамады, куды ён уступіў па заданні польскай контрразведкі. За атрыманыя грошы купіў маёнтак на Віленшчыне. З гэтага часу ён пачаў супрацоўнічаць з нямецкай разведкай. У 1941 г. з мабільнымі групамі СС вярнуўся на Беларусь. Быў бургамістрам Арла, Бранска, Смаленска, Магілёва. Усюды Р. Астроўскі вербаваў пасобнікаў, кіраваў знішчэннем яўрэяў.

Пры БЦР былі створаны 13 аддзелаў: фінансавы, культуры, сельскай і лясной гаспадаркі, прафесійных спраў, рэлігіі і судовых спраў, вайсковы і інш. Гэта акцыя ўяўляла сабой вымушаны, хоць і добра прадуманы крок, які быў спланаваны ў нетрах берлінскіх спецслужбаў яшчэ ў канцы 1942 г. Між тым гітлераўцы не спяшаліся дзяліць уладу. Фармальна акупанты перадавалі БЦР толькі кіраўніцтва школьнай справай, культурай, сацыяльнай апекай і



Библиотека БГУИР

вайсковымі пытаннямі. Аднак на месцах адпаведныя адзелы і надалей заставаліся пад кантролем германскіх акруговых камісараў.

Асабліва актыўную дзейнасць лідэры БЦР разгарнулі па стварэнні **Беларускай краёвай абароны (БКА)**, паколькі бачылі ў ёй будучае нацыянальнае беларускае войска. На чале БКА быў пастаўлены маёр войскаў СС Ф. Кушаль. Калабарацыяністы дамагліся ад немцаў дазволу на правядзенне прымусовай мабілізацыі, якая пачалася ў **сакавіку 1944 г.**, ёй падлягалі ўсе мужчыны 1908 – 1924 г. нараджэння. За няяўку на зборны пункт у адзначаны тэрмін пагражала смяротная кара. Між тым мабілізацыя ў БКА была шырока выкарыстана для набору рабочай сілы ў Германію, фізічнай расправы з мірным насельніцтвам. Да канца сакавіка 1944 г. удалося гвалтоўна мабілізаваць прыкладна 24 – 25 тыс. чал.

Пад уплывам агітацыі патрыётаў адбывалася масавае дэзерцірства з БКА і пераход яе членаў са зброяй у руках да партызан. У час вызвалення Беларусі частка актыўных байцоў БКА, якія падзялялі палітыку захопнікаў, адступіла разам з немцамі на тэрыторыю Германіі.

**27 чэрвеня 1944 г.**, калі Чырвоная Армія ўжо падыходзіла да Мінска, у гарадскім тэатры было праведзена апошняе афіцыйнае мерапрыемства БЦР – сход бургамістраў, начальнікаў паліцыі, членаў БЦР і іншых «дэлегатаў» беларускага народа, якія назвалі сябе **II Усебеларускім кангрэсам**. Кангрэс абвясціў сябе «паўнаправаўным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа». Ён выказаў непрызнанне БССР як формы беларускай дзяржаўнасці, аб'явіў неправамоцнымі ўсе польска-савецкія пагадненні, што датычыліся Беларусі. Р. Астроўскі быў абраны прэзідэнтам БЦР. Не закончыўшы работы, кангрэсмены збеглі ў Кенігсберг, а затым у Берлін. Там іх цёпла сустракалі. Усім членам БЦР, як і членам нацысцкай партыі, далі кватэры ў цэнтры горада, выдавалі спецкарткі на харчаванне. З



Библиотека БГУИР

дазволу гітлераўцаў яны праводзілі антысавецкую работу сярод беларускай эміграцыі, а таксама гвалтоўна вывезеных на працу ў Германію беларусаў з мэтай стварэння беларускай арміі. Амаль усе яны пасля вайны апынуліся ў ЗША.

Такім чынам, акупацыйныя ўлады стварылі шэраг арганізацый беларускіх калабарацыяністаў, каб забяспечыць сабе апору сярод мясцовага насельніцтва.

У склад беларускіх калабарацыяністаў уваходзілі людзі, якія знаходзіліся ў апазіцыі да савецкай улады і свядома пайшлі на службу фашыстам. З другога боку, сярод калабарацыяністаў былі і тыя, хто абставінамі лёсу, часцей за ўсё метадамі гвалту і запалохвання, пайшлі на службу фашыстам.

Аднак калабарацыянізм на Беларусі не дапамог умацаванню пазіцый нямецкіх акупацыйных улад. Утапічнай была ідэя супрацоўніцтва з акупантамі дзеля рэалізацыі нацыянальных задач. Беларускія нацыяналісты былі ў поўнай залежнасці ад фашыстаў.

На с.331 сваёй кнігі З. Шыбека піша аб тым, што *«ўсеагульнага пераходу беларусаў на бок савецкай улады і партызанаў не адбылося»*, што *«з немцамі беларусаў супрацоўнічала не менш, чым ваявала ў партызанах. І ўсё-ткі да грамадзянскай вайны не дайшло. Акупанты не адважыліся ўзброіць народ для барацьбы з партызанамі, а ў 1944 г. ужо не мелі на гэта і сродкаў»*. А на с.334 гэты тэзіс ён ўдакладніў сцвярджэннем аб тым, што каля 10 % насельніцтва Беларусі супрацоўнічала з немцамі.

Хоць апошнюю лічбу З. Шыбека значна завысіў і незразумела, дзе яе ўзяў, але зусім нязначная частка жыхароў Беларусі ўсё ж такі пайшла на службу да акупантаў. Пагэтаму ўсеагульнага пераходу беларусаў на бок савецкай улады і партызанаў не адбылося. Але гэта

Библиотека БГУИР

не адмаўляе тэзіса савецкай гістарыяграфіі аб усенародным характары барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, аб чым З. Шыбека не сказаў у сваёй кнізе ніводнага слова, бо, відаць, яго асабістыя і навуковыя сімпатыі на баку тых, хто супрацоўнічаў з фашыстамі. Больш таго, аб грамадзянскай вайне, «трагізме самавынішчэння» (с.326) не можа быць і размовы, бо ў Беларусі вайна ішла не паміж класамі і сацыяльнымі пластамі за ўладу, а з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх памагатымі, такімі ж фашыстамі, як і акупанты, толькі ў нацыянальных мундзірах і з ліку мясцовага насельніцтва. На руках здраднікаў – кроў нявінных дзяцей, жанчын, людзей састарэлага ўзросту, патрыётаў нашай Радзімы.

З. Шыбека адзін з падзагалоўкаў кнігі называе “Ацэнка беларускага супрацоўніцтва з акупантамі”. У ім напісана наступнае: *«Вайна зноў выявіла імкненне беларусаў да незалежнасці. Для народа, які стагоддзямі цярпеў нацыянальны прыгнёт і не меў суверэннай дзяржавы, супрацоўніцтва з немцамі стала адзіным шанцам ратавання і мацавання сваёй адметнасці. Гэта быў жэст адчаю, які абумоўліваўся папярэднім расійскім і польскім шавінізмам… Згодна з міжнародным правам, такое супрацоўніцтва не лічыцца злачынствам, бо яно не скіроўвалася супраць уласнага народа. Беларускіх нацыяналістаў няма падставаў лічыць калабарацыяністамі, гэта значыць, аднадумцамі нацыстаў… Паводле меркаванняў шэрагу замежных даследчыкаў другой сусветнай вайны, супрацоўніцтва савецкага насельніцтва з акупантамі трэба разглядаць як рух супраць сталінізма і за ўсталяванне нацыянальных дзяржаў»* (с.333). Далей З. Шыбека



Библиотека БГУИР

называе прозвішчы замежных даследчыкаў, у якіх ён запазычыў гэтыя думкі (Я. Гофман, С. Фроліх, В. Штрык-Штрыкфельд, Я. Малецкі, Ю. Туронак).

У гады Вялікай Айчыннай вайны ніхто з беларусаў, акрамя фашысцкіх памагатых, не думаў аб незалежнасці, не змагаўся з Савецкім Саюзам і з маскоўскім кіраўніцтвам. Усе памкненні людзей былі накіраваны на тое, каб пазбавіцца ад нямецка-фашысцкай няволі. Незразумела, у якіх міжнародных дакументах З. Шыбека прачытаў, што супрацоўніцтва здраднікаў з нямецка-фашысцкімі акупантамі не скіроўвалася супраць уласнага народа. А супраць каго яно было накіравана? Супраць Масквы? Ніхто тады фашысцкіх халуёў не прасіў змагацца з Масквой за міфічную незалежнасць. Такое права яны прысвоілі сабе самачынна. А што датычыцца «замежных даследчыкаў», то іх пазіцыя, як і пазіцыя праамерыканскай, празаходняй навуковай абслугі, даўно зразумелая і каментарый тут не патрэбны.

## Лекцыя 6. Партызанская і падпольная барацьба супраць германскіх агрэсараў на захопленай тэрыторыі Беларусі

***План***

1. Партызанская барацьба.
2. Падпольны рух.
3. Дзейнасць ваенных фарміраванняў Арміі Краёвай і Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў.

**1. Партызанская барацьба.** Адным з рашаючых фактараў перамогі Савецкага Саюза ў вайне з гітлераўскай Германіяй і яе



Библиотека БГУИР

саюзнікамі з’явілася ўсенародная барацьба з захопнікамі. Гэтая барацьба ажыццяўлялася ў **трох асноўных формах**:

- узброенныя дзеянні партызан;
- дзейнасць падпольных груп і арганізацый;
- масавае супраціўленне насельніцтва, якое не ўваходзіла ў склад партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый, эканамічным, палітычным і ваенным планам акупантаў.

Гісторыя не ведае больш шырокага супраціўлення народа агрэсарам, чым барацьба беларускага народа супраць германскіх рабаўнікоў, якая разгарнулася на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі. Насельніцтва ў сваёй большасці з недаверам і падазронасцю сустракала акупантаў. Найбольш адчувальнымі для вермахта і паліцэйскіх сіл былі дзеянні ўзброеных партызанскіх атрадаў і груп. Яны сведчылі аб натуральным імкненні беларускага народа бачыць сваю Бацькаўшчыну свабоднай ад іншаземных захопнікаў. На Беларусі меўся даволі багаты вопыт партызанскіх дзеянняў, накоплены ў далёкім і блізкім мінулым. Да таго ж многія вайскоўцы, што трапілі ў акружэнне ў пачатку вайны альбо вырваліся з варожага палону, таксама далучаліся да ўзброенай партызанскай барацьбы.

У многіх населеных пунктах партызанскія атрады ўзніклі і стыхійна, і пад кіраўніцтвам актывістаў падпольных арганізацый і груп. Арганізацыяй атрадаў і дыверсійных груп займаліся таксама і органы НКУС. Аднак адступленне Чырвонай Арміі з тэрыторыі Беларусі, адсутнасць сувязі з цэнтральнымі кіруючымі органамі, складаныя зімовыя ўмовы, недахоп зброі і боепрыпасаў, медыкаментаў адмоўна адбіліся на першапачатковай баяздольнасці беларускіх партызан і падпольшчыкаў.

У ліку першых, самастойна ўзнікшых партызанскіх фарміраванняў быў Пінскі партызанскі атрад пад камандаваннем **В.З. Каржа**. Ён налічваў каля 60 чал. На тэрыторыі Кастрычніцкага раёна Палескай

Библиотека БГУИР

вобласці (абласны цэнтр г. Мазыр) актыўна дзейнічаў атрад «Чырвоны Кастрычнік». Яго кіраўнікі **Ц.П. Бумажкоў і Ф.І. Паўлоўскі** 6 жніўня 1941 г. сталі першымі партызанамі – Героямі Савецкага Саюза. Частка створаных летам – восенню 1941 г. атрадаў і груп была разгромлена. Некаторыя атрады самараспусціліся. Другія, выканаўшы заданні, выйшлі ў савецкі тыл, іншыя перайшлі на паўлягальнае становішча. Аднак каля 200 атрадаў і груп нават у такіх неспрыяльных умовах працягвалі барацьбу з ворагам.

У 1942 г. пачаўся новы ўздым барацьбы. Разгром немцаў пад Масквой узняў маральны настрой патрыётаў.

Некаторую асаблівасць мела арганізацыя партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якая з пачатку 1942 г. з’яўлялася прыфрантавой. Многія партызанскія атрады там падтрымлівалі трывалую сувязь з Віцебскім абкомам і ЦК КП(б)Б, што дзейнічалі за лініяй фронту, а таксама з ваеннымі саветамі 3-й і 4-й ударных армій. Велізарнае значэнне мела таксама існаванне так званых **Суражскіх (Віцебскіх) варот** (40-кіламетровага прарыву у лініі фронту паміж Веліжам і Усвятамі на стыку нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр»). Праз «вароты» з Вялікай зямлі ў тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты і інш. «Вароты» існавалі з **лютага па верасень 1942 г**.

У **маі 1942 г**. у Маскве быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) на чале з **П. Панамарэнкам**. Першы сакратар ЦК КП(б)Б Панамарэнка не раз выступаў з прапановай стварэння кіруючага органа партызанскага руху. У той час калі нарком унутраных спраў Л. Берыя лічыў неабходным ствараць групы дыверсантаў-падрыўнікоў, П. Панамарэнка з’яўляўся прыхільнікам пункту гледжання аб разгортванні ўсенароднай барацьбы. Яго погляд нарэшце перамог. Прадстаўнікі НКУС і ваенныя былі падпарадкаваны кіраўніцтву ЦШПР. **9 верасня 1942 г**. быў створаны



Библиотека БГУИР

**Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР)** – рэспубліканскі орган ваеннага кіраўніцтва партызанскім рухам на Беларусі, які дзейнічаў да лістапада 1944 г. Начальнікамі штаба з'яўляўся **П.З. Калінін**. Цэнтралізацыя партызанскага руху дазволіла выкарыстоўваць партызан у стратэгічных мэтах.

Значны ўздым партызанскага руху ў Беларусі прыпаў на вясну – лета 1942 г.: расла колькасць атрадаў і груп, якія аб'ядноўваліся ў брыгады. Значна палепшылася ўзбраенне «лясных» байцоў. Удасканальвалася структура партызанскіх сіл. Яны ўсё больш набывалі вайсковую пабудову. Брыгады ў асноўным складаліся з атрадаў, якія ў сваю чаргу дзяліліся на ўзводы, аддзяленні. У некаторых брыгадах і палках існавалі таксама батальёны, у атрадах – роты. Апрача таго, існавалі партызанскія палкі і ваенна-аператыўныя групы. Узрастала майстэрства камандных кадраў і штабоў усіх узроўняў, наладжваліся сувязі з мясцовым насельніцтвам.

Напрыклад, Клічаўскае партызанскае злучэнне было самай буйной групоўкай партызанскіх сіл у Магілёўскай вобласці. У падпарадкаванні яго аператыўнага цэнтра ў пачатку верасня 1942 г. знаходзілася 17 партызанскіх атрадаў, якія налічвалі ў сваім складзе каля 3 тыс. чал. Амаль такім жа шляхам ішло аб'яднанне партызанскіх атрадаў і ў іншых месцах Беларусі. Тэндэнцыя да ўтварэння розных спалучэнняў партызанскіх сіл і стварэння штабоў для каардынацыі іх баявых дзеянняў назіраецца ў гэты час паўсюдна. Пры гэтым атрады, якія ўваходзілі ў партызанскія аб'яднанні, не трацілі сваёй самастойнасці.

Да жніўня 1942 г. колькасць партызан павялічылася больш чым на 23 тыс. чал., а да пачатку 1943 г. перавысіла лічбу **56 тыс.** Рост радоў партызан адбываўся ў асноўным за кошт мясцовай моладзі, якая не мела неабходнай ваеннай падрыхтоўкі. У сувязі з гэтым востра паўстала пытанне ваеннага абучэння. У савецкім тыле былі

Бібліятэка БГУІР

адкрыты школы і пункты па падрыхтоўцы камандных кадраў, арганізатараў партыйнага і камсамольскага падполля, інструктароў, падрыўнікоў, радыстаў, разведчыкаў і іншых спецыялістаў.

З ростам партызанскіх сіл памнажалася і іх баявая актыўнасць. Ад ворага вызваляліся цэлыя раёны, дзе ўлада пераходзіла да партызан і адноўленых органаў савецкай улады. Яны атрымалі назву **партызанскія зоны**. Брыгада імя К.І. Варашылава пад камандаваннем П.П. Капусты вызваліла ад акупантаў многія населеныя пункты Грэскага, Копыльскага і Уздзенскага раёнаў агульнай плошчай 1100 км$^2$. Брыгады «За Радзіму» і 1-я Мінская выгналі захопнікаў з часткі тэрыторыі Чэрвенскага, Рудзенскага і Пухавіцкага раёнаў, узялі пад свой кантроль да 350 км$^2$ агульнай плошчы. Пад непасрэдным уплывам партызан знаходзілася больш 6200 км$^2$. Значна пашырылася Любанска-Акцябрская зона, дзе было вызвалена ад акупантаў 418 населеных пунктаў. У шэрагу раёнаў Магілёўскай вобласці звыш 70 нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў, у тым ліку ў райцэнтры Клічаў, былі разгромлены партызанамі.

Важнае значэнне ў барацьбе з акупантамі мелі ўдары партызан па камунікацыях праціўніка, у першую чаргу па чыгунцы, мастах і буйных вузлах. Летам 1942 г., калі Чырвоная Армія вяла цяжкія абарончыя баі ля Сталінграда, ЦШПР звярнуўся да партызан Беларусі з заклікам дабівацца поўнага знішчэння вайсковых эшалонаў на іх шляху да фронту. Партызаны Беларусі адказалі на гэты заклік шэрагам буйных аперацый, у тым ліку і на камунікацыях праціўніка.

У пачатку жніўня 1942 г. дыверсійная група брыгады «За Савецкую Беларусь» Віцебскай вобласці ўзарвала чатырохпралётны мост праз р. Дрысу на магістралі Полацк – Даўгаўпілс. Рух па ім быў адноўлены толькі праз 16 сутак. 25 жніўня партызаны атрада імя М.Ц. Шыша Пінскай вобласці разграмілі гарнізон у Бастыні на

Библиотека БГУИР

чыгунцы Баранавічы – Лунінец. У канцы жніўня партызанскія атрады пад кіраўніцтвам С.Г. Жуніна, Д.А. Кулікова, Г.С. Мысніка зрабілі ўдалы налёт на станцыю Слаўнае на лініі Мінск – Орша. Яны разбілі варожы гарнізон, спалілі будынак станцыі, склады з ваеннай маёмасцю і прадуктамі, разбурылі шляхі, падарвалі дзве вадакачкі і воданапорную вежу. Удала была праведзена аперацыя «Рэха на Палессі», калі быў узарваны мост цераз р. Пціч. Аперацыю ажыццявіла Мінскае партызанскае злучэнне пад камандаваннем Р. Мачульскага.

Асабліва актыўныя баі і дыверсіі партызан разгарнуліся напярэдадні і ў час контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Курскам. Паказчыкам узрослага майстэрства партызан і іх штабоў з'яўлялася правядзенне ў адзін і той жа тэрмін у межах усёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі буйнамаштабнай аперацыі, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай **«Рэйкавая вайна»**. У ёй удзельнічалі фактычна ўсе партызанскія злучэнні рэспублікі. Яна ставіла мэтай зрыў ваенных перавозак праціўніка на Усходні фронт і максімальнае садзейнічанне наступленню Чырвонай Арміі. На Беларусі ў 1943 – 1944 гг. аперацыя «Рэйкавая вайна» ажыццяўлялася ў тры этапы.

- **Першы этап** пачаўся ў ноч з 3 на 4 жніўня 1943 г. і працягваўся да сярэдзіны верасня 1943 г.;
- **Другі** – з 9 верасня 1943 г. да пачатку лістапада 1943 г. (ён атрымаў назву «Канцэрт»);
- **Трэці этап** пачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г.

За час 1 і 2-га этапаў «Рэйкавай вайны» партызаны ўзарвалі звыш 200 тыс. рэйкаў. Былі разбураны чыгуначныя лініі Цімкавічы – Асіповічы – Бабруйск – Старушкі, Жлобін – Калінкавічы. На многіх чыгуначных магістралях рух быў перапынены ад 4 да 15 сутак, а ўчасткі Магілёў – Крычаў, Полацк – Дзвінск, Магілёў – Жлобін, Баранавічы – Лунінец не працавалі яшчэ большы тэрмін. Партызаны

пускалі пад адхон эшалоны, узрывалі масты, вадакачкі, чыгуначныя станцыі.

У год карэннага пералому ў Другой сусветнай вайне шэрагі партызан Беларусі павялічыліся больш чым на 170 тыс. чал. і налічвалі ў канцы 1943 г. каля **212 тыс. байцоў**. Неабходна мець на ўвазе, што ў баях з ворагам на працягу 1941 – 1943 гг. загінула звыш 33 тыс. партызан.

Значна ўзмацніліся сілы партызан у заходніх абласцях рэспублікі. Важную ролю адыграла перадыслакацыя ў 1943 г. ў гэты рэгіён 9 партызанскіх брыгад, 10 атрадаў і 15 арганізатарскіх груп з усходніх абласцей Беларусі.

У канцы 1943 г. існавалі 20 буйных партызанскіх зон, якія з'яўляліся сапраўднымі фарпостамі савецкай улады ў тыле ворага.

Аднак партызанскі рух не быў пазбаўлены некаторых адмоўных рыс. Здараліся выпадкі нядобрасумленных адносін партызан да мясцовага насельніцтва. Сярод каманднага і радавога саставу мелі месца амаральныя паводзіны, марадзёрства, дэзерцірства, парушэнні партызанскіх абавязкаў. Партыйныя камітэты, камандаванне партызанскімі фарміраваннямі вяло жорсткую барацьбу з такімі праявамі. За гады вайны, згодна з рашэннямі партызанскіх судоў, за цяжкія ўчынкі было расстраляна 2 345 чал.

Варта заўважыць, што тайная палявая паліцыя (ГФП) сумесна з органамі германскай разведкі і контрразведкі – абверам і службай бяспекі (СД) засылала значную колькасць сваіх агентаў у партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі. Яны ажыццяўлялі дыверсіі і правакацыі, дыскрэдытуючы патрыятычны рух. Згодна з агентурнымі данымі, 30 лістапада 1943 г. у Мінск было накіравана 300 добра падрыхтаваных у Германіі дыверсантаў. З іх 150 чал. павінна было быць заслана ў атрады Мінскай вобласці, астатнія – у іншыя раёны рэспублікі. З мэтай дыскрэдытацыі дзейнасці партызан,



Библиотека БГУИР

на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь стваралiся добра ўзброеныя і спецыяльна абучаныя невялікія знішчальныя атрады. Маскіруючыся пад партызан, яны рабавалі, палілі, гвалтавалі, забівалі мясцовых жыхароў, нападалі на невялікія групы партызан.

У абсалютнай большасці ўзаемаадносіны партызан і мясцовага насельніцтва былі надзвычай высакароднымі. Шмат людзей жылі ў партызанскіх зонах пад аховай партызан. Народныя мсціўцы дапамагалі сялянам ахоўваць, сеяць і збіраць ураджай. Партызанскія медыцынскія работнікі лячылі хворых, змагаліся з эпідэміямі. У партызанскіх зонах адкрываліся і працавалі дзесяткі школ. На тэрыторыі зон дзейнічала вялікая колькасць гаспадарчых прадпрыемстваў, якія працавалі на патрэбы партызан і мясцовага насельніцтва. Партызанскія зоны з'яўляліся арганізацыйна-прапагандысцкімі цэнтрамі. Тут выпускалася 170 падпольных газет, працавала 168 радыёстанцый, праводзіліся гутаркі і лекцыі, дэманстраваліся кінафільмы, урачыста адзначаліся святы.

Аднак і гэтая патрыятычная барацьба беларускага народа супраць акупантаў груба фальсіфікуецца некаторымі гісторыкамі. Той жа З. Шыбека сцвярджае, што быццам бы *«праз савецкія сродкі масавай інфармацыі «людзей» пераконвалі, што пасля вайны Сталін збіраецца распусціць калгасы, што партызаны ваююць за новы лад жыцця ў СССР. Калі не дапамагалі ўгаворы, скарыстоўваўся тэрор. За супрацоўніцтва з немцамі прысланыя з Масквы нкусаўцы ў асобных выпадках палілі беларускія вёскі… Пакрыўджаныя бальшавікамі ішлі ў паліцыю, пакрыўджаныя фашыстамі – да партызанаў. Моладзь, каб пазбегнуць вывазу ў Германію, уцякала ў лес… Забіралі ў партызаны пад прымусам. Спачатку партызаны не выклікалі вялікага спачування. Сваёй жорсткасцю і марадзёрствам*

Библиотека БГУИР

*яны выклікалі ў вясковага насельніцтва нават большую пагарду, чым немцы. У жніўні 1942 г. Сталін адмовіўся ад цэнтралізаванай матэрыяльнай падтрымкі партызанскіх атрадаў і раіў ім перайсці на самазабеспячэнне за кошт ворага. І некаторыя "народныя мсціўцы" забіралі ў вяскоўцаў не толькі тое, у чым мелі патрэбу, але і дзіцячае адзенне, гадзіннікі, упрыгожванні, а потым прапівалі нарабаванае. Былі выпадкі збіцця і забойства сялянаў. Партызанаў называлі бандытамі нават тыя, хто чакаў прыходу Чырвонай Арміі»* (с.323 – 324). Сцвярджаецца таксама, што партызанскі рух быццам бы не стаў нацыянальнай справай беларусаў (с.325).

***Па-першае***, савецкае кіраўніцтва і асабіста І. Сталін ніколі не збіраліся распускаць калгасы, а калі меліся асобныя выпадкі няўдалай ідэалагічнай работы сярод мясцовага насельніцтва, то гэта не правіла, а выключэнне.

***Па-другое***, аўтар не гаворыць пра патрыятычныя пачуцці беларускага народа, а фарміраванне партызанскіх атрадаў ён тлумачыць выкарыстаннем тэрору, прымусу, пакрыўджанасці насельніцтва тым ці іншым бокам, што не адпавядала рэчаіснасці. Не адмаўляючы асобных фактаў прымусу і пакрыўджанасці людзей, усё ж такі фарміраваліся партызанскія атрады на аснове патрыятычных пачуццяў насельніцтва. Партызанскі рух стаў сапраўднай нацыянальнай справай беларусаў, бо больш за 80 % удзельнікаў партызанскіх атрадаў і злучэнняў складалі асобы беларускай нацыянальнасці.

***Па-трэцяе***, вядома, што партызан кармілі, забяспечвалі адзеннем і абуткам мясцовыя жыхары, а не Масква. Ды і сам З. Шыбека піша,



Библиотека БГУИР

што сяляне *«аддавалі апошняе сваім сынам, братам дый проста аднавяскоўцам»*, што партызаны *«дапамагалі вяскоўцам і засяваць зямлю, і збіраць ураджай, дзяліліся жывёлай, харчам, палівам, адкрывалі для дзяцей школы»* (с.325), *«беларускае сялянства карміла цэлую партызанскую армію»* (с.331). Таму ў партызан не было патрэбнасці рабаваць мясцовае насельніцтва. А асобныя факты марадзёрства з боку партызан, асабліва ў першыя гады існавання партызанскага руху, не трэба выдаваць за заканамернасць, бо калі б такое было ў масавым маштабе, партызаны пазбавіліся б падтрымкі з боку мясцовага насельніцтва і былі б знішчаны. Тым больш што З. Шыбека прызнае, што *«марадзёры строга караліся»* (с.324). Сіла партызанскага руху – у яго сувязі з народам. І непатрэбна ўкладваць у галовы маладых людзей думку аб тым, быццам партызаны з’яўляліся бандытамі, рабаўнікамі мясцовага насельніцтва. Бандытамі з’яўляліся фашысты і іх нацыянальныя памагатыя, а партызаны – змагарамі супраць нямецка-фашысцкай акупацыі.

З ліку партызанскіх камандзіраў З. Шыбека ўпамінае толькі двух – Міная Шмырова і Васіля Каржа. Пра іх дзейнасць у кнізе не напісана ні слова. Затое з якой любоўю і асалодай піша аўтар пра Партыю беларускіх нацыяналістаў (ПБН) і яе сябра Вацлава Іваноўскага, які *«бачыў у Польшчы саюзніцу ў абароне супраць Расіі і не выключаў федэратыўнага саюза двух суседніх народаў»* (с.327) (беларускага і польскага), пра Беларускую незалежную партыю (БНП) і яе ідэолагаў і кіраўнікоў Вінцэнта Гадлеўскага, Усевалада Родзьку, Юльяна Саковіча, Францішака Аляхновіча, якія *«заклікалі моладзь, партызанаў і паліцэйскіх не праліваць братэрскую кроў, а*

*аб'ядноўвацца ў нацыянальныя партызанскія атрады для барацьбы з нацыстамі і бальшавікамі за незалежную Беларусь»* (с.327). Каментарыі тут не патрэбны.

Адзінай праўдай, якую ў даным выпадку сказаў З. Шыбека, з'яўляецца тое, што ўсе гэтыя «беларускія змагары» спадзяваліся на вайну заходніх дзяржаў (ЗША і Англіі) з СССР пасля перамогі над Германіяй і на вызваленне Беларусі ад сталінскай няволі ізноў акупантамі, на гэты раз англа-амерыканскімі. Як вядома, іх надзеі на паўторную замежную інтэрвенцыю не ажыццявіліся. Можна сцвярджаць, што ідэалогія беларускіх «барацьбітоў за незалежнасць» часоў Вялікай Айчыннай вайны нічым не адрозніваецца ад ідэалогіі сучаснай беларускай апазіцыі, якая за амерыканскія долары імкнецца дэстабілізаваць сітуацыю ў нашай краіне, знішчыць існуючы дзяржаўны і грамадскі лад, захапіць дзяржаўную ўладу, увесь час прыгаворваючы: «Захад нам дапаможа!». Яна нават заклікае да акупацыі Беларусі амерыкана-англійскімі войскамі па прыкладу Афганістана ці Ірака.

**2. Падпольная барацьба.** Адначасова з узброенай партызанскай барацьбой разгортвалася падпольная антыфашысцкая дзейнасць у гарадах і іншых населеных пунктах. Патрыёты, якія там засталіся, не скарыліся ворагу. Яны сабатавалі гаспадарча-эканамічныя, палітычныя і ваенныя мерапрыемствы захопнікаў, здзяйснялі шматлікія дыверсіі.

Па розных прычынах не ўсе жадаючыя процідзейнічаць агрэсару маглі пакінуць сваё жыллё і пайсці ў лясы, каб уключыцца ў партызанскія сілы. Гэтыя людзі ўсведамлялі ролю палітычнага і сацыяльна-эканамічнага фактару ў распачатай вайне: гарады і населеныя пункты – гэта варожыя гарнізоны у складзе працуючых прадпрыемстваў,



Библиотека БГУИР

чыгуначных вузлоў, гаспадарчых ўстаноў і г.д.

Напярэдадні акупацыі Беларусі партыйна-савецкія ўлады клапаціліся аб тым, каб пакінуць законспіраваныя групы, арганізаваць яўкі, распрацаваць розныя віды сувязі. Партыйныя органы звярталі ўвагу на тое, што партызанская барацьба павінна знаходзіцца ў полі зроку і весціся пад непасрэдным кіраўніцтвам законспіраваных падпольных партыйных структур. У сціслыя тэрміны была праведзена работа па ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі партыйна-камсамольскага падполля. Да поўнай акупацыі рэспублікі ў многіх раёнах былі арганізацыйна аформлены раённыя падпольныя парторганы (райкомы, тройкі) на чале з сакратарамі або членамі былых парторганаў. У чатырох абласцях – Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Пінскай – заставаліся абласныя парторганы.

Згодна з задумкай партыйнага і камсамольскага кіраўніцтва пакінутыя ў тыле ворага камуністы і камсамольцы павінны былі стаць тым палітычным ядром, вакол якога належала згуртавацца ўсім свядомым і патрыятычна натхнёным сілам, каб стварыць невыносныя для акупантаў умовы існавання. З пастаўленай задачай партыйныя і камсамольскія работнікі, радавыя камуністы і камсамольцы справіліся даволі паспяхова.

Як і партызанскія фарміраванні, падполле адразу ж прыступіла да актыўнай дзейнасці. Падпольшчыкі здзяйснялі дыверсіі на прадпрыемствах, баявыя аперацыі (знішчэнне жывой сілы і баявой тэхнікі акупантаў), сабатаж мерапрыемстваў акупантаў, вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва, разведку.

У Мінску ўжо ў другой палове 1941 г. падпольшчыкі ўзрывалі склады са зброяй і ваеннай маёмасцю, цэхі і майстэрні па рамонту баявой тэхнікі, вырабу харчавання, знішчалі варожую адміністрацыю, салдат і афіцэраў. У снежні 1941 г., у час напружаных баёў пад Масквой, яны ажыццявілі паспяховую дыверсію на чыгуначным

вузле. У выніку замест 90 – 100 эшалонаў у суткі адсюль на фронт адпраўлялася толькі 5 – 6.

Кіраўніцтва акупацыйнай адміністрацыі рэгулярна атрымлівала звесткі аб актыўнай дыверсійна-баявой дзейнасці падпольшчыкаў Брэста, Гродна, Мазыра, Віцебска, іншых гарадоў Беларусі. На Аршанскім чыгуначным вузле эфектыўна дзейнічала група К.С. Заслонава. У снежні 1941 г. брыкетна-вугальнымі мінамі яна вывела са строю некалькі дзесяткаў паравозаў: частка з іх была ўзарвана і замарожана на станцыі, іншыя ўзарваліся на шляху да фронту.

У акупіраваным Магілёве дзейнічала група медыкаў-падпольшчыкаў. У яе склад уваходзілі ўрачы У.П. Кузняцоў, А.І. Паршын, Ф.І. Пашанін (усе загінулі), сярэдні і малодшы медперсанал. Знішчыўшы сапраўдныя медыцынскія карткі і сфабрыкаваўшы новыя, яны здолелі паспяхова адправіць за горад сотні байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, а таксама цывільных асоб.

Падпольшчыкі ўжо ў першыя месяцы акупацыі сабатавалі розныя мерапрыемствы захопнікаў. Метады іх дзейнасці былі самымі рознымі: утойванне сваіх прафесій, псаванне абсталявання і інструменту, нясвоечасовы выхад на працу, хаванне сабранага ўраджаю, сельскагаспадарчага інвентару і г.д. Акты сабатажу наносілі значныя страты ворагу.

Пасля перамогі ў бітве пад Масквой падпольная барацьба ў гарадах і населеных пунктах Беларусі пашыралася і паглыблялася.

Не абыходзілася і без цяжкіх страт. У сакавіку – красавіку 1942 г. акупацыйным уладам удалося нанесці сур’ёзны ўдар па **мінскім падполлі**. Тады за турэмныя краты трапіла больш за 400 чал., у тым ліку члены падпольнага ГК КП(б)Б С. І. Заяц (Зайцаў), І.П. Казінец, Г.М. Сямёнаў. 7 мая гэтага ж года яны, у ліку 28 іншых патрыётаў,

Библиотека БГУИР

былі павешаны. У гэты ж дзень быў расстраляны яшчэ 251 чал.

Нягледзячы на цяжкія страты, мінскае падполле знайшло сілы не толькі выстаяць, але і зноў узняцца на барацьбу. Члены гаркома і актывісты, што пазбеглі арышту, у маі 1942 г. правялі нараду. Яны прааналізавалі прычыны правалу, абагульнілі дзесяцімесячны вопыт барацьбы, вызначылі меры па далейшым разгортванні падполля. У гаркоме былі створаны аддзелы: разведкі, агітацыі і прапаганды, ваенны, арганізацыі дыверсій, сфарміраваны пяць падпольных райкомаў партыі, шэраг падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый на прадпрыемствах і ва ўстановах. Падпольшчыкі выпускалі газету «Звязда», лістоўкі, мелі сувязь з падполлем іншых гарадоў і населеных месцаў Беларусі.

Але ў верасні – кастрычніку 1942 г. мінскае падполле атрымала новы цяжкі ўдар. У ноч на 26 верасня пачаліся арышты яго ўдзельнікаў. У засценкі СД трапілі сотні змагароў. Большасць арыштаваных загінула. Сярод іх – сакратар падпольнага гаркома І.К. Кавалёў, члены камітэта Дз.А. Караткевіч, В.К. Нікіфараў, К.І. Хмялеўскі, сакратары райкомаў Н.Я. Герасіменка (з сям'ёй), М.К. Каржанеўскі, І.І. Матусевіч, М.А. Шугаеў, кіраўнікі падпольных арганізацый і груп, актыўныя падпольшчыкі Л.Я. Адзінцоў, М.А. Багданаў, Е.М. Баранаў і інш.

Удар, нанесены акупантамі мінскаму падполлю восенню 1942 г., быў вельмі цяжкім, але і ён не прымусіў патрыётаў скарыцца. Сведчаннем таму былі расклееныя 21 кастрычніка 1942 г. больш чым у 300 месцах горада лістоўкі з заклікам яшчэ мацней біць акупантаў. Гітлераўскія спецслужбы выкарыстоўвалі розныя сродкі, каб разграміць падполле. З гэтай мэтай была распрацавана версія па дыскрэдытацыі яго кіраўніцтва, у першую чаргу сакратара І.К. Кавалёва. На жаль, гэтай фальшыўцы гітлераўскіх спецслужб паверылі ў ЦК КП(б)Б, і на доўгія гады над мінскім падполлем вісела

Библиотека БГУИР

чорная хмара недаверу, якая была развеяна толькі нядаўна.

Мінскае падполле і пасля другога правалу працягвала сваю дзейнасць. У горадзе практычна не было ніводнага прадпрыемства ці ўстановы, дзе б ні дзейнічалі патрыёты. Дзесяткі дыверсійных груп былі створаны на Мінскім чыгуначным вузле. У другой палове 1943 г. тут было праведзена больш за 50 дыверсій. Па ўдакладненых даных, у складзе мінскага падполля самаадддана змагалася звыш 9 тыс. чал., прадстаўнікі 25 нацыянальнасцей былога СССР, больш тысячы камуністаў і звыш 2 тыс. камсамольцаў, а таксама антыфашысты замежных краін. Падчас акупацыі ў Мінску было праведзена звыш 1500 дыверсій. Тут нашлі сваю пагібель многія высокапастаўленыя асобы, у тым ліку генеральны камісар Беларусі В. Кубэ.

У **Віцебску** ў 1941 – 1942 гг. дзейнічала 56 падпольных груп. Адной з іх з кастрычніка 1942 г. кіравала В.З. Харужая. Яна была накіравана сюды Беларускім штабам партызанскага руху. 13 лістапада 1942 г. фашысты схапілі і пасля доўгіх допытаў закатавалі яе і іншых падпольшчыкаў. Пасмяротна В.З. Харужай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У **Гомелі** актыўную барацьбу з ворагам вялі падпольныя групы на чыгуначным вузле, паравоза-вагонарамонтным заводзе, леса-камбінаце, гарадской электрастанцыі, іншых прадпрыемствах горада – усяго больш за 400 чал.

Ні на адзін дзень не спынялася антыфашысцкая барацьба ў акупіраваным **Магілёве**. Вясною 1942 г. каля 40 груп (больш за 400 чал.) аб’ядналіся ў падпольную арганізацыю «Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі», якую ўзначальваў мясцовы настаўнік К.Ю. Мэтэ. Камітэт каардынаваў дзейнасць групы чыгуначнікаў, настаўнікаў, рабочых хлебазавода, аўтарамонтнага завода, фабрыкі штучнага шоўку, работнікаў абласной бальніцы,



Библиотека БГУИР

былых ваеннаслужбоўцаў і іншых. Дзякуючы пільнасці, надзейнай канспірацыі і ўдалай структуры арганізацыі магілёўскаму падполлю доўгі час удавалася пазбягаць масавых правалаў і арыштаў.

У **заходніх абласцях Беларусі** таксама дзейнічалі антыфашысцкія арганізацыі. Яны ствараліся па ініцыятыве камуністаў, былых актывістаў КПЗБ, камсамольцаў, іншых патрыётаў. У маі 1942 г. быў створаны «Акруговы беларускі антыфашысцкі камітэт Баранавіцкай вобласці». Камітэт правёў значную работу па стварэнні новых і актывізацыі дзейнасці існуючых груп і арганізацый. Восенню 1942 г. пад кіраўніцтвам гэтага камітэта барацьбу з акупантамі вялі больш за 260 падпольшчыкаў.

Асабліва актыўна дзейнічалі падпольшчыкі на чыгуначным транспарце. На тэрыторыі Беларусі фактычна не было ніводнай больш-менш значнай станцыі, дзе б ні змагаліся патрыёты.

Шырокую вядомасць набылі баявыя подзвігі обальскіх падпольшчыкаў. Падпольная камсамольская арганізацыя «Юныя мсціўцы» на чыгуначнай станцыі Обаль Віцебскай вобласці была створана вясной 1942 г. Узначальвала яе былая работніца віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» камсамолка Ефрасіння Зянькова. У склад гэтай арганізацыі ўваходзіла каля 40 чал. Усяго маладыя падпольшчыкі зрабілі 21 дыверсію: спалілі льнозавод, пілараму, электрастанцыю, некалькі мастоў, здабывалі і перадавалі партызанам зброю, медыкаменты, карысныя разведданыя, распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Савінфармбюро і інш. Варожыя разведслужбы вышукалі патрыётаў. Былі арыштаваныя і закатаваныя да смерці Н.А. Азоліна, М. П. Аляксеева, Н.М. Давыдава, У. І. і Я.Я. Езавітавы, маці Ефрасінні Зяньковай – Марфа Аляксандраўна, З.М. Партнова, Ф.Ф. Слышанкова і іншыя. Пасля вайны Ефрасінні Зяньковай і Зінаідзе Партновай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Смела і рашуча дзейнічалі падпольшчыкі на чыгуначным вузле



Библиотека БГУИР

Асіповічы. У ноч на 30 ліпеня 1943 г. яны здзейснілі адну з самых буйных дыверсій Другой сусветнай вайны. Камсамолец Фёдар Крыловіч працаваў на чыгуначнай станцыі ў начную змену і падлажыў дзве магнітныя міны пад эшалон з гаручым, які павінен быў адысці ў бок Гомеля. Але здарылася нечаканае. Партызаны пашкодзілі чыгунку, і эшалон быў пераведзены ў т. зв. Магілёўскі парк, дзе ў гэты час знаходзілася яшчэ тры эшалоны з вогненебяспечнымі грузамі. Праз некаторы час раздаліся выбухі: гіганцкі вогненны слуп падняўся над станцыяй. Пажар перакінуўся на іншыя эшалоны, нагружаныя ваеннай тэхнікай, боепрыпасамі і авіябомбамі. Амаль 10 гадзін не маглі ліквідаваць пажар, які суправаджаўся выбухамі авіябомб, снарадаў і мін. У выніку аперацыі былі поўнасцю знішчаны 4 эшалоны, у тым ліку адзін з танкамі «тыгр», 31 цыстэрна з гаручым, 63 вагоны са снарадамі, авіябомбамі, мінамі.

Такім чынам, на акупіраванай тэрыторыі змагаліся **374 тыс.** партызан, якія амаль на 80 % з’яўляліся мясцовымі жыхарамі. На баявым уліку партызан знаходзіліся каля 400 тыс. чал. рэзерву. Мужную барацьбу вялі звыш **70 тыс.** падпольшчыкаў. Большую частку беларускіх патрыётаў складалі юнакі і дзяўчаты. Моладзь да 26-гадовага ўзросту складала звыш 54 % беларускіх партызан. Прадстаўнікі ўсіх сацыяльных слаёў удзельнічалі ў барацьбе з акупантамі. Асабліва актыўна выступалі настаўнікі і навучэнцы. У партызанскім руху ўдзельнічала 7 175 настаўнікаў і 34 342 навучэнцы, з якіх каля 5 тыс. з’яўляліся піянерамі.

За гераізм і мужнасць 140 тыс. беларускіх партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, 88 чалавек атрымалі званне Героя Савецкага Саюза.

У барацьбе з ворагам загінула 44 791 партызан, велізарныя страты панесла падполле. Напрыклад, з 1500 падпольшчыкаў



Бібліятэка БГУІР

Віцебска загінуў кожны трэці. Прыкладна такая ж сітуацыя была і ў іншых падпольных арганізацыях.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што каб не шырокае народнае супраціўленне, то вынікі злачынстваў ворага на беларускай зямлі былі б куды больш жудаснымі.

**3. Дзейнасць ваенных фарміраванняў Арміі Краёвай і Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў.**

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 14 тыс. чал. польскай Арміі Краёвай (АК – акаўцаў).

Як вядома, у 1939 г. Польшча як дзяржава другі раз у гісторыі перастала існаваць. У верасні 1939 г. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна ўз’ядналіся з БССР і УССР. Віленскі край, які належаў Польшчы, спачатку ўвайшоў у склад БССР. Але 10 кастрычніка 1939 г. у Маскве было падпісана пагадненне аб перадачы Літве Вільні і Віленскай вобласці.

Польскі эміграцыйны ўрад у Лондане, а таксама польскія буржуазныя партыі, якія дзейнічалі ў падполлі, афіцэрства і каталіцкае духавенства расцэньвалі дзеянні СССР і Германіі як несправядлівыя і агрэсіўныя. Яны ставілі мэтай падняць свой народ на ўсеагульнае паўстанне, аднавіць Польскую дзяржаву і вярнуць ёй тэрыторыі ў межах да 1 верасня 1939 г., у тым ліку тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Літвы (Віленскага краю), пры гэтым яны разлічвалі на дапамогу ўрадаў Англіі і ЗША.

13 лістапада 1939 г. па загаду генерала У.Сікорскага, які ўзначальваў польскі ўрад у эміграцыі, быў створаны нелегальны «Саюз узброенай барацьбы». Яго дзейнасць распаўсюджвалася і на тэрыторыю былых «усходніх крэсаў». Ужо з восені 1939 г. на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі дзейнічалі польскія антысавецкія падпольныя арганізацыі, якія накаплівалі зброю, мелі

Библиотека БГУИР

радыёпрыёмнікі, распаўсюджвалі антысавецкую літаратуру, выступалі за аднаўленне «Другой Рэчы Паспалітай» (1918 – 1939). У 1939 – 1941 гг. органы дзяржаўнай бяспекі і ўнутраных спраў БССР нанеслі магутныя ўдары па антысавецкім польскім падполлі і польскіх узброеных групах.

Пасля нападу Германіі на СССР польскі ўрад У. Сікорскага па-ранейшаму разлічваў на вызваленне Польшчы заходнімі саюзнікамі альбо пры іх рашаючым удзеле. «Саюзу ўзброенай барацьбы» прадпісвалася не ўступаць у актыўныя баявыя дзеянні, а засяроджваць намаганні на падрыхтоўцы ўзброенага паўстання, на разведцы, сабатажы і дыверсіях. Разам з тым 30 ліпеня 1941 г. у Лондане было падпісана пагадненне аб нармалізацыі адносін паміж урадамі СССР і Польшчы. Пытанне аб межах у ім не закранаелася. Але польскі ўрад лічыў яго вырашаным, бо калі дагавор аб дружбе і граніцы паміж Савецкім Саюзам і Германіяй ад 28 верасня 1939 г. быў парушаны, то згубіў сілу, на думку палякаў, і пратакол аб межах. Між тым урад СССР не збіраўся адмаўляцца ад сваіх зямель.

У 1941 – 1942 гг. эміграцыйны польскі ўрад у Лондане пашырае супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам. 4 снежня 1941 г. генерал У.Сікорскі падпісаў у Маскве з урадам СССР умовы ваеннай узаемадапамогі ў барацьбе з Германіяй. Крыху раней, летам 1941 г., было падпісана пагадненне аб фарміраванні на тэрыторыі СССР польскай арміі. Створаная ў асноўным з ваеннапалонных польскіх афіцэраў армія генерала В.Андэрса ў сакавіку 1942 г. пачала эвакуацыю з СССР праз Іран у Паўночную Афрыку, каб разам з англійскімі і амерыканскімі войскамі змагацца з фашысцкай Германіяй. У Маскве былі створаны Саюз польскіх патрыётаў і польскія ўзброеныя сілы на чале з З.Берлінгам.

У лютым 1942 г. на базе «Саюза ўзброенай барацьбы» і іншых сіл па загаду польскага кіраўніцтва ў Лондане была створана **Армія**

Библиотека БГУИР

**Краёва** – падпольнае ваеннае фарміраванне знішчанай Польскай дзяржавы. АК дзейнічала як на тэрыторыі ўласна Польшчы, так і ў Заходняй Беларусі (у раёне гарадоў Ліда, Навагрудак, Ваўкавыск, Ашмяны, Жалудок, Шчучын, Валожын, Гродна, Брэст і г.д.), Заходняй Украіне і Літве. Галоўнай задачай фарміравання з’яўлялася барацьба за аднаўленне Польскай дзяржавы ў межах да 1 верасня 1939 г.

Цэнтр камандавання Арміяй Краёвай знаходзіўся ў Варшаве. Ён падпарадкоўваўся ўраду У. Сікорскага ў Лондане. Варшаўскаму цэнтру падначальваліся акругі на чале з камендантамі, якія ў сваю чаргу кіравалі мясцовымі фарміраваннямі арміі ў раёнах. Работу Арміі Краёвай у заходніх абласцях Беларусі накіроўвалі віленскі, баранавіцкі, брэсцкі, беластоцкі, лідскі, навагрудскі каменданты акруг. Строга захоўвалася канспірацыя. Ксяндзы прымалі ў байцоў прысягу. Галоўнымі камендантамі (камандуючымі) Арміі Краёвай былі генералы С. Равецкі (да 30 чэрвеня 1943 г.), Т. Камароўскі (да падаўлення Варшаўскага паўстання 1944 г.), Л. Акуліцкі (памёр 24 снежня 1946 г. у маскоўскай турме Бутыркі).

Праблемы месца і ролі Арміі Краёвай сёння разглядаюцца ў навуковай літаратуры, на навуковых канферэнцыях. Частка польскіх вучоных бачыць дзейнасць арміі як вынік падпісання 23 жніўня 1939 г. дагавору паміж Молатавым і Рыбентропам. Яны настойліва даказваюць неправамернасць заключэння гэтага пагаднення і яго рэалізацыі. А дзеянні акаўцаў супраць савецкага боку тлумачацца тым, што іх на гэта быццам справакавалі Сталін і беларускія партызаны. Ёсць і айчынныя гісторыкі, публіцысты, палітыкі, якія падзяляюць падобны падыход і выказваюцца за прызнанне ўдзельнікаў Арміі Краёвай ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Такі погляд на гісторыю дазваляе нам запытаць: «А ці была прававая аснова захопу Польшчай у 1919 – 1920 гг. беларускіх зямель? І ці былі б яны вернуты на падставе права Беларусі? Чаму ў

Библиотека БГУИР

злачынствах акаўцаў вінаватыя не эміграцыйны ўрад Польшчы ў Лондане і самі акаўцы, а савецкае кіраўніцтва і беларускія партызаны?»

Адказваючы на гэтыя пытанні, адзначым, што Рыжскі мірны дагавор 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, паводле якога Заходняя Беларусь (да Негарэлага) далучалася да Польшчы, быў для беларусаў несправядлівым, супрацьпраўным. Ён раз'ядноўваў адзінакроўных братоў-беларусаў. Таму барацьба Арміі Краёвай за далучэнне жыхароў Заходняй Беларусі да Польшчы адмоўна ўспрымалася беларускім насельніцтвам і была барацьбой несправядлівай.

Разам з тым «Саюз узброенай барацьбы» і Армія Краёва змагаліся з нямецкімі акупантамі. На іх рахунку ўзарваныя эшалоны праціўніка, знішчаныя фашысцкія салдаты і афіцэры. Толькі ў Навагрудскай акрузе ў 1942 – 1944 гг. атрады Арміі Краёвай правялі 102 баі з гітлераўцамі.

Мясцовае насельніцтва заходніх абласцей Беларусі савецкіх партызан называла «чырвонымі», удзельнікаў Арміі Краёвай – «белымі» альбо легіянерамі, польскіх партызан, якія падпарадкоўваліся камандаванню Войска Польскага і Чырвонай Арміі, – «зялёнымі» партызанамі. Адкрытай барацьбы з савецкімі партызанамі ў 1941 – пачатку 1943 г. польскія ваенныя фарміраванні не вялі, іншы раз нават сябравалі з беларускімі партызанамі, ратавалі палонных, параненых, але былі і шматлікія сутычкі.

Пасля разрыву адносін паміж СССР і Польшчай у красавіку 1943 г. перагаворы паміж «чырвонымі» і «белымі» партызанамі аб сумесных дзеяннях супраць акупантаў зайшлі ў тупік, бо кожны з бакоў меў устаноўку свайго ўрада аб межах, і ўстаноўкі гэтыя былі дыяметральна процілеглыя. Замест ранейшага плана ўсенароднага ўзброенага паўстання кіраўніцтва Арміі Краёвай ажыццяўляе новы

Библиотека БГУИР

план пад кодавай назвай «Навальніца», які ў ваенных адносінах быў накіраваны супраць Германіі, а ў палітычных – супраць СССР: прымусіць СССР прызнаць лонданскі эміграцыйны ўрад адзіным законным прадстаўніком інтарэсаў Польшчы, устанавіць савецка-польскую граніцу па стану на 1 верасня 1939 г.

Армія Краёва прытрымлівалася лозунга «двух ворагаў» і вяла барацьбу на два фронты – супраць немцаў і супраць бальшавікоў. Дзейнічала правіла акаўцаў: «Стаяць са зброяй ля нагі!», г.зн. не выступаць супраць гітлераўцаў, а чакаць: няхай гітлераўцы і бальшавікі знішчаюць адзін аднаго, а мы потым самі прымусім іх да пакоры і падначалення. У той час калі гітлераўцы пачнуць адступаць, а Чырвоная Армія яшчэ не падыдзе, меркавалася разгарнуць узброеныя сілы як веер (план і насіў назву «Веер»), захапіць уладу ў населеных пунктах Заходняй Беларусі і сустрэць савецкія воінскія часці, як сустракаюць гаспадары гасцей.

Армія Краёва адкрыта стала на пазіцыі антысаветызму, антысемітызму, савецкіх партызан называла жыдоўска-бальшавіцкімі бандытамі і грабежнікамі, ваявала з імі. З восені 1943 і да лета 1944 г. толькі ў Навагрудскай акрузе фарміраванні акаўцаў правялі 81 аперацыю супраць беларускіх партызан. Не дасягнуўшы поспехаў у барацьбе з партызанамі, акаўцы жорстка распраўляліся з мірнымі жыхарамі, рабавалі і палілі цэлыя вёскі. У вёсцы Лукашы Заслаўскага раёна яны зажыва спалілі 26 чалавек. Толькі легіянеры стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай забілі 6000 партызан і мірных жыхароў Беларусі.

Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй тэрыторыі Беларусі фарміраванні Арміі Краёвай спрабавалі процістаяць аднаўленню савецкай улады ў яе заходніх абласцях.

У студзені 1945 г. Армія Краёва была афіцыйна распушчана. З Лондана паступіў загад прыпыніць баявыя дзеянні, захаваць кадры

Библиотека БГУИР

для далейшай барацьбы, што сведчыла аб недальнабачнай і нерэалістычнай палітыцы польскага эміграцыйнага ўрада ў адносінах да «крэсаў усходніх». Аднак многія камандзіры акаўцаў не выканалі гэты загад і стварылі невялікія падпольныя групы і арганізацыі, большасць з якіх стала на шлях бандытызму. Бандытызм акаўцаў у Беларусі працягваўся аж да пачатку 50-х гадоў, пакуль яны не былі вылаўлены савецкімі сілавымі структурамі і аддадзены пад суд.

Такім чынам, у пасляваенны час адзіным спосабам існавання акаўцаў быў прымітыўны бандытызм, густа афарбаваны нянавісцю да савецкай улады.

На тэрыторыі Беларусі ў Брэсцкай і Пінскай абласцях, частка якіх была ўключана гітлераўцамі ў склад рэйхскамісарыята «Украіна», дзейнічалі ваенныя фарміраванні Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН) – аўнаўцы (1929 – пачатак 1950-х гг.). Арганізацыя гэта ўзнікла як палітычная рэакцыя на прыгнёт украінскага насельніцтва Польшчай. Яе стварыў палкоўнік пятлюраўскай арміі Канавалец, пасля якога арганізацыю ўзначаліў палкоўнік Мельнік, а маладое крыло – Бандэра (двойчы прысуджваўся да пакарання смерцю за забойства міністра ўнутраных спраў Польшчы і савецкага консула). Паміж Мельнікам і Бандэрам адбыўся канфлікт у барацьбе за кіраўніцтва АУН.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны гітлераўская ваенная разведка (абвер) заключыла з АУН палітычнае пагадненне аб сумесных дзеяннях супраць СССР. З дапамогай гітлераўцаў нацыяналісты і іх кіраўнікі, агенты абвера Мельнік і Бандэра мелі намер выступіць у якасці той сілы, якая *«зваліць панаванне бальшавізму на Украіне, адарве краіну раз і назаўсёды ад усялякай Маскоўшчыны»* і створыць самастойную Саборную Украінскую дзяржаву. АУН удалося нават атрымаць ад немцаў адпаведныя пісьмовыя дакументы.

Библиотека БГУИР

З перадавымі дывізіямі вермахта 22 чэрвеня 1941 г. дзяржаўную мяжу СССР перайшлі два легіёны аўнаўцаў, якія налічвалі крыху больш за 400 чал. Легіён «Роланд» рухаўся ў накірунку Адэсы, а легіён «Нахцігаль» – да Львова. На розныя патрэбы аўнаўцаў гітлераўцы далі 2,5 млн рэйхсмарак, не лічачы зброі, шпіёнскай і ваеннай амуніцыі.

«Наша ўлада павінна быць страшнай», – паўтараў Бандэра. Яна такой і была: на Украіне пачаўся масавы тэрор. Па падліках вучоных, толькі ў першыя дні акупацыі ў заходніх абласцях Украіны аўнаўцы па-зверску замучылі 40 тыс. чал.

30 чэрвеня 1941 г. у Львове АУН абвясціла незалежную Саборную Украіну, стварыла яе ўрад на чале з Стацко, паслала прывітанне Гітлеру. Але Гітлер і слухаць не хацеў аб суверэннай Украіне, як і суверэннай Беларусі. Ён загадаў распусціць урад Стацко, ініцыятараў палітычнай акцыі арыштаваць і прыцягнуць да адказнасці. Бандэра, Стацко і іншыя «стваральнікі» самастойнай Украіны былі арыштаваны і пасаджаны ў канцлагер Заксенхаўзен. У верасні – снежні 1941 г. адбыліся масавыя арышты і растрэлы аўнаўцаў, многія з якіх уцяклі ў лес і ўзяліся за зброю для барацьбы з гітлераўцамі. Часта здаралася так, што ў адных і тых жа лясах Брэстчыны ці Піншчыны каля аднаго вогнішча сядзелі побач беларускія партызаны, акаўцы і аўнаўцы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны прапятлюраўскіх барацьбітоў за самастойную Украіну ўзначаліў Баравец, які меў клічку Бульба (адсюль яго прыхільнікаў называлі бульбаўцамі). З'яўляючыся адным з крылаў АУН, бульбаўцы арганізацыйна складалі ўзброенае злучэнне «Палеская Сеч», якое дзейнічала ў рэгіёне Пінск – Мазыр – Корасцень. Бандэраўцы і бульбаўцы знаходзіліся паміж сабой у стане лютай варожасці, бо кожны з іх прэтэндаваў на ролю «першага» барацьбіта за самастойную Украіну.



Библиотека БГУИР

Да сярэдзіны 1943 г. узброеныя фарміраванні бандэраўцаў і бульбаўцаў актыўных баявых дзеянняў супраць савецкіх партызан не вялі, а ў асобных выпадках дапамагалі ім інфармацыяй, вызвалялі вязняў з нямецкіх турмаў, лагераў ваеннапалонных і г.д. Аднак летам 1943 г. яны змянілі сваю пазіцыю, распрацавалі новую тактыку: у адносінах да гітлераўцаў – пасіўная самаабарона, да партызан – барацьба. Усё гэта, а таксама расправа над палякамі, якія пражывалі ў Беларусі, дамоўленасць бандэраўцаў і бульбаўцаў пра сумесную барацьбу супраць Саветаў з беларускімі калабарацыяністамі прывялі да крывавых сутыкненняў паміж беларускімі партызанамі, бандэраўцамі і бульбаўцамі.

У 1944 г. Бандэру вызвалілі з турмы, ён пераехаў у Кракаў і адтуль пачаў кіраваць барацьбой супраць савецкай улады.

У 1944 г. па заданні абвера АУН стварыла шэраг новых узброеных фарміраванняў, аб'яднаных ва Украінскую паўстанцкую армію (УПА) для дзеянняў на тэрыторыі Украіны ў тыле Чырвонай Арміі. На пераломе 1944 – 1945 гг. колькасць УПА складала да 150 (па іншых ацэнках да 500) тыс. байцоў і ўдзельнікаў падполля. Яны стралялі ў спіны салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, смяротна паранілі камандуючага 1-м Украінскім фронтам М.Х. Ватуціна, праводзілі тэрарыстычныя акты, забойствы партыйных, савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў, работнікаў праваахоўных органаў, актывістаў.

На тэрыторыі прылеглых да Літвы раёнаў Беларусі ў пасляваенныя гады дзейнічала літоўскае антысавецкае падполле (каля 1 тыс. чал.), якое, як і рух бандэраўцаў, было ліквідавана ў пачатку 50-х гадоў.

Библиотека БГУИР

# РАЗДЗЕЛ III. РАЗГРОМ ФАШЫСЦКАГА БЛОКА. ЗАВЯРШЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (4 ГАДЗІНЫ)

## Лекцыя 7. Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта

***План***

1. Пашырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск у Афрыцы, Міжземнамор'і і на Ціхім акіяне.
2. Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны пералом у вайне.
3. Савецкія стратэгічныя наступальныя аперацыі ў 1944 г. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### 1. Пашырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск у Афрыцы, Міжземнамор'і і на Ціхім акіяне.

Актыўныя баявыя дзеянні ў пачатку 1942 г. разгарнуліся на Ціхім акіяне. Японія акупіравала Малайзію, Інданэзію, Філіпіны, Бірму, нанесла буйное паражэнне англійскаму флоту ў Сіамскім заліве і англа-амерыканскаму флоту ў Яванскай аперацыі, захапіўшы панаванне на моры. Аднак ужо ў маі – чэрвені амерыканцы нанеслі паражэнне японскаму флоту ў Каралавым моры і каля вострава Мідуэй і захапілі ініцыятыву.

У Міжземным моры італа-германскаму флоту ўдалося ўстанавіць кантроль на шляхах, якія вялі ў Афрыку. У студзені-лютым 1942 г. італа-германскія войскі разграмілі брытанскія часці ў Лівіі і занялі Бенгазі. У Атлантычным акіяне актывізаваліся дзеянні германскіх падводных лодак, якія тапілі англійскія і амерыканскія транспарты, пагражалі зрывам марскіх камунікацый саюзнікаў. Германскі надводны флот і авіяцыя перабазіраваліся ў Нарвегію, перашкаджаючы руху паўночных канвояў у Савецкі Саюз, якія дастаўлялі ленд-

Библиотека БГУИР

лізаўскія грузы. На шляхах іх руху разгарнуліся лютыя марскія і паветраныя баі.

Аднак з вясны 1942 г. суадносіны сіл пачалі змяняцца на карысць антыгітлераўскай кааліцыі. У Афрыцы італа-германскія войскі, у склад якіх уваходзілі 8 італьянскіх і 4 нямецкія дывізіі, у тым ліку 4 танкавыя і 2 матарызаваныя, аказаліся не ў стане працягваць наступленне і перайшлі ў раёне Эль-Аламейна (Егіпет) да абароны.

Восенню 1942 г., калі асноўныя сілы нямецкай арміі былі звязаны цяжкімі, крывапралітнымі баямі на савецка-германскім фронце, для англа-амерыканскіх войск стварыліся спрыяльныя ўмовы для актывізацыі ваенных дзеянняў у Паўночнай Афрыцы. У канцы кастрычніка – пачатку лістапада 1942 г. 8-я брытанская армія, у склад якой уваходзілі англійскія, аўстралійскія, індыйскія, новазеландскія, паўднёва-афрыканскія, грэчаскія і французскія дывізіі і брыгады, у ходзе двухтыднёвых наступальных баёў зламіла супраціўленне італа-нямецкіх войск пад Эль-Аламейнам, нанесла ім вялікія страты і выгнала з Егіпта.

Гэтая перамога брытанскай арміі стала значнай падзеяй для заходніх саюзнікаў. Яна змяніла абставіны ў Паўночнай Афрыцы і на Міжземным моры на іх карысць. Але не варта перабольшваць значэнне гэтай аперацыі, тым больш выдаваць яе як «паваротны пункт у вайне», ці па словах Чэрчыля, *«лёсавызначальны паварот у вайне»*.

У час бітвы пад Эль-Аламейнам італьянцы і немцы страцілі 55 тыс. забітымі, параненымі і палоннымі, 320 танкаў і каля 1 тыс. гармат. Агульныя ж страты гітлераўцаў і іх саюзнікаў толькі ў час контрнаступлення савецкіх войск пад Сталінградам (19 лістапада 1942 г. – 2 лютага 1943 г.) склалі больш за 800 тыс. чал., 2 тыс. танкаў і штурмавых гармат, 10 тыс. гармат і мінамётаў, 3 тыс. баявых самалётаў. Лёс вайны ў цэлым, яе паварот вырашыліся на савецка-

Библиотека БГУИР

германскім фронце, дзе дзейнічалі галоўныя сілы фашысцкай кааліцыі, дзе разгрому падвергліся асноўныя буйныя стратэгічныя групоўкі яе войск.

8 лістапада 1942 г. амерыкана-англійскія войскі высадзіліся ў Паўночнай Афрыцы. 13 мая 1943 г. італа-германскія войскі ў Тунісе капітулявалі. Іх агульныя страты склалі больш за 300 тыс. салдат і афіцэраў, з іх 30 тыс. забітымі. Ваенныя дзеянні ў Паўночнай Афрыцы закончыліся.

У ліпені – жніўні 1943 г. англа-амерыканскія войскі высадзіліся на востраве Сіцылія і авалодалі ім. 25 ліпеня 1943 г. фашысцкі рэжым у Італіі паў. У верасні Італія капітулявала. Выхад Італіі з вайны быў абумоўлены перамогай Чырвонай Арміі ў Курскай бітве, якая паклала пачатак распаду фашысцкага блока. 13 кастрычніка 1943 г. Італія аб'явіла вайну Германіі.

**2. Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны пералом у вайне.** У красавіку 1942 г. націск савецкіх войск на ворага аслабеў: не было ні сіл, ні сродкаў для яго працягвання. Фронт перайшоў да абароны. Мы па-ранейшаму ўступалі вермахту ва ўменні ваяваць, што асабліва праявілася ў ходзе баёў за Крым і Харкаў.

8 мая 1942 г. ударныя групоўкі ворага пачалі наступленне супраць войск Крымскага фронту (камандуючы Дз. Казлоў, член Ваеннага савета Ф. Шаманін, прадстаўнік Стаўкі Л. Мехліс). Нягледзячы на ўпартае супраціўленне, у выніку памылак, дапушчаных камандаваннем фронту, савецкія войскі вымушаны былі адступіць. У маі праціўнік захапіў Керч, а 4 ліпеня пасля 250-дзённай абароны паў Севастопаль. Вораг поўнасцю авалодаў Крымам.

Адначасова з баямі ў Крыме разгарнуліся актыўныя баявыя дзеянні ў раёне Харкава. З мэтай вызваліць горад войскі Паўднёва-

Библиотека БГУИР

Заходняга фронту (камандуючы С. Цімашэнка, член Ваеннага савета Н. Хрушчоў, начальнік штаба І. Баграмян) пачалі 12 мая наступленне на Харкаў. Аднак 23 мая 6-я нямецкая армія, якая наступала з поўначы, і групоўка Клейста, якая наступала з поўдня, узялі некалькі савецкіх армій у «кацёл». Нашы страты склалі 267 тыс. чал. (у тым ліку каля 200 тыс. палонных), 652 танкі, 1,5 тыс. гармат, 3,2 тыс. мінамётаў і інш.

Аднак наступаць па ўсіх напрамках, як гэта было ў 1941 г., вермахт у 1942 г. ужо не здолеў. Асноўныя сілы яго былі кінуты на паўднёвы ўчастак фронту для захопу Сталінграда і Каўказа. Сталінград – гэта, перш-наперш, буйны прамысловы цэнтр, важны вузел камунікацый, які звязваў Каўказ і Сярэднюю Азію з Цэнтрам, гэта бакінская нафта для прадпрыемстваў Урала. Па словах генерал-фельдмаршала Ф. Паўлюса, значэнне рубяжа Сталінград – Варонеж заключалася ў тым, што ён прадстаўляў сабой зыходны рубеж для нанясення ўдара на Маскву і на ўсход ад яе. Акрамя таго, заваяванне Сталінграда давала магчымасць нямецка-фашысцкім войскам злучыцца з войскамі Турцыі і перарэзаць Трансіранскую чыгунку, па якой ажыццяўлялася наземная сувязь СССР з англа-амерыканскімі саюзнікамі. Захоп Сталінграда і Каўказа адкрываў перад Гітлерам перспектыву руху ў Індыю, Ірак і Іран.

Абставіны на паўднёвым крыле савецка-германскага фронту змяніліся на карысць вермахта. Летам 1942 г. праціўнік дабіўся немалых поспехаў: заняў Данбас, выйшаў да Дона, стварыў пагрозу Сталінграду і Паўночнаму Каўказу. Амаль на 500 км прасунуліся нямецкія войскі ад Ізюма да Калача. Краіна Саветаў ізноў апынулася на краю пагібелі.

Чаму гэта здарылася? Перш-наперш таму, што І. Сталін, шэраг іншых ваенных і дзяржаўных дзеячаў дапусцілі буйнейшы падчас вайны стратэгічны і тактычны пралік, запатрабаваўшы актыўных



Библиотека БГУИР

наступальных дзеянняў савецкіх войск летам 1942 г. У гэтай сувязі прыйшлося адмовіцца ад прапаноў генштаба перайсці да ўстойлівай абароны з мэтай назапасіць, узброіць і навучыць новыя рэзервы, абяскровіць праціўніка і толькі потым перайсці ў контрнаступленне. Акрамя таго, нямецкая разведка сумела дэзінфармаваць нашае кіраўніцтва, праводзячы перадыслакацыю войск і падкінуўшы дакументы аб быццам бы рыхтуючайся аперацыі «Крэмль» з мэтай даказаць, што фашысты ізноў будуць наступаць на маскоўскім накірунку. У выніку тут былі сканцэнтраваны нашы рэзервы, сюды ішла асноўная частка ваеннай тэхнікі, а на поўдні войскі аказаліся аголенымі. І, нарэшце, выкарыстоўваючы адсутнасць другога фронту, гітлераўцы дадаткова перакінулі з Заходняй Еўропы ў Германію яшчэ 80 дывізій, стварыўшы перавес сіл на сваю карысць.

У такіх цяжкіх ваенна-палітычных абставінах 28 ліпеня 1942 г. І. Сталін як нарком абароны падпісаў **загад № 227**. У ім было сфармулявана патрабаванне да войск – «**Ні кроку назад!**». Сярэднія і старшыя камандзіры і палітработнікі, якія правініліся «в нарушении дисциплины по трусости или неустойчивости», накіроўваліся ў штрафныя батальёны, радавыя байцы і малодшыя камандзіры – у штрафныя роты. У кожнай арміі стваралiся заградатрады, якія ставіліся ў тыле «няўстойлівых дывізій» і абавязваліся *«пры паніцы і беспарадачным адыходзе часцей дывізіі расстрэльваць на месцы панікёраў і трусаў»*. Штрафныя роты і батальёны выкарыстоўваліся на самых цяжкіх участках фронту. Штрафнікі, якія атрымалі раненні ў баі, лічыліся адбыўшымі пакаранне.

Групай нямецка-фашысцкіх армій «А» была праведзена аперацыя пад умоўнай назвай **«Эдэльвейс» – бітва за Каўказ**, якая працягвалася **з 25 ліпеня 1942 г. па 9 кастрычніка 1943 г**. Сражэнні вяліся па фронту ад 320 да 1000 км і ўглыб ад 400 да 800 км. У выніку кровапралітных баёў вораг быў разбіты. Яго страты толькі ў перыяд

наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі склалі каля 300 тыс. салдат і афіцэраў.

Група нямецка-фашысцкіх армій «Б» наступала ў накірунку Сталінграда. **З 17 ліпеня па 18 лістапада 1942 г**. у ходзе **абаранияльнага этапа Сталінградскай бітвы** асаблівую настойлівасць і гераізм у барацьбе за горад праявілі стралковыя дывізіі А. Радзімцава, І. Людніĸава, Н. Бацюка, В. Гарышнага, Л. Гурцьева, І. Ярмолкіна, В. Жолудзева, В. Сакалова, Ф. Смехатворава, І. Салагуба, зводная група С. Гарохава, танкавая брыгада Д. Белага. Назаўсёды засталіся ў памяці народнай камандуючыя арміямі генералы В. Калпакчы, А. Лапацін, В. Чуйкоў, М. Шумілаў, гераізм тысяч салдат Чырвонай Арміі і жыхароў горада.

**У 1941 – 1942 гг. ствараліся ўмовы для правядзення стратэгічнага контрнаступлення Чырвонай Арміі, забеспячэння карэннага пералому ў ходзе Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. Якія гэта ўмовы?**

1. У выніку самаахвярнай працы савецкага народа да сярэдзіны 1942 г. была завершана перабудова ўсёй народнай гаспадаркі на ваенны лад. СССР гэта здолеў зрабіць на працягу года. ЗША і Англіі запатрабавалася 3 – 4 гады, каб перавесці гаспадарку на ваенныя рэйкі. Восенню 1942 г. Савецкі Саюз меў дасканалую ваенную гаспадарку, здольную забяспечыць фронт усім неабходным і ў дастатковай колькасці.

Да лістапада 1942 г. у дзеючай Чырвонай Арміі налічвалася 72 500 гармат і мінамётаў, 1 724 «кацюшы», 6 014 танкаў і самаходна-артылерыйскіх установак, 3 088 баявых самалётаў. У Германіі з улікам войск сатэлітаў у гэты час было 70 980 гармат і мінамётаў, 6 600 танкаў і штурмавых гармат і 3 500 баявых самалётаў. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што вораг ужо не меў ранейшай перавагі ў



Библиотека БГУИР

баявой тэхніцы і ўзбраенні, чым былі створаны неабходныя ваенна-тэхнічныя ўмовы для карэннага пералому ў ходзе вайны.

2. Карэнны пералом у ходзе вайны ў многім залежаў ад поспехаў савецкага тылу. Павышэнне творчай актыўнасці і ініцыятывы працаўнікоў тылу, разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва, працоўны гераізм савецкага народа, узмацненне дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва, аказанне дапамогі калгасам і саўгасам дазволілі дабіцца пашырэння прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, паспяховага выканання планавых заданняў, заказаў фронту. У 1942 г. авіяпрамысловасць СССР дала фронту 25 436 самалётаў, а заводы Германіі выпусцілі 14,7 тыс. самалётаў. У 1943 г. савецкая прамысловасць выпусціла 35 тыс. самалётаў. Усяго за 1942 – 1943 гг. наша авіяпрамысловасць дала фронту на 20 тыс. самалётаў больш, чым германская. За гэтыя гады танкабудаўнічыя заводы СССР выпусцілі 44,6 тыс. баявых машын, а германскія – толькі 18,2 тыс. машын.

3. Шырокі размах прыняў рух усенароднай дапамогі фронту. Па закліку тамбоўцаў і саратаўцаў працоўныя добраахвотна ўносілі грашовыя сродкі і матэрыяльныя каштоўнасці ў Фонд абароны СССР, Фонд Чырвонай Арміі і іншыя фонды. Усяго за гады вайны добраахвотныя ахвяраванні насельніцтва склалі звыш 100 млрд рублёў. Дзякуючы гэтай фінансавай дапамозе на фронт дадаткова было накіравана 2 565 самалётаў, некалькі тысяч танкаў і іншая ваенная тэхніка. Народная ініцыятыва выражалася таксама ў шырокім развіцці донарства, забеспячэнні арміі цёплым адзеннем і г.д. У адзінстве фронту і тылу заключаліся тыя вялікія сілы, якія дазволілі нашай арміі перайсці ў стратэгічнае контрнаступленне і перахапіць стратэгічную ініцыятыву.

4. Перад тварам смяротнай небяспекі з асаблівай сілай праявіліся высокія маральныя і духоўныя якасці савецкіх воінаў, усяго савецкага народа. Узмацнілася выхаваўчая работа ў арміі і сярод працаўнікоў

Библиотека БГУИР

тылу. Тым самым складваліся ідэйна-палітычныя ўмовы для карэннага пералому ў ходзе вайны.

5. Важную ролю ў дасягненні карэннага пералому ў ходзе вайны адыграў партызанскі рух і антыфашысцкае падполле ў тыле германскіх войск. Гэтаму пытанню была прысвечана асобная лекцыя.

Такімі былі важнейшыя ўмовы карэннага пералому ў самы цяжкі і складаны для нас першы перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Пачатак карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны і ўсёй Другой сусветнай вайны звязаны з разгромам нямецка-фашысцкіх войск пад Сталінградам. Пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі раніцай **19 лістапада 1942 г**. войскі Паўднёва-Заходняга (камандуючы Н. Ватуцін) і Данскога (камандуючы К. Ракасоўскі) франтоў перайшлі ў наступленне і прарвалі абарону праціўніка. 20 лістапада ў наступленне перайшлі войскі Сталінградскага фронту (камандуючы А. Яроменка). 23 лістапада 1943 г. войскі Паўднёва-Заходняга і Сталінградскага франтоў самкнуліся ў раёне гарадоў Калач і Савецкі. Часці 6-й палявой і 4-й танкавай армій праціўніка агульнай колькасцю 330 тыс. чал. былі акружаны. Іншага прыклада акружэння такой буйной стратэгічнай групоўкі пры нязначнай перавазе наступаўшага боку гісторыя Другой сусветнай вайны да гэтага не ведала. Той жа самы лёс спаткаў і румынскую групоўку войск.

**2 лютага 1943 г**. Сталінградская бітва закончылася поўным разгромам нямецка-фашысцкай групоўкі.

Перамога Чырвонай Арміі пад Сталінградам, нягледзячы на вялікія страты, мела выключнае ваенна-палітычнае і міжнароднае значэнне. Ворагу быў нанесены такі ўдар, які пахіснуў усю ваенную машыну фашысцкай Германіі, падарваў яе ваенны прэстыж. У міжрэччы Волгі і Дона фашысты згубілі забітымі, параненымі і паланёнымі звыш 800 тыс. чал. Адступленні, акружэнні, «катлы»



Библиотека БГУИР

сталі цяпер характэрным станам для фашысцкіх армій. Стратэгічная ініцыятыва пераходзіла ў рукі савецкага камандавання.

Разгром пад Сталінградам выклікаў у фашысцкай кааліцыі глыбокі ваенна-палітычны крызіс. Італія, Румынія і Венгрыя апынуліся перад сур'ёзнымі цяжкасцямі, звязанымі з вялікімі стратамі на фронце, падзеннем баяздольнасці войск, нарастаннем незадаволенасці мас. Венгрыя і Румынія выступілі за заключэнне сепаратнага міру з заходнімі дзяржавамі, а Мусаліні прапанаваў Гітлеру заключыць мір не з заходнімі дзяржавамі, а з Савецкім Саюзам, бо, на яго думку, «Расію перамагчы немагчыма». Турцыя спадзявалася, што калі немцы захопяць Каўказ, яны дадуць ёй магчымасць стварыць цюркамоўныя дзяржавы і аўтаноміі на былой тэрыторыі СССР пад турэцкім пратэктаратам. Перамога пад Сталінградам прымусіла Японію і Турцыю ўстрымацца ад уступлення ў вайну на баку Германіі супраць СССР. Наша перамога аказала рашаючае ўздзеянне на пазіцыю нейтральных краін.

Сур'ёзным чынам падзейнічала перамога пад Сталінградам на ўзаемаадносіны СССР з ЗША і Англіяй. Абодва бакі добра разумелі, што Чырвоная Армія можа дабіцца карэннага пералому ў вайне і перамагчы немцаў да таго, як саюзнікі перакінуць войскі ў Заходнюю Францыю.

Перамога пад Сталінградам садзейнічала ўзмацненню нацыянальна-вызваленчага руху ў Чэхаславакіі, Польшчы, Югаславіі, Албаніі, Францыі і іншых краінах. Яна высока падняла міжнародны аўтарытэт СССР, выклікала пачуццё глыбокай павагі да нашага народа, да яго барацьбы ў імя ўсяго чалавецтва.

Частка нямецкіх ваеннапалонных, якія ўтрымліваліся ў савецкіх лагерах, прыняла ўдзел у антыфашысцкім руху. Летам 1943 г. пры садзеянні савецкіх спецслужб з нямецкіх ваеннапалонных былі створаны Нацыянальны Камітэт «Свабодная Германія» і «Саюз

Библиотека БГУИР

нямецкіх афіцэраў». Для разлажэння войск і тылу нямецкай арміі члены гэтых арганізацый раскідвалі лістоўкі, выязджалі на фронт як упаўнаважаныя для вядзення прапаганды, з іх ствараліся спецгрупы ў тыле. Сёння некаторыя заходнія гісторыкі лічаць, што І. Сталін стварэннем гэтых антыфашысцкіх арганізацый ставіў двайную мэту: з аднаго боку аказваў націск на саюзнікаў, якія баяліся, каб паміж СССР і Германіяй не быў заключаны сепаратны мір, і, з другога, – каб, звергнуўшы Гітлера, ён не замяніў яго ўрадам, які кантралюецца Масквой.

У гады Вялікай Айчыннай вайны змяніліся ўзаемаадносіны паміж дзяржавай і царквой. У самым пачатку вайны мітрапаліт Сергій звярнуўся да ўсіх веруючых і да духавенства з пасланнем, у якім былі і такія словы: *«Церковь Христова благославляет всех православных на защиту священных границ нашей Родины»*. Патрыятычная дзейнасць Рускай Праваслаўнай Царквы па зборы грашовых сродкаў, каштоўнасцей і рэчаў для патрэб фронту паслужыла штуршком для дыялогу паміж уладай і царквой.

У лютым 1943 г. мітрапаліт Сергій і Сталін абмяняліся пасланнямі, а 4 верасня Сталін прыняў мітрапалітаў Сергія, Алексія і Мікалая. Вынікі гэтай размовы пераўзыйшлі ўсе чаканні: пытанні, пастаўленыя іерархамі, і самае галоўнае – скліканне архіерэйскага сабора і выбары патрыярха, былі вырашаны станоўча. Аднавіў сваю дзейнасць Свяшчэнны Сінод. Для падрыхтоўкі кадраў свяшчэннаслужыцелей ізноў адкрываліся духоўныя вучэбныя ўстановы – акадэміі і семінарыі. Царква атрымала права друку і выдання літаратуры.

**8 верасня 1943 г**. у Маскве адбыўся **Архіерэйскі сабор**, які выбраў мітрапаліта Маскоўскага Сергія патрыярхам Маскоўскім і Усея Русі. 8 кастрычніка таго ж года быў створаны Савет па справах

Библиотека БГУИР

Рускай Праваслаўнай Царквы пры Саўнаркоме СССР, якому даводзілася роля пасрэдніка паміж урадам і царквой.

Гітлераўскія ўлады на акупіраванай тэрыторыі праводзілі палітыку раз'яднання і раскола царквы з тым, каб *«кожная вёска была ператворана ў незалежную секту»*. У Беларусі, напрыклад, акупацыйныя ўлады стварылі аўтакефальную Беларускую Царкву, пазбавіўшы яе кананічнага адзінства з Маскоўскай Патрыярхіяй. Такія ж спробы рабілі фашысты ў Прыбалтыцы і на Украіне.

З канца 1943 г. у Савецкім Саюзе адкрываліся для службы храмы, расла колькасць праваслаўных абшчын, вярталася з лагераў рэпрэсаванае духавенства. Прыпыняліся прамыя ганенні на веруючых і дзікі шабаш «Саюза ваяўнічых безбожнікаў». Пакуль ішла вайна, веруючыя сабралі некалькі сот мільёнаў рублёў, на якія былі пабудаваны танкавая калона імя Дзмітрыя Данскога і авіяэскадрылья імя Аляксандра Неўскага. Людзі, аддаючы апошняе, ахвяроўвалі добраахвотна.

Разгром пад Сталінградам стаў зыходным пунктам для нанясення новых udaраў па ворагу, паклаў пачатак магутнаму наступленню Чырвонай Арміі зімой 1942 – 1943 гг. на Паўночным Каўказе, у раёне Верхняга і Ніжняга Дона, пад Варонежам, на цэнтральным участку фронту і пад Ленінградам.

Некаторыя гісторыкі, палітыкі і былыя вайскоўцы з Захаду ў сваіх публікацыях робяць спробу прынізіць значэнне Сталінградскай бітвы і ўзвысіць уздзеянне на ход Другой сусветнай вайны баявых дзеянняў англійскіх і амерыканскіх войск у Паўночнай Афрыцы, бітвы ў Эль-Аламейне (23 кастрычніка – 4 лістапада 1942 г.). Але пры гэтым яны не хочуць улічваць таго, што ў Сталінградскай бітве прымалі ўдзел больш за 1 млн гітлераўцаў і іх саюзнікаў, у той час як у бітве пад Эль-Аламейнам італа-германскія войскі налічвалі толькі 80 тыс. чал. Шырыня фронту пад Сталінградам складала 400 км, пад



Библиотека БГУИР

Эль-Аламейнам – 60 км. У Сталінградскай бітве нямецка-фашысцкія войскі згубілі забітымі і паланёнымі ў 15 разоў больш, чым у Афрыцы.

Летам 1943 г. фашысцкае камандаванне вырашыла зноў захапіць стратэгічную ініцыятыву, акружыць і знішчыць асноўныя сілы нашых армій у раёне Арла і Курска, а затым магутным ударам авалодаць Масквой. Для гэтай мэты тут былі сканцэнтраваны лепшыя войскі і найноўшая ваенная тэхніка. Савецкая разведка своечасова выявіла сілы ворага, план наступлення, час яго пачатку. Было прынята рашэнне савецкім войскам заняць абарону, а потым перайсці ў наступленне, калі вораг выкарыстае рэзервы. Аб сілах бакоў сведчаць наступныя даныя.

***Баявое забеспячэнне Чырвонай Арміі і вермахта***

| **Краіна** | **танкі** | **самалёты** | **колькасць войск** | **абарончыя збудаванні** |
|---|---|---|---|---|
| СССР | звыш 3 400 | каля 2 200 | 1млн 336 тыс. | 8 абарончых рубяжоў глыбінёй да 300 км |
| Германія | да 2 700 | звыш 2 000 | больш 900 тыс. | |

**Курская бітва** пачалася **5 ліпеня 1943 г**. Ноччу 5 ліпеня былі схоплены нямецкія сапёры, якія паказалі, што наступленне намечана на 3 гадзіны раніцы, і нямецкія войскі ўжо занялі зыходныя пазіцыі. Камандаванне Цэнтральнага і Варонежскага франтоў вырашыла правесці артылерыйска-авіяцыйную контрпадрыхтоўку. Такім чынам, фактар нечаканасці, на які разлічвала нямецкае камандаванне, быў ўпушчаны. Толькі ў 5 гадзін 30 хвілін ударныя групоўкі нямецкай арміі перайшлі ў наступленне. Савецкія войскі трымалі абарону да **12 ліпеня**. У гэты дзень у раёне **в. Прохараўка** адбылася самая вялікая ў гісторыі Другой сусветнай вайны танкавая бітва – з абодвух

Бібліятэка БГУІР

бакоў адначасова ўдзельнічала звыш 1 100 танкаў і самаходных гармат. Абодва бакі неслі цяжкія страты.

Бітва пад Курскам працягвалася 50 дзён на фронце ад 400 да 550 км. З абодвух бакоў у ёй удзельнічалі велізарныя сілы – каля 300 дывізій. У выніку была сарвана апошняя спроба Германіі разгарнуць буйное стратэгічнае наступленне на Усходнім фронце. Вораг быў вымушаны ў далейшым весці зацяжную вайну і прытрымлівацца абарончай стратэгіі, згубіўшы ў Курскай бітве 30 адборных дывізій, у тым ліку 7 танкавых. Маральны дух нямецкіх войск моцна ўпаў, узяць рэванш за Сталінград не ўдалося. А гэта значыла, што ўсе надзеі агрэсара на станоўчы зыход вайны з Расіяй праваліліся.

Страты савецкіх войск у гэтай бітве былі выключна вялікімі. Яны склалі 254,4 тыс. чал. забітымі, 608,8 тыс. чал. параненымі. Людскія страты праціўніка (па нямецкіх дадзеных) былі ў 3,5 разы меншымі. У тэхніцы савецкія войскі згубілі больш 6 тыс. танкаў і 1 600 самалётаў, тады як немцы – усяго 1 300 танкаў і каля 1 тыс. самалётаў. Вялікія страты ў танках тлумачацца тым, што нашаму Т-34 патрэбна была больш магутная пушка, чым 76-міліметровага калібра. Пушкі нямецкіх «тыграў» і «фердынандаў» мелі больш высокую пачатковую хуткасць бранябойнага снарада і дальнасць стральбы, а самі танкі і штурмавыя гарматы больш моцную бранявую абарону. Прычыны вялікіх страт савецкіх войск тлумачацца недастаткова ўмелым кіраўніцтвам военачальнікаў; няўдалым прымяненнем танкавых злучэнняў (франтальныя атакі супраць танкавых груповак праціўніка); няпоўным выкарыстаннем магчымасцей абароны, шаблонным падыходам да прарыву нямецкай абароны.

Курская бітва прымусіла нямецкае камандаванне зняць з міжземнаморскага тэатра ваенных дзеянняў буйныя злучэнні авіяцыі і іншых войск, вывесці большасць баяздольных дывізій Францыі і Галандыі. Зрыў нямецкага наступлення пад Курскам канчаткова

Библиотека БГУИР

ўпэўніў краіны фашысцкага блока ў тым, што суадносіны сіл карэнным чынам змяніліся на карысць Савецкага Саюза. Узмацніліся спробы Венгрыі заключыць сепаратны мір з Захадам. Восенню 1943 г. іспанскі дыктатар Франка выводзіць сваю «Галубую дывізію» з-пад Ленінграда. Вызначыўся крызіс у адносінах паміж Германіяй і Фінляндыяй. Капітуляцыя фашысцкай Італіі ў верасні 1943 г., безумоўна, з'явілася вынікам паражэння гітлераўскіх войск пад Курскам.

**12 – 15 ліпеня 1943 г**. арміі Заходняга, Бранскага і Цэнтральнага франтоў перайшлі ў контрнаступленне, якое працягвалася да **18 жніўня**. За гэты час яны адкінулі фашыстаў у заходнім напрамку на 150 км, ліквідавалі арлоўскі плацдарм. У выніку абстаноўка на цэнтральным участку савецка-германскага фронту рэзка змянілася. Для савецкіх войск адкрылася магчымасць для развіцця наступлення на Бранскім накірунку і выхада ва ўсходнія раёны Беларусі.

Белгарадска-Харкаўскую наступальную аперацыю войскі Варонежскага і Сцяпнога франтоў праводзілі з 3 па 23 жніўня 1943 г. У выніку начнога штурма 23 жніўня 1943 г. быў вызвалены Харкаў. Войскі двух франтоў адкінулі немцаў на захад прыкладна на 150 км і разгрмілі магутную групоўку ворага, стварыўшы ўмовы для вызвалення Левабярэжнай Украіны і выхада да Дняпра.

Як ужо адзначалася, Сталінградская бітва паклала пачатак карэннаму пералому ў ходзе вайны. Яго завяршэнне звязана з разгромам нямецка-фашысцкіх ордаў на Курскай дузе, паспяховым наступленнем Чырвонай Арміі летам – восенню 1943 г., разгромам фашыстаў на Левабярэжнай Украіне і вызваленнем сталіцы Украінскай ССР г. Кіева 6 лістапада 1943 г. У гэты час савецкія войскі вызвалілі шэраг усходніх раёнаў Беларусі, у тым ліку г. Гомель – буйны прамысловы і культурны цэнтр рэспублікі. Да канца 1943 г.

Бібліятэка БГУІР

было вызвалена больш паловы акупіраванай фашыстамі савецкай зямлі.

Улічваючы выключную цяжкасць, а часцей за ўсё і немагчымасць кіраваць дзейнасцю камуністычных партый з аднаго цэнтра ва ўмовах вайны, здольнасць кампартый самастойна вырашаць задачы, якія перад імі стаялі, Прэзідыум Выканкома Камуністычнага Інтэрнацыянала 15 мая 1943 г. прыняў рашэнне аб самароспуску Камінтэрна, што і было зроблена ў чэрвені 1943 г. Тым больш што, фашысцкая прапаганда выкарыстоўвала наяўнасць Камінтэрна для аслаблення антыгітлераўскай кааліцыі і раз’яднання антыфашысцкіх сіл.

**З 28 лістапада па 1 снежня 1943 г**. адбылася **Тэгеранская канферэнцыя**, на якой упершыню сустрэліся І. Сталін, Ф. Рузвельт і У. Чэрчыль. На канферэнцыі было прынята рашэнне аб адкрыцці другога фронту ў маі 1944 г. Разглядалася таксама пытанне аб Польшчы. К гэтаму часу адносіны паміж СССР і польскім эміграцкім урадам у Лондане сапсаваліся канчаткова ў сувязі з прапагандысцкай акцыяй нацыстаў з нагоды так званай «катынскай справы». У. Чэрчыль прапанаваў, каб тэрыторыя Польскай дзяржавы размяшчалася між лініяй Керзана і лініяй р. Одэр з уключэннем у склад Польшчы Усходняй Прусіі. На гэта І. Сталін сказаў, што *«русские не имеют незамерзающих портов на Балтийском море, поэтому русским нужны были бы незамерзающие порты Кенигсберг и Мемель (ныне Калининград и Клайпеда) и соответствующая часть Восточной Пруссии. Тем более что исторически – это исконно славянские земли. Если англичане согласны на передачу нам указанной территории, мы будем согласны с формулой, предложенной Черчиллем»*.

На канферэнцыі абмяркоўваліся таксама праблемы пасляваеннага ўладкавання Германіі. Савецкі Саюз не збіраўся падтрымліваць прапанову Англіі і ЗША аб расчляненні Германіі на асобныя

Библиотека БГУИР

дзяржавы з мэтай недапушчэння ў будучым новай агрэсіі. Вялікае палітычнае значэнне мела надрукаваная Дэкларацыя трох дзяржаў аб сумесных дзеяннях у вайне супраць фашысцкай Германіі і аб пасляваенным супрацоўніцтве паміж імі.

**3. Савецкія стратэгічныя наступальныя аперацыі ў 1944 г. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.** Трэці, завяршаючы перыяд Вялікай Айчыннай вайны пачаўся ў **студзені 1944 г**. і закончыўся ў **маі 1945 г**.

Па сведчанні Г.К. Жукава, у снежні 1943 г. *«в узком кругу лиц»* І.В. Сталін паставіў пытанне аб новай форме правядзення ваенных кампаній у 1944 г. Наяўнасць стратэгічнай ініцыятывы ў руках савецкага камандавання, выгаднае размяшчэнне войск, дастатковыя людскія і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы дазвалялі правесці буйныя аперацыі не на адным-двух накірунках, а паслядоўна на ўсім фронце. Для пачатку наступальных аперацый было выбрана 10 раёнаў. *«Теперь, – сказал И.В. Сталин, – мы стали сильнее, наши войска опытнее. Мы не только можем, но и должны проводить операции на окружение»*.

І сапраўды, да пачатку 1944 г. у дзеючай арміі СССР налічвалася больш за 6,7 млн чал., 97 690 гармат і мінамётаў (без уліку рэактыўных установак), 5 628 танкаў і самаходна-артылерыйскіх установак, 8 818 баявых самалётаў. У арміі праціўніка на савецка-германскім фронце усяго налічвалася 4 906 тыс. чал. (у тым ліку войскі сатэлітаў – 706 тыс.). На ўзбраенні арміі было 54 570 гармат і мінамётаў, 5 400 танкаў і штурмавых гармат, 3 073 самалёты.

Вялікае значэнне для Савецкага Саюза на завяршаючым этапе вайны мела дапамога саюзнікаў (ЗША, Вялікабрытаніі, Канады) па ленд-лізу. Гэта, па выражэнні замежных гісторыкаў, быў *«акт рассчитанного своекорыстия»*. Да 1943 г. уключна дапамога СССР

Библиотека БГУИР

аказвалася амерыканцамі з такім разлікам, каб не даць яму, СССР, магчымасці атрымаць рашаючую перавагу над Германіяй. Англія аказвала дапамогу СССР *«во имя сохранения советско-германского фронта и предотвращения высадки вермахта на Британские острова»*.

За гады вайны Савецкаму Саюзу было пастаўлена па ленд-лізу ваеннай тэхнікі і іншых тавараў на суму 9,8 млрд долараў. У той жа час СССР паставіў ЗША па зваротнаму ленд-лізу тавараў і стратэгічнай сыравіны на суму 7,4 млрд долараў – хромавую і марганцавую руды, золата, плаціну, пушніну. Агульны аб'ём ленд-лізаўскіх паставак складаў, па падліках савецкіх эканамістаў, прыкладна 4 % валавой прамысловай вытворчасці СССР за гады вайны і 2,8 % вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Гэтыя пастаўкі не мелі рашаючай ролі ў дасягненні перамогі, як пішуць некаторыя гісторыкі Захаду, але пэўную ролю ў той цяжкі час яны, безумоўна, адыгралі.

Разам з тым трэба адзначыць, што памеры ленд-лізаўскіх паставак па асобных відах узбраенняў былі вельмі значнымі: аўтамабіляў (джыпы і студэбекеры) – каля 70 %, танкаў – 12 %, самалётаў – 10 %. Некаторыя віды тэхнікі – дэсантныя судны, некантактныя тралы, асобныя віды радыёлакацыйнай і гідраакустычнай апаратуры ў нашай краіне наогул не выраблялiся. Дастаўка грузаў у Савецкі Саюз ішла ў асноўным па трох акіянскіх маршрутах: праз Паўночную Атлантыку; Паўднёвую Атлантыку, Персідскі заліў і Іран; па Ціхаакіянскаму маршруту. Цяжкія страты неслі саюзныя маракі на небяспечных акіянскіх камунікацыях. Толькі на Паўночным марскім шляху загінула каля 100 транспартных суднаў і каля двух дзесяткаў баявых караблёў.

11 мая 1945 г. прэзідэнт ЗША Г. Трумэн выдаў дырэктыву аб прыпыненні Савецкаму Саюзу паставак па ленд-лізу для ваенных



Библиотека БГУИР

дзеянняў у Еўропе, а ў жніўні – распараджэнне аб прыпыненні ўсялякіх паставак у СССР з моманту падпісання акта аб капітуляцыі Японіі.

**У 1944 г. Чырвоная Армія нанесла 10 сакрушальных удараў па ворагу. Якія былі важнейшыя наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі?**

1. **Студзень 1944 г**. – наступленне войск Ленінградскага, Волхаўскага і 2-га Прыбалтыйскага франтоў ва ўзаемадзеянні з Балтыйскім флотам пад Ленінградам і Ноўгарадам, зняцце блакады Ленінграда, уступленне савецкіх войск на тэрыторыю Эстоніі.

2. **Люты – сакавік 1944 г**. – буйныя наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі ў раёне г. Корсунь-Шаўчэнкаўскі (Чаркаская вобласць) і на Паўднёвым Буге, акружэнне і знішчэнне варожых груповак войск у раёнах Корсунь-Шаўчэнкаўскі і Звянігарадок-Умань, вызваленне Правабярэжнай Украіны. 26 сакавіка 1944 г. савецкія войскі выйшлі на граніцу з Румыніяй.

3. **Красавік – май 1944 г**. – войскі 3- і 4-га Украінскіх франтоў ва ўзаемадзеянні з Чарнаморскім флотам вызвалілі Крым і Адэсу.

4. **Чэрвень 1944 г**. – войскі Ленінградскага і Карэльскага франтоў перайшлі ў наступленне пры падтрымцы Балтыйскага флоту на Карэльскім перашыйку і ў Паўднёвай Карэліі. Праціўнік быў адкінуты на тэрыторыю Фінляндыі. У жніўні 1944 г. Фінляндыя запрасіла ў СССР перамір'я, а 4 верасня заявіла аб разрыве з Германіяй.

5. **Чэрвень – жнівень 1944 г**. – Беларуская наступальная аперацыя («Баграціён»), якая праводзілася з 23 чэрвеня па 29 жніўня супраць групы армій «Цэнтр», адна з буйнейшых у гэтай вайне. У ёй удзельнічалі арміі чатырох франтоў: 1-га Беларускага (камандуючы К. Ракасоўскі), 2-га Беларускага (камандуючы Г. Захараў), 3-га Беларускага (камандуючы І. Чарняхоўскі), 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы І. Баграмян), сілы Дняпроўскай ваеннай флатыліі,

Библиотека БГУИР

1-я армія Войска Польскага[1] і французскі авіяцыйны полк Нармандыя – Нёман. Шырыня фронту баявых дзеянняў дасягала 1 100 км, глыбіня руху войск – 560 – 600 км. У аперацыі «Баграціён» удзельнічалі 168 дывізій, 12 карпусоў і 20 брыгад. Агульная колькасць войск да пачатку аперацыі складала 2,3 млн чал.

Аперацыя пачалася раніцай **23 чэрвеня 1944 г**. Пасля артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках перайшлі ў наступленне войскі 1-га Прыбалтыйскага, 2- і 3-га Беларускіх франтоў. На другі дзень на варожыя пазіцыі абрушылі ўдар войскі 1-га Беларускага фронту. Дзеянні франтоў каардынавалі прадстаўнікі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання маршалы Савецкага Саюза Г.К. Жукаў і А.М. Васілеўскі.

Моцныя ўдары па камунікацыях і лініях сувязі акупантаў нанеслі беларускія партызаны. У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. пачаўся трэці этап «рэйкавай вайны». За тую ноч партызаны Беларусі ўзарвалі больш за 40 тыс. рэйкаў.

Да канца чэрвеня 1944 г. савецкія войскі акружылі і знішчылі віцебскую і бабруйскую групоўкі ворага. Была ліквідавана ў раёне Оршы групоўка, што прыкрывала мінскі напрамак. Абарона ворага на прасторы паміж Заходняй Дзвіной і Прыпяццю была ўзламана. 1 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Барысаў, а 3 ліпеня – Мінск. У раёне Мінска, Віцебска і Бабруйска было акружана і знішчана 30 гітлераўскіх дывізій.

Савецкія войскі працягвалі наступленне на захад. 16 ліпеня 1944 г. яны вызвалілі Гродна, а 28 ліпеня – Брэст. Нямецка-фашысцкія захопнікі былі поўнасцю выгнаны з беларускай зямлі.

[1] У кастрычніку 1943 г. першае баявое хрышчэнне каля п. Леніна Магілёўскай вобласці прыняла польская дывізія імя Т. Касцюшкі.

Библиотека БГУИР

Сёння у гонар Чырвонай Арміі – вызваліцельніцы Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на 21-м кіламетры Маскоўскай шашы высіцца Курган Славы, чатыры штыкі якога сімвалізуюць чатыры савецкія франты, воіны якіх удзельнічалі ў вызваленні рэспублікі.

6. **Ліпень – жнівень 1944 г**. – войскі 1-га Украінскага фронту (камандуючы І. Конеў) разграмілі групу армій «Паўночная Украіна» у раёне Броды – Рава-Руская – Львоў і ўтварылі за Віслай, на захад ад Сандаміра, буйны плацдарм. З’явілася магчымасць выгнання немцаў з Чэхаславакіі і Румыніі і рашаючага паходу на Берлін.

7. **Жнівень 1944 г**. – войскі 2- і 3-га Украінскіх франтоў (камандуючыя Р. Маліноўскі і Ф. Талбухін) разграмілі нямецка-фашысцкія войскі ў раёне Кішынёў – Ясы, ліквідавалі 22 варожыя дывізіі і выйшлі ў цэнтральныя раёны Румыніі. Малдавія была вызвалена, а Румынія і Балгарыя капітулявалі.

8. **Верасень – кастрычнік 1944 г**. – Чырвоная Армія дасягнула буйной перамогі ў Прыбалтыцы. 22 верасня быў вызвалены ад ворага Талін, 13 кастрычніка – Рыга. Эстонія і большая частка Латвіі былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

9. **Кастрычнік – снежань 1944 г**. – баі паміж Цісай і Дунаем, у выніку якіх Германія фактычна пазбавілася свайго апошняга саюзніка Венгрыі і была аказана дапамога Югаславіі ў вызваленні Белграда.

10. **Кастрычнік 1944 г**. – войскі Карэльскага фронту і Паўночнага флоту завяршылі разгром і выгнанне фашыстаў з савецкага Запаляр’я і паўночных раёнаў Нарвегіі.

У выніку дзесяці магутных udараў Чырвонай Арміі дзяржаўная граніца СССР была адноўлена на ўсёй адлегласці ад Баранцава да Чорнага мора. Гітлераўцы былі выгнаны з Румыніі і Балгарыі, з большасці раёнаў Польшчы і Венгрыі. Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Чэхаславакіі, ва ўзаемадзеянні з Народна-вызваленчай арміяй Югаславіі ачысціла ад захопнікаў усходнія раёны гэтай краіны.



Библиотека БГУИР

Чырвоная Армія выканала сваю гістарычную місію. Яна вызваліла ў 1944 – 1945 гг. 11 краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы з насельніцтвам 113 млн чал. Сотні тысяч, мільёны чалавечых жыццяў заплаціў савецкі народ за вызваленне еўрапейскіх краін ад фашысцкага іга. Так, пры вызваленні Польшчы загінула 600 тыс. савецкіх ваеннаслужачых, Чэхаславакіі і Венгрыі – па 140 тыс., Румыніі – каля 69 тыс., Югаславіі – 8 тыс., Аўстрыі – 26 тыс., Нарвегіі – больш 2 тыс., Фінляндыі – каля 2 тыс.

У гады вайны праводзілася **дэпартацыя некаторых народаў СССР**. Першымі прымусоваму перасяленню падверглісь ў 1941 – 1942 гг. савецкія немцы, галоўным чынам з аўтаномнай рэспублікі немцаў Паволжа і з Паўночнага Каўказа. Больш 40 тыс. сем'яў савецкіх немцаў былі перасялены на тэрыторыю Казахскай ССР і Сібіры за тое, што яны маглі супрацоўнічаць з ворагам, стаць «пятай калонай» у дзяржаве. Выйшаў загад аб адлічэнні немцаў з дзеючай арміі. Такое ж беззаконне было дапушчана ў адносінах карэйцаў і туркаў-месхецінцаў.

У канцы лютага 1944 г. з месцаў гістарычнага пражывання было выселена 650 тыс. чачэнцаў, інгушоў, калмыкаў, карачаеўцаў і балкарцаў. Пры высяленні выкарыстоўваліся буйныя сілы войск НКУС і аператыўны чэкісцкі склад. Напрыклад, пры высяленні за некалькі дзён чачэнцаў і інгушоў было задзейнічана 100 тыс. салдат і афіцэраў, 19 тыс. аператыўных работнікаў НКУС, НКДБ і «СМЕРШ». Чачэнцы, інгушы, карачаеўцы і балкарцы былі расселены ў Казахскай і Кіргізскай ССР; калмыкі – у Краснаярскім і Алтайскім краях, Новасібірскай і Омскай абласцях. Вясной 1944 г. былі адазваны з фронту і накіраваны на новыя месцы жыхарства каля 150 тыс. чачэнцаў, інгушоў і карачаеўцаў. У іх забіраліся ваенныя білеты, ім забаранялася насіць пагоны.

Библиотека БГУИР

У маі 1944 г. пасля вызвалення Крыма пастановай Дзяржаўнага Камітэта Абароны каля 225 тыс. крымскіх татар, а таксама балгараў, грэкаў і армян, якія пражывалі ў Крыме, канвойнымі войскамі НКУС былі вывезены ў асноўным на тэрыторыю Узбекскай ССР.

Па дадзеных НКУС, да восені 1944 г. агульная колькасць выселеных складала 1 514 тыс. чал. Ва ўрадавых дакументах называліся наступныя мэты высялення: стабілізацыя палітычнай сітуацыі ў гэтым рэгіёне і ліквідацыя бандытызму, ачыстка тэрыторыі ад «антысавецкіх шпіёнскіх элементаў», пакаранне за дапамогу фашыстам і выступленне супраць савецкай улады.

Адказнасць за здзейсненыя злачынствы, у тым ліку і за здраду Радзіме, заўсёды персанальная. Савецкае кіраўніцтва неабгрунтавана абвінаваціла цэлыя народы ў здрадзе Радзіме толькі на той падставе, што частка іх прадстаўнікоў гэтыя злачынствы сапраўды здзейсніла. У гэтым віна тагачаснага кіраўніцтва СССР і трагедыя народаў, якія падвергліся прымусовай дэпартацыі.

## Лекцыя 8. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны

***План***

1. Адкрыццё другога фронту. Заключныя аперацыі Чырвонай Арміі ў Еўропе. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны. Уклад беларускага народа ў разгром фашысцкай Германіі.
2. Разгром Квантунскай арміі. Капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны.
3. Крыніцы перамогі, вынікі і ўрокі Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны.

**1. Адкрыццё другога фронту. Заключныя аперацыі Чырвонай Арміі ў Еўропе. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны. Уклад беларускага народа ў разгром фашысцкай Германіі.** Яшчэ



Библиотека БГУИР

летам 1941 г. савецкі ўрад паставіў пытанне перад кіраўніцтвам Англіі аб адкрыцці другога фронту ў Заходняй Еўропе, што дазволіла б адцягнуць з Усходняга фронту 35 – 40 нямецкіх дывізій. Урады Англіі і ЗША абяцалі адкрыць другі фронт у 1942 г., але летам іх войскі высадзіліся ў Паўночнай Афрыцы; абяцалі адкрыць другі фронт у 1943 г., але высадзіліся ў Паўднёвай Італіі невялікімі сіламі. Тры гады вермахт бесперашкодна накіроўваў амаль усе свае сілы на савецка-германскі фронт. Гэта не было выпадковым. У. Чэрчыль неаднаразова заклікаў стварыць пад эгідай Англіі і ЗША аб'яднаную Еўропу, накіраваную супраць «рускага варварства», здольнага знішчыць еўрапейскую культуру і дзяржаўнасць. Лідэры Англіі і ЗША разлічвалі на максімальнае аслабленне СССР і разгром яго арміяй фашысцкай Германіі і яе сатэлітаў. Мэтай было ўстанаўленне ў пасляваенным свеце амерыкана-англійскага панавання, ператварэнне Савецкага Саюза ў другасную і залежную дзяржаву.

Аднак пераканаўчыя перамогі Чырвонай Арміі, нарастаючая барацьба народаў акупіраваных краін, іх магчымасць сумеснымі намаганнямі разграміць фашызм і вызваліць Еўропу прымусілі ўрады ЗША і Англіі адкрыць **другі фронт 6 чэрвеня 1944 г.** і аднавіць прыпыненае 8 месяцаў перад гэтым наступленне ў Італіі. Саюзнікі ставілі сваёй мэтай не дапусціць Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Еўропы, забяспечыць прасоўванне англа-амерыканскіх войск як мага далей на Усход. Англія і ЗША ў гэты час не пагадзіліся заключыць сепаратны мір з Германіяй і пайсці на саюз з ёй, бо былі няўпэўнены ў перамозе войск кааліцыі над войскамі СССР. Яны ўлічвалі таксама сілу грамадскай думкі яўрэйскай абшчыны ЗША (5 млн чал.), яе патрабаванні разгрома Германіі і пакарання фашыстаў за злачынствы супраць яўрэяў.

Амерыканскія, англійскія і канадскія войскі ў чэрвені 1944 г. высадзіліся на ўзбярэжжы Паўночнай Францыі ў Нармандыі

Библиотека БГУИР

(аперацыя «Аверлорд»). Саюзнікі мелі над немцамі перавагу ў колькасці асабовага саставу і танкаў у 3 разы, у самалётах – больш чым у 60 разоў, валодалі поўнай перавагай і на моры. 15 жніўня амерыканскія і французскія злучэнні высадзіліся на поўдні Францыі. 11 верасня наступаўшыя з поўначы і поўдня групоўкі саюзнікаў злучыліся і ўтварылі адзіны стратэгічны фронт у Заходняй Еўропе.

Актыўна падтрымаў саюзныя войскі французскі рух Супраціўлення, які налічваў 500 тыс. чал. 18 жніўня ў Парыжы пачалося антыфашысцкае паўстанне і праз 4 дні ўвесь горад быў у руках паўстаўшых. Да канца года Францыя і большая частка Бельгіі былі вызвалены. У выніку паспяховых аперацый саюзнікаў (да канца 1944 г. выйшлі да нямецкай абарончай лініі Зігфрыда) Германія апынулася паміж двума франтамі – Заходнім і Усходнім.

У лютым 1945 г. саюзныя арміі пачалі агульнае наступленне на Захадзе. Фарсіраваўшы ў сакавіку Рэйн, яны акружылі ў Руры 325-тысячную групоўку нямецкіх войск, якая здалася саюзнікам ў палон ў красавіку. З гэтага часу саюзныя арміі перамяшчаліся на ўсход, практычна не сустракаючы арганізаванага супраціўлення немцаў.

4 – 11 лютага 1945 г. адбылася **Крымская (Ялцінская) канферэнцыя** лідэраў трох саюзных дзяржаў: І.В. Сталіна, Ф.Д. Рузвельта і У. Чэрчыля. У ёй прымалі ўдзел таксама міністры замежных спраў трох краін, прадстаўнікі генеральных штабоў, палітычныя і ваенныя дарадцы. Пасля заканчэння канферэнцыі У. Чэрчыль заявіў: *«Мне не известно ни одно правительство, которое выполняло бы свои обязательства более точно, нежели русское Советское правительство»*. Амерыканскі дзяржсакратар Стэдтэніўс адзначаў, што *«в Ялте уступки Советского Союза Соединённым Штатам и Англии были больше, чем их уступки Советам»*.



Библиотека БГУИР

Сёння ўсё часцей з’яўляюцца сцвярджэнні аб тым, што І. Сталін, быццам бы *«обманул западные державы»*. Аднак факты сведчаць зусім аб іншым. На канферэнцыі было падпісана сакрэтнае пагадненне, якое прадугледжвала ўступленне Савецкага Саюза ў вайну з Японіяй праз 2 – 3 месяцы пасля капітуляцыі Германіі. Гэтае рашэнне асабліва вітаў Ф. Рузвельт, бо амерыканцы лічылі, што пасля капітуляцыі Германіі для разгрома Японіі спатрэбіцца 1,5 – 2 гады. Аднак уступленне ў вайну з Японіяй І. Сталін у Ялце агаворваў шэрагам патрабаванняў: аднаўленне ранейшых правоў Расіі, якія былі парушаны Японіяй у 1904 г. – вяртанне паўднёвай часткі Сахаліна і прылеглых да яго астравоў, арэнда Порт-Артура ў якасці савецкай ваенна-марской базы, прызнанне савецкіх інтарэсаў на Кітайска-Усходняй і Паўднёва-Манчжурскай чыгунках, перадача Савецкаму Саюзу Курыльскіх астравоў. Умовы былі прыняты Ф. Рузвельтам і У. Чэрчылем, аб чым было складзена спецыяльнае пагадненне.

Згодна з умовамі падпісанага на канферэнцыі пагаднення ўзброеныя сілы трох дзяржаў у ходзе акупацыі Германіі павінны былі размясціцца ў пэўных зонах. Узброеным сілам СССР адводзілася ўсходняя частка Германіі. Раён «Вялікага Берліна» павінны былі заняць узброеныя сілы СССР, ЗША і Англіі. Прадугледжвалася выплата Германіяй рэпарацый у суме 20 млрд долараў за разбурэнні і ахвяры, у тым ліку 10 млрд долараў – СССР. Савецкі Саюз выказаўся за ўстанаўленне граніц Польшчы на захадзе па рэках Одэр і Нейсэ (цяпер Ныса-Лужыцка) і пацвердзіў устанаўленне граніцы па лініі Керзана на ўсходзе. Кіраўнікі трох краін прынялі рашэнне аб скліканні 25 красавіка 1945 г. у Сан-Францыска канферэнцыі Аб’яднаных Нацый з мэтай падрыхтоўкі ўстава міжнароднай арганізацыі бяспекі.

У студзені 1945 г. у выніку Вісла-Одэрскай аперацыі войскі 1-га Беларускага і 1-га Украінскага франтоў вызвалілі большую частку



Библиотека БГУИР

Польшчы і выйшлі на Одэр, захапіўшы шэраг плацдармаў на заходнім беразе. Самай працяглай і цяжкай для савецкіх войск з усіх аперацый 1945 г. з'яўлялася Усходне-Пруская (13 студзеня – 25 красавіка), якая скончылася разгромам варожай групоўкі.

**Берлінская аперацыя** пачалася **16 красавіка 1945 г**. У ёй удзельнічалі войскі 1- і 2-га Беларускіх і 1-га Украінскага франтоў з выкрыстаннем сіл Балтыйскага флоту, Дняпроўскай ваеннай флатыліі, авіяцыі далёкага дзеяння, а таксама 1- і 2-й армій Войска Польскага. Усяго ў аперацыі ўдзельнічала 2,5 млн чал., 41,6 тыс. гармат і мінамётаў, 6 250 танкаў і самаходных гармат, 7,5 тыс. баявых самалётаў. Берлін быў акружаны. Пачаліся цяжкія, кровапралітныя вулічныя баі. 25 красавіка войскі 1-га Украінскага фронту і амерыкана-англійскія саюзнікі ўдарамі з усходу і захаду рассеклі нямецкі фронт і злучыліся на Эльбе ў раёне Торгаў.

Нацысцкі рэжым перажываў агонію. Амаль усе паплечнікі Гітлера пакінулі яго. 29 красавіка ён прыняў рашэнне скончыць жыццё самагубствам. У гэты дзень ён даведаўся, што італьянскія партызаны злавілі і павесілі Мусаліні. 30 красавіка, прыкладна праз дзве гадзіны пасля таго, як над рэйхстагам, які знаходзіўся амаль побач з падземным бункерам рэйхсканцэлярыі, быў узняты чырвоны сцяг, Гітлер застрэліўся. Яго цела аблілі бензінам і спалілі. 2 мая гарнізон Берліна капітуляваў.

Бітва за Берлін была адной з самых кровапралітных аперацый заключнага этапа Вялікай Айчыннай вайны. У ёй абодва бакі за любы кошт стараліся дасягнуць сваіх мэт. У ходзе берлінскай аперацыі савецкія войскі разграмілі 93 дывізіі ворага, узялі ў палон 480 тыс. салдат і афіцэраў, вялікую колькасць ваеннай тэхнікі. Аднак вялікія страты панеслі і савецкія войскі. За час штурму Берліна яны страцілі 362 тыс. чал. забітымі і параненымі.

Библиотека БГУИР

Берлінская аперацыя ўвайшла ў гісторыю як пераможнае завяршэнне таго цяжкага і слаўнага шляху, які прайшла Чырвоная Армія ў гады вайны. Апоўначы **8 мая** ў прадмесці Берліна – **Карлсхорсце** ў прысутнасці прадстаўнікоў камандавання армій СССР, ЗША, Англіі і Францыі прадстаўнікі пераможанай фашысцкай Германіі падпісалі **акт аб безагаворачнай капітуляцыі** сваіх узброеных сіл.

У ноч на **9 мая 1945 г**. усе радыёстанцыі Савецкага Саюза працавалі без звычайнага начнога перапынку: чакалі надзвычайнага паведамлення з Берліна. І нарэшце ў 2 гадзіны 10 хвілін у эфіры прагучала доўгачаканная вестка аб Вялікай Перамозе. Вайна ў Еўропе скончылася. Чырвоная Армія, якая ўнесла асноўны ўклад у разгром гітлераўскай Германіі, пазбавіла свет ад фашысцкага іга. 24 чэрвеня 1945 г. на Краснай плошчы ў Маскве адбыўся парад Перамогі.

Сярод пагадненняў, якія былі падпісаны саюзнікамі ў Ялце, адно тычылася абмена ваеннапалоннымі. Яно насіла сакрэтны характар. У пагадненні адзначалася, што *«все советские граждане, освобождённые союзными войсками»*, павінны быць перададзены савецкім прадстаўнікам улады ў пэўных пунктах і ва ўстаноўленым парадку. Гэта акцыя насіла прымусовы характар. Жыхары Прыбалтыкі, Заходняй Украіны, Заходняй Беларусі, Правабярэжнай Малдавіі і Паўночнай Букавіны, якія апынуліся на тэрыторыі, занятай англа-амерыканскімі войскамі, абавязковай рэпатрыяцыі не падлягалі.

У маі – чэрвені 1945 г. англічане выдалі са сваёй зоны акупацыі Савецкаму Саюзу: казацкія часці пад камандаваннем Даманава, 15-ы казацкі кавалерыйскі корпус генерала фон Панвіца, часці генерала А. Шкуро, каўказскія часці пад камандаваннем Клыч Гірэя. Прымусовая дэпартацыя савецкіх ваеннапалонных ажыццяўлялася і з амерыканскай акупацыйнай зоны.

Библиотека БГУИР

Да 1 сакавіка 1946 г. было рэпатрыіравана 5,4 млн савецкіх грамадзян (3,6 млн цывільных і 1,8 млн ваеннапалонных). Пасля праверкі і фільтрацыі іх органамі НКУС, НКДБ і контрразведкі «СМЕРШ» іх размеркавалі наступным чынам: па месцу жыхарства (уключаючы спецпасяленні) было накіравана 58 %, прызвана ў армію – 19, залічана ў рабочыя батальёны наркамата абароны – каля 15, перададзена ў распараджэнне НКУС – каля 7 % (пераважна ваеннапалонных). Рэпатрыянтам аб'яўлялася, што яны захоўваюць усе правы грамадзян СССР. На практыцы было зусім не так. Напрыклад, прымусова вывезеных у Германію ў якасці «остарбайтэраў» савецкая ўлада іншы раз разглядала як людзей, якія здзейснілі «добраахвотны выезд у варожую краіну». Ваеннапалонных лічылі здраднікамі Радзімы. За здачу ў палон ворагу, не выкліканую баявой абстаноўкай, прысуд быў адзіны – расстрэл. У час вайны вызваленыя з варожага палону салдаты правяраліся, пасля чаго радавы і сяржанцкі склад, як правіла, аднаўляўся на ваеннай службе, афіцэры ж пазбаўляліся званняў і накіроўваліся ў штрафныя батальёны. Тых, хто ў гады акупацыі служыў фашыстам, прыцягвалі да крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з савецкім заканадаўствам.

Праўда гісторыі і ў тым, што невялікая частка ваеннаслужачых з-за нянавісці да савецкай улады, кар'ерысцкіх памыслаў, маладушша, а таксама жадання фізічна выжыць перайшла ў гады вайны на бок ворага. Сярод фашысцкіх паслугачоў было нямала рэпрэсіраваных ваенных, прадстаўнікоў белага руху, раскулачаных, расказачаных і іншых замардаваных людзей краіны, пацярпелых ад прымусовай калектывізацыі і калгаснага ладу. Яны разглядалі вайну як зручны час для звядзення рахункаў з савецкай уладай, удзельнічалі ва ўстанаўленні фашысцкага акупацыйнага рэжыму, масавых расстрэлах савецкіх людзей у якасці палачоў, у вывазе моладзі на



Библиотека БГУИР

катаржныя работы ў Германію, служылі ў акупацыйным апараце, паліцыі, выступалі ў ролі шпіёнаў і правакатараў. Былі сярод фашысцкіх паслугачоў і падманутыя, запалоханыя людзі, якія заблыталіся ў жыцці і памылкова лічылі, што немцы пачалі паход на Усход з тым, каб *«вызваліць народы Савецкага Саюза ад бальшавісцкай тыраніі»*.

Па заходніх ацэнках, у нямецкіх часцях да сярэдзіны 1943 г. налічвалася ад 400 да 600 тыс. добраахвотнікаў (пераважна з ліку савецкіх ваеннапалонных). Акрамя гэтага на баку немцаў дзейнічалі асобныя баявыя часці, якія пачалі стварацца з добраахвотнікаў са студзеня 1942 г. Усяго за гады вайны было створана 90 пяхотных батальёнаў колькасцю каля 1 000 чал. кожны (26 – туркестанскіх, 15 – азербайджанскіх, 13 – грузінскіх, 12 – армянскіх, 9 – паўночна-каўказскіх, 8 – крымскіх татар, 7 – волжскіх татар і іншых народаў Паволжа і Урала).

Да вясны 1943 г. была сфарміравана 1-я казацкая дывізія пад камандаваннем фон Панвіца. Акрамя гэтага, дзейнічаў яшчэ шэраг часцей і злучэнняў, ахоўных падраздзяленняў, дапаможных нямецкіх каманд (да канца 1944 г. у войсках СС налічвалася 7 дывізій з украінцаў, беларусаў і прыбалтаў). Агульная лічба калабарацыяністаў складае, на думку зарубежных аўтараў, каля 1 млн чал. Савецкія ваенныя гісторыкі лічаць гэтую лічбу падвышанай.

У маі 1945 г. закончыла свой шлях руская вызваленчая армія (РВА) на чале з генералам-здраднікам Уласавым. У гістарыяграфіі ўжо развеяны міфы аб тым, быццам у гады вайны пад сцягамі РВА змагалася супраць СССР каля 1 млн савецкіх грамадзян, быццам Уласаў здаў пад Ленінградам 2-ю ударную армію, быццам ён быў і супраць Сталіна, і супраць Гітлера, *«ідэйным барацьбітом супраць іуда-бальшавіцкай улады»*, выразнікам надзей і інтарэсаў простых

Бібліятэка БДУІР

рускіх людзей, а таму, маўляў, уласаўцаў можна ставіць у адзін шэраг з вязнямі сталінскіх лагераў.

А. Уласаў, савецкі кадравы ваенны, 15 красавіка 1942 г. заняў пасаду камандуючага 2-й ударнай арміяй на Волхаўскім фронце. У гэты момант армія знаходзілася амаль у поўным акружэнні, у выніку наступных баявых дзеянняў была разгромлена, больш 30 тыс. чал. апынуліся ў палоне, нямногім удалося выйсці да сваіх. 12 ліпеня 1942 г. Уласаў трапляе ў рукі нямецкага патруля. Пасля кароткіх роздумаў ён прымае рашэнне аб супрацоўніцтве з ворагам. Як вядома, ні 2-я ўдарная армія, ні яе штаб у палон не здаваліся.

У спецыяльным мемарандуме, які быў падрыхтаваны ў пачатку жніўня 1942 г. А. Уласавым разам з былым камандзірам 41-й стралковай дывізіі палкоўнікам Баярскім уся віна за паражэнне Чырвонай Арміі ўскладалася на Сталіна і яго рэжым, які, на думку аўтараў дакумента, трымаецца на штыках НКУС. Для звяржэння ўрада і стварэння «новай Расіі» прапаноўвалася арганізаваць з насельніцтва акупіраваных абласцей і ваеннапалонных «рускую армію».

Больш двух гадоў імя Уласава актыўна выкарыстоўвалася немцамі ў антысавецкай прапагандзе. У лістоўках, якія распаўсюджваліся на акупіраванай тэрыторыі і ў тыле Чырвонай Арміі, сцвярджалася, што перад РВА стаяць задачы: *«звяржэнне Сталіна і яго кагала (жыдоў); стварэнне ў садружнасці з германскім і іншымі народамі Еўропы новай, сапраўды свабоднай Расіі без калгасаў і прымусовай працы ў лагерах НКУС; аднаўленне гандлю, рамёстваў, саматужных промыслаў і дазваленне магчымасцей прыватнай ініцыятывы ў гаспадарчым жыцці краіны; гарантыя нацыянальнай свабоды; забеспячэнне жыццёвага мінімуму інвалідам вайны і іх сем'ям»*. З дапамогай антысавецкай нацыяналістычнай прапаганды Уласаў і яго акружэнне разыгрывалі антысеміцкую карту гітлераўцаў і аказвалі націск на пачуцці людзей, незадаволеных



Библиотека БГУИР

савецкай уладай. У 1943 г. А. Уласаў зрабіў некалькі агітацыйных паездак на акупіраваныя тэрыторыі і выступіў перад шырокімі аўдыторыямі ў Смаленску, Рызе, Магілёве, Пскове, Гатчыне і іншых гарадах, але так і працягваў заставацца генералам без войска.

І толькі карэнныя змены ваеннай сітуацыі на савецка-германскім фронце прымусілі немцаў даць згоду на стварэнне РВА. Да красавіка 1945 г. былі сфарміраваны 3 дывізіі (адна ў поўным складзе), супрацьтанкавая брыгада, ваенна-паветраныя падраздзяленні; адкрыта афіцэрскае вучылішча. Сухапутныя сілы РВА налічвалі каля 45 тыс. чал. Аснову іх складалі ваеннапалонныя, у тым ліку тыя, хто прайшоў службу ў рускіх пяхотных батальёнах і дывізіях СС. Сярод бліжэйшага акружэння А. Уласава былі генерал-маёр Ф. Трухін (былы начальнік аператыўнага аддзела Паўночна-Заходняга фронту), В. Малышкін (былы начальнік штаба 19-й арміі), Г. Жылянкоў (былы член Ваеннага Савета 32-й арміі), С. Бунячэнка (былы камандзір 389-й стралковай дывізіі), Д. Закутны (былы начальнік штаба 21-га стралковага корпуса) і шэраг іншых афіцэраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі. Знішчальную і бамбардзіровачную эскадрыллі РВА ўзначальвалі Героі Савецкага Саюза С. Бычкоў і Б. Анцілеўскі. Войскі РВА двойчы ўдзельнічалі ў баях супраць Чырвонай Арміі – у лютым і красавіку 1945 г. на Одэры.

2 жніўня 1946 г. газета «Правда» надрукавала паведамленне аб судовым працэсе над уласаўцамі і смяротным пакаранні 12 чалавек на чале з А. Уласавым. 148 тыс. з іх былі сасланы на 6-гадовае спецпасяленне (у гэту катэгорыю МУС і МДБ залічвалі служыўшых не толькі ў РВА, але і ў нацыянальных легіёнах, паліцыі і інш.).

**Патсдамская канферэнцыя** кіраўнікоў краін-пераможцаў: СССР (І.В. Сталін), ЗША (Г.Трумэн) і Вялікабрытаніі (У. Чэрчыль, з 28 ліпеня К. Этлі) адбылася **17 ліпеня – 2 жніўня 1945 г**. На канферэнцыі абмяркоўвалася праблема пасляваеннага ўладкавання

Германіі, пацверджаны рашэнні Крымскай канферэнцыі па гэтым пытанні, прынята рашэнне аб дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Германіі, пакаранні ваенных злачынцаў, сістэме чатырохбаковай акупацыі краіны і чатыробаковым кіраванні Берлінам, аб рэпарацыях, аб заходняй граніцы Польшчы, перадачы СССР г. Кенігсберга і прылягаючых да яго раёнаў.

Адным з важнейшых дасягненняў Патсдамскай канферэнцыі з'явілася зацверджанне Савета міністраў замежных спраў, першачарговай задачай якога была падрыхтоўка праектаў мірных дагавароў з Італіяй, Румыніяй, Балгарыяй, Венгрыяй і Фінляндыяй.

Аднак трэба заўважыць, што становішча ў Патсдаме карэнным чынам адрознівалася ад становішча ў Тэгеране і Ялце. Па шырокаму колу пытанняў гучала шмат рэзкіх узаемных абвінавачванняў. Амерыканская і англійская дэлегацыі разглядалі савецкую палітыку ў Балгарыі і Румыніі як парушэнне ялцінскай Дэкларацыі аб вызваленай Еўропе. Савецкія прадстаўнікі абвінавачвалі Англію ў адносінах яе палітыкі ў Грэцыі. Але гэтыя і іншыя рознагалоссі не былі галоўнымі. Галоўныя разыходжанні праявіліся ў двух пытаннях – аб Германіі і аб Польшчы.

Пазіцыя прэзідэнта ЗША Трумэна была жорсткай. Гэта тлумачылася і тым, што ў час работы канферэнцыі прыйшло паведамленне аб паспяховым ажыццяўленні выпрабавання ў ЗША атамнай бомбы. *«Гэта*, – па словах Трумэна, – *прыдало яму ўпэўненасці ў перагаворах з рускімі»*.

Хаця на Патсдамскай канферэнцыі і на працягу наступных двух – трох гадоў яшчэ падтрымлівалася бачнасць «міра паміж Вялікай тройкай», у сапраўднасці Патсдам азнаменаваў сабой пачатак канца гэтага міру, галоўнай асновай якога, на думку савецкіх кіраўнікоў, быў сумесны кантроль над Германіяй. І ўсё ж канферэнцыя мела



Библиотека БГУИР

вялікае міжнароднае значэнне. Яна адыграла сваю ролю ў захаванні міру.

**Нюрнбергскі працэс.** Для правядзення суда над нямецкімі ваеннымі злачынцамі на Патсдамскай канферэнцыі быў створаны Міжнародны ваенны трыбунал. Ён пачаў сваю работу **20 лістапада 1945 г**. у Нюрнбергу і працягваўся да **1 кастрычніка 1946 г**. За цяжкія злачынствы гітлераўцаў супраць чалавецтва трыбунал прыгаварыў Герынга, Рыбентропа, Кейтэля, Розенберга, Франка, Фрыка, Кальтэнбрунэра, Штрэйхера, Йодля, Заўкеля, Зэйс-Інкварта і Бормана (завочна) да пакарання смерцю праз павешанне; Геса, Функа і Рэдэра – да пажыццёвага турэмнага зняволення; Шыраха, Шпеера, Нейрата – да розных тэрмінаў зняволення (ад 10 да 20 гадоў). Трыбунал прызнаў злачыннымі арганізацыі СС, СД, гестапа і кіраўнічы склад нацысцкай партыі, прадэманстраваў небяспеку адраджэння фашызму ў любой форме, прызнаў ілжывасць версіі аб «прэвентыўным» характары нападу фашысцкай Германіі на СССР.

Нюрнбергскі працэс адкрыў эру міжнароднага правасуддзя, упершыню ў гісторыі агрэсія на ім была прызнана *«найцяжэйшым міжнародным злачынствам»*.

У першыя пасляваенныя месяцы і гады ў Беларусі прайшлі судовыя працэсы над фашысцкімі ваеннымі злачынцамі ў Мінску, Бабруйску, Віцебску, Гомелі і іншых месцах, на якіх яны былі асуджаны і панеслі пакаранне за здзейсненыя злачынствы на тэрыторыі нашай рэспублікі.

**2. Разгром Квантунскай арміі. Капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны.** 5 красавіка 1945 г. савецкі ўрад дэнансіраваў дагавор з Японіяй аб нейтралітэце, а **8 жніўня**, выконваючы свае абавязацельствы перад саюзнікамі, аб’явіў ёй вайну. Некаторыя расійскія гісторыкі лічаць, што не доўг перад

Библиотека БГУИР

саюзнікамі, а доўг перад Расіяй – вяртанне захопленых японцамі ў 1904 г. рускіх тэрыторый (Паўднёвы Сахалін і Курыльскія астравы) – прымусіў Сталіна ўступіць у вайну з Японіяй. Савецкі Саюз аб'явіў вайну Японіі пасля таго, як японскі ўрад адверг Патсдамскую дэкларацыю саюзнікаў, якая заклікала Японію да капітуляцыі.

**9 жніўня – 2 верасня** войскі Забайкальскага, 1- і 2-га Далёкаўсходніх франтоў, сілы Ціхаакіянскага флоту і Амурскай ваеннай флатыліі ажыццявілі **Манчжурскую стратэгічную аперацыю**, акружылі і разграмілі Квантунскую армію, якая налічвала больш за 1 млн салдат і афіцэраў, 6,6 тыс. гармат і мінамётаў, больш за 1,2 тыс. танкаў, звыш 1,9 тыс. баявых самалётаў.

Адначасова была праведзена **Паўднёва-Сахалінская** (11 – 25 жніўня) і **Курыльская дэсантныя** (18 жніўня – 1 верасня) **аперацыі**. Савецкі Саюз вярнуў Паўднёвы Сахалін і Курыльскія астравы. Савецкія войскі былі ўведзены ў Паўночную Карэю.

**6 і 9 жніўня 1945 г**. амерыканцы скінулі на японскія гарады Хірасіму і Нагасакі атамныя бомбы. Іх ахвярамі сталі 114 тыс. мірных жыхароў. Усе людзі ясна зразумелі, што атамная бомба стала каласальным фактарам у палітыцы міравых дзяржаў і сапраўдная мэта прымянення атамных бомб – не ваенная неабходнасць, а тое, каб галоўным чынам запалохаць Савецкі Саюз.

**2 верасня 1945 г**. Японія падпісала **акт аб безагаворачнай капітуляцыі**. Другая сусветная вайна скончылася.

**Ратны і працоўны подзвіг жыхароў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны.** На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся больш за 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. На фронт нярэдка накіроўваліся цэлымі сем'ямі. Тадора Храбрая з Бялыніч адправіла на фронт шасцярых сваіх сыноў, столькі ж сыноў паслаў у Чырвоную Армію быхаўскі калгаснік Акім Красоўскі. Старэйшы з яго сыноў Сцяпан, які лятаў на штурмавіку,



Библиотека БГУИР

стаў маршалам авіяцыі. Анастасія Купрыянава з Жодзіна паслала на фронт 5 сваіх сыноў. Малодшы з іх Пётр праславіўся пры ліквідацыі акружанай групоўкі ворага на тэрыторыі Латвіі, паўтарыўшы подзвіг А. Матросава. У Жодзіне ўстаноўлены помнік маці-патрыётцы і пяці яе загінуўшым сынам. У хаце, дзе яна жыла, створаны музей. З сям'і Сцяпана Пляца, жыхара вёскі Азярцы Талачынскага раёна, з ворагам змагаліся 4 сыны і 2 нявесткі. За час вайны на самалётах яны зрабілі 2 640 баявых вылетаў, былі ўзнагароджаны 50 ордэнамі і медалямі, а нявесткі Руфіма і Раіса сталі Героямі Савецкага Саюза.

Мужна змагаліся з ворагам на заснежаных палях Падмаскоўя ўраджэнец Бешанковіцкага раёна генерал-маёр Л.М. Доватар, гамельчане браты-палкоўнікі Аляксандр і Пётр Лізюковы, ураджэнец Міншчыны Д.У. Гліцэвіч. Першы ў гісторыі вышынны паветраны таран здзейсніў у маскоўскім небе беларус А.М. Катрыч, першы начны паветраны таран – Віктар Талаліхін. За г. Ленінград змагаліся і аддалі свае жыцці віцэ-адмірал В.П. Дрозд, марскі лётчык А.К. Антоненка, снайпер Ф.А. Смалячкоў. Сын селяніна з в. Машканы Сенненскага раёна, лётчык А.К. Гаравец на Курскай дузе прыняў бой з 20-цю варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў праціўніка. Ён – адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў. А.К. Гаравец загінуў у тым жа баі. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Усяго 444 беларусы і ўраджэнцы Беларусі атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, чацвёра – П.Я. Галавачоў, І.І. Гусакоўскі, С.Ф. Шутаў, І.І. Якубоўскі – удастоены гэтага звання двойчы, 67 – сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеняў. Каля 400 тыс. воінаў-беларусаў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. За гады вайны каля 400 беларусаў сталі генераламі і адміраламі. Больш за 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў Беларусі былі ўзнагароджаны

Бiблiятэка БГУИР

ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, а 88 з іх сталі Героямі Савецкага Саюза.

Сотні тысяч ураджэнцаў Беларусі працавалі ў савецкім тыле: у Паволжы, на Урале, у Заходняй Сібіры, іншых рэгіёнах СССР. Беларускія чыгуначнікі А.М. Чухнюк, А.В. Глебаў, М.А. Макараў, І.П. Першукевіч і А.А. Янкоўскі за высокія працоўныя паказчыкі былі ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Важкі ўклад у разгром ворага ўносілі дзеячы беларускай навукі і культуры.

Нашы землякі прынялі актыўны ўдзел у антыфашысцкім руху Супраціўлення ў заходніх краінах Еўропы, куды занёс іх трагічны лёс вайны. Гэта датычыцца перш за ўсё жыхароў заходніх раёнаў Беларусі, якія былі дэпартаваны напярэдадні вайны ў Сібір і адтуль трапілі ў польскую армію генерала Андэрса, якая была сфарміравана на тэрыторыі Савецкага Саюза, а затым выйшла да саюзнікаў і ўдзельнічала ў цяжкіх баях за вызваленне Італіі.

У італьянскім руху Супраціўлення прымаў удзел адзін з лепшых памочнікаў камандзіра 16-й гарыбальдзійскай дывізіі «Вагано» 19-гадовы студэнт з Мінска Аляксандр. У памяці партызан засталося толькі яго імя. Аляксандр загінуў у снежні 1944 г. На італьянскай зямлі загінуў таксама А.К. Кісялёў, ураджэнец вёскі Стары Стан Клімавіцкага раёна, які змагаўся ў гарыбальдзійскай партызанскай брыгадзе «Матэоці». Шаснаццацігадовым юнаком быў адпраўлены на прымусовыя работы М.С. Фралоў з вёскі Сідаравічы Магілёўскага раёна. Апынуўшыся ў Італіі, ён уцёк да партызан. Пасля вызвалення Італіі атрымаў «пасведчанне патрыёта». Інжынер з Дзяржынска А.В. Варанкоў уцёк у 1943 г. з фашысцкага канцлагера, быў начальнікам штаба партызанскага атрада, а затым брыгады, што дзейнічала на тэрыторыі Бельгіі. Пасля выгнання фашысцкіх захопнікаў ён у ліку 30 іншых савецкіх партызан быў узнагароджаны вышэйшым ваенным ордэнам Бельгіі.



Библиотека БГУИР

Апынуўшыся ў канцэнтрацыйных лагерах, вязні з нашай рэспублікі наладжвалі кантакты з удзельнікамі антыфашысцкага руху на волі, прымалі ўдзел у стварэнні баявых цэнтраў, якія дзейнічалі ў Асвенцыме, Дахаў, Бухенвальдзе, Заксенхаўзене і інш. У Маўтхаўзене пасля генерал-лейтэнанта Дз.М. Карбышава, якога закатавалі гітлераўцы, падпольную арганізацыю ўзначаліў ураджэнец Чавусаў Магілёўскай вобласці палкоўнік Л.Я. Маневіч. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны план паўстання і да падыходу саюзнікаў паўстанцы захапілі лагер. У гэтым жа лагеры раней гітлераўцы расстралялі аднаго з актыўных удзельнікаў падпольнай арганізацыі, уражэнца вёскі Цяхцін Бялыніцкага раёна палкоўніка Д.Ф. Цумарава.

Найбольш моцным і арганізаваным быў рух савецкіх патрыётаў у Францыі. Там у кастрычніку 1943 г. быў створаны Цэнтральны камітэт былых савецкіх ваеннапалонных. Добра арганізаваныя атрады з савецкіх ваеннапалонных наносілі гітлераўцам адчувальныя страты. У руху Супраціўлення актыўна ўдзельнічалі і дочкі Беларусі. У Францыі яны арганізавалі асобны жаночы атрад «Радзіма», які праславіўся баявымі справамі. Камандзірам атрада была выбрана мінчанка Н.І. Лісавец, а пасля яе хваробы – Р.З. Сямёнава-Фрыдзон. Абедзвюм было прысвоена званне лейтэнанта французскай арміі.

На землях Чэхаславакіі дзейнічала брыгада імя Клімента Готвальда, якую ўзначальваў ураджэнец Лепельскага раёна В.А. Квіцінскі. Толькі ў верасні 1944 г. брыгада ажыццявіла 158 баявых аперацый. Савецкі ўрад прысвоіў яе камандзіру званне Героя Савецкага Саюза.

На беларускай зямлі змагаліся з гітлераўцамі славацкі партызанскі атрад Яна Налепкі, немцы Фрыц Шменкель і Карл Лінке, балгарка Лілі Карастаянава, іспанец Хуста Лопес. Так у гады вайны ўмацоўвалася адзінства народаў свету ў барацьбе супраць фашызму.



Библиотека БГУИР

**ЗАКЛЮЧЭННЕ. КРЫНІЦЫ ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА, ВЫНІКІ І ЎРОКІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ.** Некаторыя аналітыкі сцвярджаюць, што больш рацыянальнае выкарыстанне тэхнічнай і людской переваги над немцамі магло прывесці да перамогі яшчэ ў 1943 г. Але ёсць адзін бясспрэчны факт: гісторыя не ведае ўмоўнага ладу – мы перамаглі так, як перамаглі.

Якія крыніцы нашай перамогі?

Перамога СССР і паражэнне фашысцкай Германіі былі абумоўлены не *«бездарностью Гитлера», «оперативно-стратегическими просчётами фашистских генералов», «слабостью союзников Германии», «ударом в спину (сопротивлением среди немецкого народа)», «огромными пространствами России и численным превосходством русских», «необорудованностью автомобильных дорог», «неподходящей шириной железнодорожной колеи», «суровостью русской зимы»* і г.д., як аб гэтым пішуць многія заходнія гісторыкі, а сілай і магутнасцю Савецкай дзяржавы, планавай сістэмай гаспадарання, якая дазволіла зрабіць тое, што не здолелі зрабіць ні цары, ні ўрады ў іншых краінах – напружыць сапраўды ўсе сілы народа для дасягнення перамогі.

Жорсткая цэнтралізацыя ўпраўлення і дысцыпліна разам з гераічнай працай савецкіх рабочых, калгаснікаў і служачых дазволілі вырабіць значна больш зброі і баявой тэхнікі, чым праціўнік. Адзінства фронту і тылу стварыла матэрыяльную аснову ваенных перамог. Народны характар вайны (супраць фашысцкага агрэсара змагаўся амаль увесь 200-мільённы савецкі народ), магутнасць савецкіх Узброеных Сіл, перавага савецкай ваеннай арганізацыі, стратэгіі і тактыкі, дзейнасць партыйных арганізацый у дзеючай арміі і ў тыле, дружба народаў СССР (*«колосс на глиняных ногах»*, як прадстаўляла Савецкі Саюз фашысцкая прапаганда, у гады вайны не разваліўся), выхаванне якасна новага пакалення людзей, жыўшых ў



Библиотека БГУИР

такой атмасферы, якая зрабіла з іх нябачных да гэтага часу змагароў, патрыятызм, масавы гераізм савецкіх воінаў і працаўнікоў тылу, святая вера ў справядлівы характар вайны і сваю канчатковую перамогу – усё гэта з’явілася важнымі крыніцамі перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Вялікая Айчынная вайна, як і ўся Другая сусветная вайна, з’явілася суровым выпрабаваннем для народаў, праверкай трываласці дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў вайне. Рашаючую ролю ў дасягненні перамогі над фашызмам адыграў Савецкі Саюз і яго Ўзброеныя Сілы. Савецка-германскі фронт быў галоўным фронтам Другой сусветнай вайны. Тут адбыліся буйнейшыя бітвы, якія карэнным чынам змянілі яе ход і вынікі. Пасля вайны гэта афіцыйна ніхто не аспрэчваў. На Захадзе тады многа гаварылі пра вырашальную ролю Савецкага Саюза, у тым ліку і такія відныя дзеячы, як Ф. Рузвельт, У. Чэрчыль, Д. Эйзенхауэр. У. Чэрчыль, напрыклад, неаднойчы заяўляў аб тым, што *«Чырвоная Армія выпусціла кішкі з германскай ваеннай машыны, зламала хрыбетнік фашысцкаму зверу»*. У далейшым ацэнкі змяніліся. Гісторыкі і адстаўныя генералы з Захаду пачалі адкрыта заяўляць аб тым, што Савецкі Саюз не быў *«главным творцом победы»*, што *«в конце концов Гитлера сокрушили силами Америки ... и России»*.

Але факты гісторыі сведчаць зусім аб іншым. **Па-першае**, на працягу ўсёй вайны 60–75 і больш працэнтаў сіл і сродкаў гітлераўскай арміі знаходзілася на савецка-германскім фронце. Да сярэдзіны 1944 г. тут адначасова дзейнічала ад 190 да 270 дывізій праціўніка, у той час як супраць англа-амерыканскіх войск у Паўночнай Афрыцы – ад 9 да 20, у Італіі – ад 7 да 26 дывізій. Нават пасля адкрыцця 2-га фронту ў Еўропе ў чэрвені 1944 г. колькасць фашысцкіх войск на Усходзе ў 2 – 2,5 разы перавышала сілы гітлераўцаў, якія дзейнічалі на заходнееўрапейскім і італьянскім



Библиотека БГУИР

тэатрах вайны. За гады вайны на савецка-германскім фронце было знішчана 607 дывізій вермахта. Саюзнікі ж разбілі і ўзялі ў палон у Паўночнай Афрыцы і Заходняй Еўропе 176 дывізій.

**Па-другое**, савецка-германскі фронт адрозніваўся ад іншых па размаху і напружанасці ўзброенай барацьбы. Калі працягласць франтоў у Італіі і Паўночнай Афрыцы не перавышала 300 – 350 км, а ў Заходняй Еўропе – 800, то працягласць савецка-германскага фронту на розных этапах вайны складала ад 3 да 6,2 тыс. км. Калі ў Італіі актыўнасць баявых дзеянняў займала 74 % часу існавання фронту, у Паўночнай Афрыцы – 29, у Заходняй Еўропе – 86,7 %, то савецка-германскі фронт існаваў 1 418 сутак, з іх 1 320 сутак, ці 93 % прыходзіцца на актыўныя баявыя дзеянні.

**Па-трэцяе**, не адыграла ролі «рашаючага фактара» у разгроме ваеннай і дзяржаўнай машыны Трэцяга рэйха «паветранае наступленне» ваенна-паветраных сіл ЗША і Англіі пасля адкрыцця другога фронту ў Еўропе. Асноўнымі аб’ектамі бамбардзіровак англа-амерыканскай авіяцыі з’яўляліся прадпрыемствы суднабудаўнічай прамысловасці, марскія базы, фашысцкія авіябазы і аэрадромы ў Заходняй Еўропе. У той жа час танкабудаўнічыя заводы Германіі фактычна не падвяргаліся, а авіяцыйныя прадпрыемствы ў нязначнай ступені падвяргаліся ўдарам з паветра. З 2 638 тыс. тон бомб, скінутых на аб’екты гітлераўскай Германіі, толькі 48 тыс. тон (менш за 2 %) прыходзілася на самалётабудаўнічыя прадпрыемствы. Больш таго, многія заводы Рура, якія мелі ваенна-эканамічнае значэнне, але былі моцна звязаны з англа-амерыканскімі манаполіямі, наогул не падвяргаліся паветраным бамбардзіроўкам. У той жа час нярэдка наносіліся ўдары па буйных нямецкіх гарадах, якія не ўяўлялі сур’ёзных цэляў у ваенных адносінах. Усяго на долю ваенна-прамысловых аб’ектаў фашысцкай Германіі прыйшлося 18 % агульнага бомбавага танажу, скінутага авіяцыяй саюзнікаў на Трэці



Библиотека БГУИР

рэйх за ўсю вайну. Праўда гісторыі і ў тым, што ў баях з савецкімі войскамі гітлераўцы згубілі 75 % баявой тэхнікі і зброі.

**Па-чацвёртае**, нельга забываць аб колькасці ахвяр, якія былі прынесены дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі дзеля дасягнення перамогі над фашысцкай Германіяй. Савецкі Саюз панёс найбольшыя страты: 27 млн савецкіх людзей загінулі ў баях, у фашысцкіх лагерах і засценках, з іх 8 668 400 чал. склалі страты арміі, флоту, пагранічных і ўнутраных войск, астатнія людскія страты прыходзяцца на мірнае насельніцтва. У барацьбе з фашызмам страты Савецкай Беларусі склалі звыш 2,2 млн чал.: загінуў кожны чацвёрты яе жыхар. Страты ЗША ў вайне склалі 405 тыс. чал., Англіі – 375 тыс. чал.

З агульных страт фашысцкай Германіі ў вайне (13,6 млн чал.) больш за 10 млн яна згубіла на савецка-германскім фронце.

**Па-пятае**, ЗША не адыгралі рашаючай ролі і ў хуткім разгроме мілітарысцкай Японіі. Вядома, што амерыканскія стратэгі распрацоўвалі планы аперацыі па высадцы войск на в. Кюсю восенню 1945 г. і на в. Хансю – вясной 1946 г. Правячая вярхушка Японіі і пасля атамнай бамбардзіроўкі цвёрда збіралася працягваць вайну. Толькі 9 жніўня 1945 г. Прэм'ер-міністр Японіі Судзукі быў вымушаны перагледзець гэту пазіцыю, заявіўшы аб тым, што *«вступление в войну Советского Союза ставит нас окончательно в безвыходное положение и делает невозможным дальнейшее продолжение войны»*. Японія прыняла безагаворачную капітуляцыю пасля таго, як Савецкая Армія магутным ударам разграміла Квантунскую армію – галоўную апору мілітарыстаў Японіі.

Прыведзеныя матэрыялы сведчаць пра тое, што менавіта Савецкі Саюз, яго армія і народ вынеслі на сабе асноўны цяжар вайны, адыгралі рашаючую ролю ў дасягненні перамогі над фашысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй.

Библиотека БГУИР

Сусветнае супольніцтва аддае даніну павагі ўсім змагарам з фашызмам. Вялікі ўклад у дасягненне перамогі ў Другой сусветнай вайне ўнеслі народы і арміі ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Кітая і іншых дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.

**Ваеннымі і палітычнымі вынікамі вайны** з'яўляюцца свабода і незалежнасць нашай дзяржавы – Савецкага Саюза, дапамога народам Еўропы і Азіі ў вызваленні ад германскага фашызма і японскага мілітарызма, выратаванне будучыні чалавецтва ад фашысцкага варварства і цемрашальства, поўны злом дзяржаўнай машыны нацызму, фашызму і мілітарызму, узнікненне перадумоў для мірнага жыцця народаў, фарміравання масавых дэмакратычных арганізацый і пачатку выхаду шэрагу каланіяльных краін Азіі і Афрыкі на шлях незалежнага развіцця. Адным з важнейшых вынікаў вайны з'яўляецца і тое, што, нягледзячы на абвастрэнне супярэчнасцей паміж саюзнікамі ў канцы вайны, свет не быў ўцягнуты ў бяздонне новага сусветнага катаклізму, «халодная вайна» не стала гарачай.

**Урокі Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны**

- Галоўны ўрок Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны – чалавецтва, жыхары планеты Зямля павінны зрабіць усё магчымае, каб сусветная бойня, рэгіянальныя і лакальныя ваенныя канфлікты больш ніколі не паўтараліся, каб усе спрэчныя пытанні ў міждзяржаўных адносінах вырашаліся за сталом перагавораў.
- Злачынна патураць агрэсару, шукаць выгады толькі для сябе. (У рэшце рэшт прайграюць усе).
- Імкненне рэакцыйных сіл свету да сусветнай гегемоніі, панавання над іншымі народамі асуджана на паражэнне. Немагчыма затрымаць прагрэс чалавецтва, устанавіць панаванне над усімі народамі і краінамі свету.



Библиотека БГУИР

- Практыкай даказана магчымасць супрацоўніцтва розных грамадска-палітычных сістэм у барацьбе супраць агрэсара, за мір. Гэты вопыт надзвычай карысны сёння, калі глабальныя праблемы можна вырашаць толькі аб’яднанымі намаганнямі ўсіх народаў і дзяржаў.
- Менавіта Савецкі Саюз, яго армія і народ вынеслі на сабе асноўны цяжар вайны, адыгралі рашаючую ролю ў разгроме фашысцкай Германіі і мілітарысцкай Японіі.
- Неабходна праяўляць высокую пільнасць і ўмацоўваць абарону сваёй Радзімы. Агрэсарам трэба памятаць аб расплаце за развязванне вайны: Нюрнбергскім і Такійскім міжнароднымі трыбуналамі ваенныя злачынцы былі прыгавораны да смяротнага пакарання. Гэта быў прысуд і агульны прыгавор народаў свету.

Библиотека БГУИР

Библиотека БГУИР

Зв. план 2005, паз. 45

Вучэбнае выданне

**Новік** Яўгеній Канстанцінавіч,
**Новік** Наталля Яўгеньеўна

# Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)

## Курс лекцый

Рэдактар Т.П. Андрэйчанка
Карэктар Т.М. Крукава

Падпісана да друку 24.11.2005. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная.
Друк рызаграфічны. Гарнітура “Таймс”. Ум.-друк. арк. 11,04.
Ул.-выд. арк. 8,0. Тыраж 800 экз. Заказ 279.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»
Ліцэнзія на ажыццяўленне выдавецкай дзейнасці №02330/0056964 ад 01.04.2004.
Ліцэнзія на ажыццяўленне паліграфічнай дзейнасці №02330/0131518 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, П. Броўкі, 6

Библиотека БГУИР